

МАХЛЯРСТВА З БАНКАЎСКІМІ КАРТКАМІ 3

ЦЫРУЛЬНЯ Ў ВЁСЦЫ! МС



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

15 ЛЮТАГА 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 31 (28898)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

*Воінам-інтэрнацыяналістам, ветэранам вайны ў Афганістане*

***Паважаныя таварышы!***

Сёння Беларусь адзначае Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў.

Трыццаць гадоў таму завяршылася аперацыя абмежаванага кантынгенту савецкіх войскаў у Афганістане. За тысячы кіламетраў ад радзімы нашы воіны, праявіўшы гераічную стойкасць, мужнасць і самаадданасць, першымі кінулі выклік міжнароднаму тэрарызму, на доўгія гады спыніўшы яго распаўсюджанне па ўсёй зямлі.

Тая вайна прынесла гора ў многія беларускія сем'і, абарваўшы жыцці і скалечыўшы лёсы тысяч нашых суайчыннікаў. Мы ніколі не забудзем пра подзвіг ваеннаслужачых, якія сумленна выканалі свой воінскі абавязак і навечна здабылі славу.

Зараз, ва ўмовах глабальнай нестабільнасці, як ніколі важна помніць пра каштоўнасць міру і спакою на планеце. Воіны-інтэрнацыяналісты — гэта надзейная апора беларускай дзяржаўнасці і патрыятычных сіл краіны. Вашы мужнасць і вернасць абавязку — годны прыклад для сучаснай моладзі.

Жадаю вам, вашым родным і блізкім моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# Памяць сэрца



Сёння трыццаты раз мы адзначаем Дзень вываду кантынгенту савецкіх войскаў з Афганістана.
На мемарыяльным «Востраве слёз» пройдзе традыцыйны мітынг-рэквіем і сустрэча аднапалчан-афганцаў.
А ўчора ў мінскім храме-помніку Усіх Святых маліліся за спачын загінулых, якія аддалі сваё маладое жыццё ў далёкай краіне, за здароўе воінаў, якім пашчасціла вярнуцца на Радзіму, удоваў і маці, якія страцілі сваіх родных. Сярод прысутных на набажэнстве быў і ветэран афганскай вайны Павел ШАЦЬКО, старшыня Савета воінаў-афганцаў Маскоўскага раёна сталіцы.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*Больш здымкаў глядзіце на сайце zviazda.by*

КОРАТКА

• **Прадстаўнікі Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане ўдастоены дзяржаўных узнагарод.**

• «Магатэкс» распрацуе ўніформу для ВПС Замбіі.

• **Сям'я са Жлобіна зляпіла снегавіка вышынёй 9 м 15 см.**



• Памёр народны артыст Расіі спявак Сяргей Захараў.

ISSN 1990 - 763X

Сам-насам

## ТРОЙЧЫ ВЫЖЫЦЬ

**Лічыце, вылечыцца ад раку нельга? Ірына ЖЫХАР тройчы пабывала на мяжы, перажыўшы некалькі аперацый, а разам з імі апрамяненьванні, хіміятэрапіі і іншыя няпростыя спосабы лячэння. Прыйшоўшы праз тое, пра што многія баяцца нават думаць, яна дзеліцца сваім вопытам з іншымі хворымі, а пяць гадоў таму стварыла Цэнтр падтрымкі анкапацыентаў «У імя жыцця». Як хвароба мяняе нас, навошта пасля паспяховага лячэння перагладаць свой лад жыцця і пры якіх умовах страшны дыягназ — не прыгавор, мы распыталі жанчыну.**

***— Ірына, што вы адчувалі, калі даведваліся пра рак?***

— Паколькі ў маім жыцці за апошнія 25 гадоў гэта здаралася тройчы, то кожны раз паводзіны былі вельмі рознымі. Дыягназ рак слінной залозы мне паставілі ў 1994 годзе, калі мне было 27. Спачатку побач з вухам з'явілася прыпухласць. На той час я працавала ў прэстыжнай англамоўнай школе ў Мінску, была, напэўна, самым маладым завучам па выхаваўчай рабоце, паступіла ў аспірантуру, збіралася замуж за свайго маладога чалавека. У мяне былі вялікія планы, і гэта прыпухласць была на апошнім месцы. Нават калі яна пачала расці, я была ўпэўнена, што ўсё пройдзе. Вясной яна стала відавочнай не толькі мне, але і навакольным. Мая калега, настаўніца матэматыкі, сказала: вы не разумееце, з чым гуляеце. Але я была яшчэ і класным кіраўніком, мой клас — першы выпуск, бо школа новая. Я думала пра экзамен па хіміі (я выкладала гэты прадмет), пра тое, як зладзіць выпускны вечар... Але схадзіла да ўрача. Ён узяў адну біяпсію, потым другую, трэцюю. І калі я чарговы раз прыйшла, сказаў, што на маім месцы ён бы так лёгка да гэтага не адносіўся. Але мяне нічога не ўстрывожыла.

СТАР. 4

Жыллё маё

## БУДАВАЦЬ — НЕ БЕДАВАЦЬ

### Асаблівы попыт будзе на кватэры-студыі і апартаменты еўрафармату



**На што звяртаюць увагу пры куплі кватэры, ці істотна сёлета падаражэе жыллё і наколькі танней абыдуцца апартаменты ў прыгарадзе? Пра тэндэнцыі на рынку нерухомасці расказваюць эксперты.**

СТАР. 2

# СТО ГАДОЎ ПЛЁННАЙ ПРАЦЫ

**Гісторыю свайго існавання Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР адлічвала з пачатку 1919 года, калі быў утвораны Народны камісарыят земляробства БССР, таму сёлета работнікі гэтай сферы ў нашай краіне адзначаюць векавы юбілей галіны.**

Сваё віншаванне з гэтай нагоды работнікам аграрнай галіны накіраваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.

«Сто гадоў таму ў гісторыі Беларусі была адкрыта новая вяха, азнаменаваная прыкладам працоўнага подзвігу народа, самаадданай і плённай працы аграрыяў на карысць сваёй краіны», — адзначыў Прэзідэнт.

На яго думку, захаваўшы найлепшыя традыцыі, абапіраючыся на вопыт і веды старэйшых пакаленняў, укараняючы перадавыя тэхналогіі, пры падтрымцы дзяржавы беларускія працаўнікі стварылі новую мадэль сучаснай сельскай гаспадаркі.

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў усім работнікам аграпрамысловага комплексу за працавітасць, стойкасць, вернасць і адданасць абранай прафесіі, пажадаў ім і іх блізкім здароўя, шчасця і дабра.

Дарэчы, на днях Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ, згодна з якім у Беларусі заснаваны геральдычныя сімвалы Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Так, з'явяцца эмблема і сцяг міністэрства, нагрудны знак «За заслугі ў сельскай гаспадарцы», таксама зацверджаны палажэнні аб гэтых сімвалах.

Іншым указам беларускага лідара заснаваны юбілейны медаль «100 год органам дзяржаўнага кіравання сельскай гаспадаркай і харчаваннем Беларусі».

Эканамікс

# СУВЯЗІ, ГРОШЫ, АЎТАРЫТЭТ

## Што прыносіць Беларусі ўдзел у міжнародных выстаўках?

**Як адзначыў намеснік старшыні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Андрэй ШАХАНОВІЧ на спецыяльнай прэс-канферэнцыі, у адпаведнасці з рашэннем урада летась было праведзена сем нацыянальных выставак і экспазіцый у замежных дзяржавах. Удзел у іх прыняло каля 350 беларускіх арганізацый.**

Агульная выставачная плошча гэтых экспазіцый склала больш за 2500 квадратных метраў — гэта толькі плошча выставачных стэндаў, а на адкрытай пляцоўцы тэхніка беларускіх вытворцаў заняла 1400 квадратных метраў.




«Усяго было заключана каля 100 камерцыйных кантрактаў і дагавораў на гэтых выстаўках на агульную суму каля 150 мільёнаў долараў. Пагадненняў, розных мемарандумаў аб супрацоўніцтве — на суму каля 50 мільёнаў долараў. Гэта значыць, у цэлым эфект ад удзелу атрымаўся каля 200 мільёнаў долараў — сума дастаткова значная для сямі мерапрыемстваў. Гэта своеасаблівы ўклад у агульную скарбонку беларускага экспарту ў мінулым годзе», — расказаў спецыяліст.

Геаграфія ўдзелу Беларусі ў выстаўках была наступная: дзве — у Кітаі, па адной — у Марока, ЗША, Расіі, Таджыкістане і В'етнаме. Акрамя таго, БелГПП выступіла арганізатарам выстаўкі беларускіх вытворцаў ва Узбекістане, хоць яна і не была ўключана ў план нацыянальных выставачных мерапрыемстваў.

«Усе гэтыя мерапрыемствы вельмі патрэбныя і важныя з той прычыны, што калі ёсць кантакты, калі людзі глядзяць адзін аднаму ў вочы, бізнесмены размаўляюць, яны знаходзяць новыя кірункі супрацоўніцтва, магчымасці для пашырэння бізнесу», — лічыць **дырэктар Нацыянальнага цэнтра маркетынгу Міністэрства замежных спраў Беларусі Валерый САДОХА.**

У якіх выстаўках Беларусь паўдзельнічае ў 2019 годзе? Напрыклад, айчынная экспазіцыя ўпершыню будзе арганізавана на міжнароднай выстаўцы сельскай гаспадаркі і жывёлагадоўлі, прадуктаў харчавання, напояў і ўпаковачных тэхналогій у Нігерыі, якая адбудзецца з 26 да 28 сакавіка, расказаў **дырэктар выставачнага ўнітарнага прадпрыемства «Белінтэрэкспа» БелГПП Яўген УВЯДЗЕНСКІ.**

Усяго ў 2019-м наша краіна арганізуе восем нацыянальных экспазіцый на замежных выстаўках — у Паўднёвай Карэі, Аргенціне, Кеніі, Пакістане, Латвіі, Інданезіі, Кітаі і, як было сказана вышэй, Нігерыі.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# БУДАВАЦЬ — НЕ БЕДАВАЦЬ

## НОВАЕ ЖЫЛЛЁ Ў ПРЫЯРЫТЭЦЕ

Цяпер кватэры другаснага рынку карыстаюцца меншай папулярнасцю. Больш за 80 % патэнцыйных пакупнікоў жылля разглядаюць навабудоўлі. У кліентаў хапае на гэта грошай? Падобна на тое.

Адной з асаблівасцяў пакупніцкіх паводзін можна назваць комплексны падыход пры выбары новабудоўлі. З кожным эканамічна стабільным годам доля тых, хто кіруецца выключна цэнавым фактарам, памяншаецца. Паводле праведзенага групай кампаній «Твая сталіца» даследавання, вага цэнавага фактару цяпер складае толькі каля 20—25 %. Для параўнання: аналагічную значнасць мае размяшчэнне дома паблізу станцыі метро.

Наглядны прыклад: пакупнік выбірае паміж дзвюма аднапакаёвымі кватэрамі, адна з якіх размяшчаецца на значнай адлегласці ад метро, але каштуе 47 тысяч долараў, а другая — паблізу «падземкі», але за 53 тысячы долараў. Дык вось, пры іншых роўных умовах, з улікам атрымання транспартных выгод на перспектыву, значная частка аддасць перавагу другому варыянту. А сродкі, якія адсутнічаюць, возьме ў крэдыт.

Зніжэнне значнасці цаны, у прыватнасці, можна растлумачыць наяўнасцю крэдытаў і павелічэннем колькасці прапаноў па растэрміноўцы аплаты.

Сярод іншых фактараў уплыву на выбар пакупніка можна вылучыць стадыю будаўнічай гатоўнасці дома, месцазнаходжанне (канкрэтны раён, развітасць інфраструктуры ў наваколлі, транспартная даступнасць), планіроўку, наяўнасць паркоўкі.

Больш за ўсё за мінулы год падаражэлі новабудоўлі класа «эканом». Гэты від бюджэтнага жылля прыплюсаваў у цане 17 %. Цяпер квадратны метр «эканома» ў аднапакаёвай кватэры ў сярэднім каштуе 1235 долараў, у двухпакаёвай — 1225 долараў, у трохпакаёвай — 1110 долараў.

А вось жыллё ў дамах класа «стандарт» падаражэла ўсяго на 6 %. Сярэдні кошт квадратнага метра гэтага класа ў аднапакаёвых кватэрах дасягае 1330 долараў, у двухпакаёвых — 1250 долараў, у трохпакаёвых — 1170 долараў.

## ДВА СЦЭНАРЫІ НА ГОД

Многае на рынку жыллёвай нерухомасці будзе залежаць ад эканамічнай сітуацыі ў краіне. Але ўжо цяпер можна з дастатковай упэўненасцю меркаваць, што высокі попыт на новабудоўлі за два папярэднія гады сябе вычарпаў. Набат пры захаванні бягучых умоў па даступнасці крэдытаў (стаўкі, умовы атрымання). Сёлета доля пакупнікоў з уласнымі грашыма будзе павялічвацца.

— І не таму, што дабрабыт людзей настолькі вырасце, а таму, што колькасць пакупнікоў, якім пад сілу ўзяць і выплачваць крэдыт, памяншаецца. Асноўная іх маса ўжо ўзяла крэдыт у 2017—2018 гадах, — упэўнены **аналітык Андрэй ЧАРНЫШОЎ.**

Далейшае магчымае развіццё сітуацыі на першасным рынку Мінска можна ўмоўна падзяліць на два сцэнарыі. Першы варыянт: калі даступнасць крэдытаў не зменіцца (у параўнанні з мінулым годам), то за кошт крэдытнай падтрымкі і эканамічнай стабільнасці магчымы рост цэн у межах 5—7 %.

Сцэнарый нумар два процілеглы першаму. Так, калі крэдыты істотна падаражэюць, ускладняцца ўмовы іх атрымання, то за кошт памяншэння фінансава забяспечанага попыту рынак западзе ў стан стагнацыі. На гэтым фоне будзе расці колькасць маркетынгавых акцый ад забудоўшчыкаў: яны будуць змагацца за пакупнікоў, захоўваючы цэны на ранейшым узроўні. А магчымасць пачатку зніжэння цэн будзе залежаць ад ступені ўзмацнення жорсткасці крэдытнай і эканамічнай сітуацый.

Пакупнікі, у сваю чаргу, будуць зніжаць свае патрабаванні да новабудоўляў: прыйдзецца чымсьці ахвяраваць дзеля кошту. Асаблівы попыт будуць уяўляць кватэры мінімальнага метражу, у прыватнасці кватэры-студыі і апартаменты еўрафармату. Частка пакупнікоў з мінімальным бюджэтам, пяройдзе на бок другаснага рынку — там ёсць танныя «хрушчоўкі» і «брэжнеўкі».

Усё большую цікавасць будуць уяўляць прыгарадныя (Калодзішчы) і загарадныя (Прылукі, Фаніпаль, Смалявічы) прапановы новабудоўляў. Яны ўжо зараз на 20—30 % таннейшыя за сталічныя аналагі, а пры належным падыходзе за гарадам можна набыць двухпакаёвую новабудоўлю па цане аднапакаёвай кватэры другаснага рынку ў Мінску.

## АМАЛЬ «МЁРТВЫ» СТУДЗЕНЬ

«Гэты першы месяц года можа стаць самым горшым на рынку нерухомасці за апошнія дзесяць гадоў», — адзначае **кіраўнік камітэта па рыэлтарскай дзейнасці Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Павел АСТАПЕНЯ.** — Колькасць здзелак на рынку чакаецца ў раёне 700. Для параўнання, у студзені 2018 года было 1273 здзелкі».

Чаму так? Кліенты рынку нерухомасці ўважліва назіралі за перагаворамі Масквы і Мінска. Таму што ўсе разумеюць, што многае залежыць не ад нас. Караццей кажучы, калі сур'ёзнай падтрымкі ад Расіі не будзе, то цэны на жыллё ў нашай краіне непазбежна ўпадуць. І таму дастаткова вялікая колькасць пакупнікоў затаілася. Гэта, адпаведна, з'явілася адным з фактараў скарачэння здзелак на рынку ў снежні 2018 года. Гэты ж настрой перайшоў і на студзень.

Калі ж сітуацыя з Расіяй упарадкуецца, то цэны будуць захоўвацца на ўзроўні мінулага года плюс-мінус 2 %, упэўнены Павел Астапеня. Таксама, на думку эксперта, актыўнасць на рынку нерухомасці будзе залежаць ад таго, ці змогуць людзі разлічвацца на крэдытную падтрымку банкаў.

## А ЯК У РЭГІЁНАХ?

**Гродна**

Найбольш актыўна забудоўваюцца мікрараёны Гродна — Фолюш, Паўднёвы-3, Вішнявец і Дзевятоўка. У кожным з іх узводзяцца жылыя комплексы на ўмовах долевага будаўніцтва.

Самы дарагі квадратны метр у Дзевятоўцы. Там у новым доме па вуліцы Курчатава будучыя кватэры з разліку 700—710 долараў за «квадрат». У жылым комплексе па вуліцы Пралетарскай метр абыдзецца трохі танней — 600—610 долараў. А самы бюджэтны варыянт прапануюць у мікрараёне Паўднёвы-3, дзе квадратны метр каштуе ўсяго ад 500 да 520 долараў.

Дзякуючы зменам заканадаўчай базы, даўгабуды ў Гродне фактычна засталіся ў мінулым. У абласным цэнтры рэалізуюцца буйныя праекты жылой нерухомасці. Таксама кропкава забудоўваецца гістарычны цэнтр.

**Брэст**

За апошнія два-тры гады ў Брэсце пачата будаўніцтва некалькі буйных жылых комплексаў. Найбольш вядомыя сярод іх: Старая крэпасць, Паўночны, панэльны комплекс па вуліцы Чырвонагвардзейскай і шматфункцыянальны жылы комплекс у раёне вуліц Папаніна і Гогаля.

Цана квадратнага метра ў новабудоўлях Брэста — адна з самых высокіх у краіне. Найбольшым попытам у пакупнікоў першаснага рынку карыстаюцца аднапакаёвыя кватэры плошчай 35—45 м$^2$. Больш за ўсё новабудоўляў узводзіцца ў мікрараёнах Граеўка і Паўднёвы Усход. Таксама кропкава забудоўваецца цэнтр горада. Кошт «квадрата» ў Старой крэпасці пачынаецца з 610 долараў і даходзіць у Цэнтральным раёне да 1350 долараў у раёне вуліц Гогаля — Папаніна. Попыт на новыя кватэры, якія рэалізуюцца з дапамогай долевага будаўніцтва, у горадзе над Бугам застаецца стабільны.

**Магілёў**

Большасць новабудоўляў у горадзе — панэльныя, вышынёй 9 паверхаў. Кватэры рэалізуюцца праз удзел у долевым будаўніцтве. Гэта жыллё эканом-класа, але з якасным чарнавым аздабленнем і высокімі паказчыкамі цепла- і гукаізаляцый.

Таксама ў горадзе ўзводзяцца дамы камфорт-класа, напрыклад — ЖК «Эгаіст» па вуліцы Гагарына. У ім маюцца кватэры-студыі плошчай да 49 м$^2$, з французскімі (ад падлогі да столі) вокнамі.

Квадратны метр бюджэтнага жылля ў Магілёве каштуе 570 долараў, а ў дамах камфорт-класа кошт іх дасягае да 700 долараў.

**Гомель**

Асабліва інтэнсіўна тут забудоўваюцца мікрараёны № 18 і 19, вуліца Сожская. Актыўнае будаўніцтва вядзецца і ў мікрараёне № 59.

Па долевым будаўніцтве можна пабудаваць кватэры коштам ад 430 да 550 долараў за квадратны метр (у эквіваленце). Пражыванне ў элітным доме ў цэнтры горада будзе каштаваць даражэй — 725 долараў за «квадрат».

**Віцебск**

У Віцебску рэалізуецца некалькі буйных праектаў у сферы долевага будаўніцтва — у асноўным у мікрараёне Чаромушкі і на скрыжаванні Чырванафлоцкай і Артылерыйскай вуліц. Цікавасць з боку расіян таксама робіць унёсак у падтрымку попыту на новабудоўлі. Інфраструктура новых мікрараёнаў таксама развіваецца, што робіць новае жыллё яшчэ больш прывабным для пакупнікоў. Квадратны метр новага жылля ў гэтым горадзе абыдзецца пакупнікам ад 560 да 680 долараў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Будзьце пільныя!

# З НЕЗНАЁМЫМІ ПА ТЭЛЕФОНЕ ЛЕПШ АДКРЫТА НЕ ГАВАРЫЦЬ...

## ...тым больш на банкаўскую тэму



**Упраўленне абароны інфармацыі Нацыянальнага банка інфармуе аб тым, што ў нашай краіне зафіксаваныя выпадкі тэлефоннага махлярства — вішынгу.**

Сутнасць вішынгу ў тым, што зламыснікі, выкарыстоўваючы тэлефонную сувязь і іграючы пэўную ролю (супрацоўніка банка, пакупніка або іншых), пад рознымі падставамі выманьваюць у трымальніка плацёжнай карткі канфідэнцыйную інфармацыю або просяць што-небудзь зрабіць са сваім рахункам. Вынік заўсёды адзін і той жа — грошы з карткі зніклюць.

Установлена, што ашуканцы тэлефануюць кліентам беларускіх банкаў і, называючыся супрацоўнікамі банкаў (у тым ліку Нацыянальнага банка), пад рознымі нагодамі просяць даць пашпартныя даныя, а таксама рэквізіты банкаўскіх плацежных картак і коды, якія паступаюць на тэлефонны нумар кліента банка.

У большасці выпадкаў нумары тэлефонаў махляроў могуць быць схаваныя альбо належаць аператарам сувязі іншых дзяржаў. Аднак у асобных выпадках больш хітрыя злодзеі выкарыстоўваюць спецыяльныя тэхналогіі, і тады нумары тэлефонаў, з якіх ажыццяўляюцца званкі, вызначаюцца як афіцыйныя нумары, названыя на сайце банка.

Супрацоўнікі Нацбанка звяртаюць увагу: работнік банка пры тэлефанаванні кліенту загадзя павінен ведаць усе неабходныя яму даныя. Таму паведамляць камусьці рэквізіты банкаўскай плацежнай карткі, паролі і коды доступу, пашпартныя даныя ні ў якім разе нельга.

У Нацбанку рэкамендуюць у выпадку паступлення падобных званкоў адразу ж звярнуцца ў кантакт-цэнтр банка, які эмітаваў картку, расказаць аб сітуацыі і далей прытрымлівацца рэкамендацый супрацоўніка банка.

Калі зламысніку ўсё ж удалося атрымаць рэквізіты карткі або быў устаноўлены факт крадзяжу грашовых сродкаў, варта неадкладна заблакаваць картку і звярнуцца з заявай у праваахоўныя органы.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# БЕЗ ТЭРМІНУ ДАЎНАСЦІ

## У Гродзенскай вобласці не спыняюцца пошукі Максіма Мархалюка

**У поле зроку міліцыі трапляюць новыя асобы, якія ў той час знаходзіліся ў раёне знікнення непаўналетняга хлопчыка. Нагадаем, што 10-гадовы жыхар вёскі Новы Двор Свіслацкага раёна Максім Мархалюк знік у Белавежскай пушчы 16 верасня 2017 года. З тае пары мінула паўтара года.**

Па факце знікнення хлопчыка была распачата крымінальная справа. Пошукамі Максіма займаліся праваахоўныя органы, ратавальнікі, валанцёры, члены пошукавых атрадаў і ўсе неабыякавыя да яго лёсу людзі.

Зараз гэта тэма не такая «гарачая» ў СМІ, бо прайшло нямала часу, але гродзенская міліцыя не спыняе пошукі. Як вядома, гэты выпадак знаходзіцца на кантролі кіраўніка дзяржавы. Аб ходзе работ гродзенцы пастаянна інфармуюць. Восенню прачэсвалі мясцовасць з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў, якія могуць дапамагчы знайсці цела ці нейкія часцінкі адзення. Было абследавана 170 кварталаў лясного масіву, у тым ліку з паветра. Але пакуль безвынікова.

Разам з тым у поле зроку міліцыі трапляюць усё новыя асобы, якія былі паблізу месца здарэння. Выяўлена 3816 чалавек. Устаноўлена больш за 11 тысяч уладальнікаў паляўнічых стрэльбаў, апытана больш за сто чалавек, якія маглі знаходзіцца ў тым раёне. З такой жа мэтай праверана больш за 2400 транспартных сродкаў.

У міліцыі найбольш імавернай лічаць версію няшчаснага выпадку. Да такой думкі тут схіляюцца з-за асаблівасцей гэтага раёна — гушчары, балоты... Хлопчык мог заблудзіць. Але спыняць пошукі ў рэгіёне не збіраюцца. Яны працягнуцца да тае пары, пакуль не будзе поўнай яснасці ў гэтай справе, паведамілі ў абласным упраўленні ўнутраных спраў.

Дарэчы, Максім — адзіны непаўналетні ў вобласці, якога да гэтага часу не атрымалася знайсці. Апошні выпадак датычыўся двух падлеткаў з Гродна, якія зніклі ў сярэдзіне студзеня. Іх знайшлі ў добрым стане праз пяць дзён, аднаго — у Магілёве, другога — у Маскве. А ўсяго ў спісе тых, каго шукае УУС, знаходзіцца амаль 250 чалавек. Некаторыя яшчэ з 80-х гадоў мінулага стагоддзя.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Ахвярамі тэракту ў Іране сталі больш за 40 чалавек



Тэрарыст-смяротнік накіраваў аўтамабіль, начынены ўзрыўчаткай, у аўтобус, які рухаўся па маршруце Хаш—Захедан. «Колькасць ахвяр дасягнула 41, у тым ліку членаў КВІР (Корпусу вартавых ісламскай рэвалюцыі. — **Рэд.**) і грамадзянскіх асоб», — паведаміла іранскае інфармацыйнае агенцтва Fars. Адказнасць за тэракт узяла на сябе тэрарыстычная групоўка «Джэйш аль-Адль» («Армія справядлівасці»), у яе ўваходзяць ісламісты, якія вызнаюць іслам суніцкага кірунку. Гэтая групоўка была створана ў 2012 годзе былымі ўдзельнікамі экстрэмісцкай арганізацыі «Джундала» («Рух народнага супраціву») пасля таго, як у 2010-м урадавыя сілы Ірана захапілі і пакаралі смерцю лідара «Джундалы» Абдолмалека Рыгі. Групоўка «Джэйш аль-Адль» ужо трэці раз з пачатку 2019 года ажыццяўляе напады на ваеннаслужачых і прадстаўнікоў сіл правапарадку ў Сістане і Белуджыстане.

## Дутэртэ прапанаваў перайменаваць Філіпіны



Прэзідэнт Філіпін Радрыга Дутэртэ дапусціў перайменаванне краіны ў «Рэспубліку Махарліка», піша газета Manila Bulletin. Ён раскрытыкаваў уплыў Іспаніі на філіпінскую культуру і нагадаў ідэю экс-прэзідэнта Фердынанда Маркаса адмовіцца ад «іспанскай» назвы дзяржавы. «Назву нашай краіны прыдумаў Магелан, падарожжа якога аплаціў іспанскі кароль Філіп. Калі-небудзь мы гэта зменім», — заявіў Дутэртэ. Кіраўнік дзяржавы падтрымаў прапанову Маркаса, адзначыўшы, што «махарліка» — слова малайскага паходжання, якое адлюстроўвае паняцце «спакой і мір». Пазней прэс-сакратар кіраўніка дзяржавы Сальвадор Панэла назваў словы Дутэртэ «пацвярджэннем нацыянальнай ідэнтычнасці». Панэла адзначыў, што, згодна з канстытуцыяй Філіпін, рашэнне аб змене назвы краіны можа быць прынята парламентам. У кангрэсе Філіпін думкі пра ідэю перайменавання краіны разышліся. «Гэта проста ідэя. Магчыма занадта шмат ускладненняў», — сказаў журналістам кіраўнік сената Вісэнтэ Сота. У той жа час сенатар Панфіла Лаксон адзначыў, што схільны пагадзіцца з Дутэртэ, паколькі назва «Філіпіны» заўсёды будзе нагадваць аб іспанскім каралі Філіпе II і трохсотгадовым перыядзе каланіяльнага іспанскага ўладарання.

## У расійскім Прымор'і нашэсце амурскіх тыграў



Прыморскі край перажывае нашэсце амурскіх тыграў — занесеных у Чырвоную кнігу драпежных жывёл, якія жывуць пераважна ў перадгор'ях Сіхатэ-Аліня і ў лясных масівах па берагах рэк Амур і Усуры. У лютым жывёлы масава выходзяць да населеных пунктаў, што ім звычайна не ўласціва, і нападаюць на свойскую жывёлу. Таксама ахвярамі тыграў становяцца сабакі. Звычайна візіты драпежнікаў да людзей абумоўлены збядненнем кармавой базы ў звыклым арэале пражывання і неабходнасцю шукаць новыя крыніцы харчу. Цяперашняя зіма выдалася ў многіх раёнах Прымор'я незвычайна маласнежнай. На поўдні рэгіёна снежнае покрыва так да гэтага часу і не было сфармаванае. Не выключана, выхад тыграў да цывілізацыі справакаваны менавіта прыродным фактарам — збіліся звыклыя жыццёвыя рытмы. У некаторых населеных пунктах актыўнасць драпежнікаў ужо практычна справакавала рэжым надзвычайнага становішча. Мясцовыя ўлады заклікаюць жыхароў захоўваць асцярожнасць і адмаўляцца ад прагулак у цёмны час сутак. З-за раптоўнай пагрозы закрываюцца дзіцячыя секцыі.

# УЛАДА НА СУВЯЗІ

**Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца заўтра, 16 лютага, у аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. На пытанні жыхароў рэгіёнаў і сталіцы з 9 да 12 гадзін адкажуць:**

- старшыня БРЭСЦКАГА абласнога Савета дэпутатаў Юрый Іосіфавіч НАРКЕВІЧ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Уладзіміравіч ГАРБАЧОЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- першы намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Іван Алейзавіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;
- кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8 022 250 18 69;
- старшыня МІНСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ Тэл. 8 017 500 41 60;
- старшыня МІНСКАГА гарвыканкама Анатоль Аляксандравіч СІВАК. Тэл. 8 017 222 44 44.

Надвор'е

# Як у пачатку красавіка

## Тэмпературны фон у першай палове лютага аказаўся на 4—6 градусаў вышэйшым за кліматычную норму

**У выхадныя дні надвор'е ў краіне будзе вызначаць перыферыя антыцыклону з цэнтрам над Балканскім паўвостравам. Таму ў нас чакаецца паступленне не па сезоне цёплых паветраных мас, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень у вобласці павышанага атмасфернага ціску істотных ападкаў не чакаецца. Толькі пад уплывам франтальнага раздзела ў асобных раёнах пройдуць невялікія ападкі, у асноўным дождж. У асобных раёнах магчымы слабы галалёд, на дарогах месцамі галалёдзіца. Тэмпература паветра ад нуля да плюс 6 градусаў.

У суботу і нядзелю паўднёвыя вятры працягнуць пераносіць у нашу краіну цёплае паветра. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень — 1—8 цяпла. На паўднёвым захадзе краіны дасягне плюс 9—10 градусаў. Такі тэмпературны фон больш чым на месяц апярэджвае кліматычную норму і адпавядае апошнім датам сакавіка — пачатку красавіка. Істотных ападкаў не прагназуецца. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі чакаюцца туманы. Асобныя ўчасткі дарог застануцца слізкія.

У пачатку наступнага тыдня надвор'е будзе вызначаць у асноўным вобласць павышанага атмасфернага ціску, а ўначы пры праясненнях будзе падмарожваць. У панядзелак будзе без істотных ападкаў. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 да мінус 7 градусаў, удзень — ад мінус 3 градусаў да 3 цяпла. Па паўднёвым захадзе краіны будзе цяплей, там уначы чакаецца ад нуля да плюс 3 градусаў, а ўдзень — 4—7 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у аўторак будзе без істотных ападкаў. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—7 марозу, пры праясненнях па ўсходзе краіны панізіцца да мінус 11 градусаў. Удзень будзе ад нуля да плюс 7 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Трайное забойства жывёлы

**За апошні час зарэгістравана некалькі выпадкаў, калі браканьеры адной пятлёй ці адным стрэлам фактычна забівалі трох жывёл адразу.**

Факт незаконнай здабычы дзічыны з выкарыстаннем петляў на тэрыторыі Лепельскага раёна выяўлены паблізу населенага пункта Фатынь. У браканьерскай пастцы былі знойдзены парэшткі казулі з двума эмбрыёнамі. Па факце незаконнага палявання і нанясення шкоды навакольнаму асяроддзю ў памеры 600 базавых велічынь праводзіцца праверка.

Некалькімі днямі раней работнікі ўпраўлення аператыўнага рэагавання Дзяржаўнай інспекцыі сумесна з супрацоўнікамі Дзяржаўнага пагранічнага камітэта затрымалі трох жыхароў Браслаўскага раёна, якія займаліся незаконнай здабычай ласёў у паляўнічых угоддзях Нацыянальнага парка «Браслаўскія азёры». Затрыманне адбывалася паблізу вёскі Савічы ў той момант, калі браканьеры ўжо здабылі і разабралі самку лася, як высветлілася пазней, з двума эмбрыёнамі. Такім чынам, адным стрэлам браканьеры фактычна забілі адразу трох ласёў. Па гэтым факце заведзена крымінальная справа.

Падчас вобыску ў домаўладаннях браканьераў і падазраваных саўдзельнікаў канфіскавана чатыры адзінкі незарэгістраванай паляўнічай зброі, у тым ліку два карабіны, 126 патронаў, 80 кілаграмаў мяса дзічыны, а таксама рыбалоўныя сеткі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ТРОЙЧЫ ВЫЖЫЦЬ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Мяне накіравалі ў Бараўляны. Загадчык аддзялення глядзеў то на мяне, то ў мае дакументы і паўтараў: не можа быць. І тады ў мяне нічога не калынула. На наступны дзень мне сказалі: тэрміновая шпіталізацыя. Я расплакалася: гэта было 10 чэрвеня, а 22-га — экзамен па хіміі, 24-га — выпускны ў маіх дзяцей. Якая шпіталізацыя проста тут і цяпер? Мне чамусьці далі на рукі картку, я стала ў чаргу на тамаграфію галаўнога мозга. З цікавасці адкрываю картку, а там напісана — рак. Ад шоку я страціла прытомнасць... Маладая доктарка, калі я перапытала, сказала: у вас перадракавы стан, але мы будзем лячыць вас, як ракавых хворых. На самай справе была 3-я стадыя, вялікая пухліна, плоскаклетачны рак — вельмі капрызны. Але гэта я высветліла пасля, у той час хворым адмаўляліся называць дыягназ.

Зрабілі апраменьванне, потым аперацыю. Хірург прыйшоў увечары, я перабінтаваная, толькі вочы бачныя. І сказаў: ты будзеш усміхацца! Пухліна знаходзілася блізка да губнога нерва, і гэта быў цуд, што яго ўдалося не зачапіць. Я вырашыла, што гэта цудоўная гісторыя мяне вызваліць ад другога этапу апраменьвання, але ўсё ж прызначылі. Зноў быў вялікі стрэс. І гэта задало іншы вектар майму жыццю.

***— Пасля аперацыі яно змянілася?***

— У бальніцы мне споўнілася 28, і я належала да людзей, якія не могуць быць назіральнікамі ў гэтым жыцці, мне трэба было дзейнічаць. Калі ты ведаеш дыягназ і няма ніякіх ілюзій, разумееш, што ніхто за цябе нічога не зробіць. Пасля апраменьвання я памучылася з апёкамі: у мяне была страта смаку, сухасць у роце такая, што не можаш размаўляць. З гэтай нагоды мяне вызвалілі ад урокаў. Я страціла валасы. Але ўсё гэта страшна толькі з боку. Калі пасля на рак захварэла мая маці, нягледзячы на два свае анказахворванні, я зразумела, якія гэта розныя адчуванні: лягчэй хварэць самой.

Урачы нічога не рэкамендавалі: ты вылечышся — жыві як жыў. Інтэрнэту яшчэ не было. І я пачала займацца па сістэме Нішы ў выкладанні Маі Гагулан. Цяпер многія рэчы адтуль навукова абгрунтаваныя. Гэта правільнае артапедычнае становішча падчас сну. У мяне і сёння артапедычная падушка, цвёрдая канапа. Я выконвала чатыры простыя фізічныя практыкаванні па сістэме Нішы. Сёння даказана, што няма лепшага для анкапацыента правіла, чым лячэбная фізкультура. Яна выводзіць гармон стрэсу, усё, што накопліваецца падчас трывогі. Штодзень 30 хвілін я раблю практыкаванні раніцай і ўвечары. Кантрасны душ — я пачынала з летняй вады, праз два месяцы перайшла цалкам на халодную. Мне забаранялі быць у месцах, дзе шмат людзей, каб не падхапіць інфекцыю — мне нельга было хварэць. Калі мама пабачыла, што я стаю пад халоднай вадой, у яе была істэрыка. Але з той пары 25 гадоў я не хварэю на прастуды. Маёй знаёмай у Германіі зараз пасля аперацыі робяць кантрасны душ — гэта частка лячэння ў дзяржаўнай клініцы, і сёння там гэта норма. Тады ж урачы круцілі пальцам каля скроні. Але я была ўпэўнена, што я ўсё раблю правільна.

З майго рацыёну зніклі рафінаваныя прадукты: маянэзы, цукеркі, мучное, пшанічная мука вышэйшага гатунку, каўбасы, сасіскі, хлеба я вельмі мала ўжываю. Першы год увогуле была веганам: адмовілася ад бялку жывёльнага паходжання ва ўсіх яго праявах: мяса, яйкі, малако. Я прарошчвала пшаніцу, авёс. І тое пачуццё голаду памятаю дагэтуль. Але гэта была барацьба за жыццё. Я зразумела, што вельмі люблю сваю маму, яна была маёй галоўнай матывацыяй. Не магла сабе ўявіць, як яна праводзіць мяне ў апошні шлях. Цяжкая хвароба — гэта пэўны тэст на адносіны, на тое, ці гатовы ты для свайго блізкага зрабіць усё, што можаш. Я адчувала, што ў мяне ўліваюцца сілы, што я іду ў правільным кірунку. Калі ты на фізічным узроўні адчуваеш, як мяняешся ў лепшы бок, гэта вельмі натхняе.


Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

**«Я зразумела, што вельмі люблю сваю маму, яна была маёй галоўнай матывацыяй. Не магла сабе ўявіць, як яна праводзіць мяне ў апошні шлях».**

Сёння ніхто не ведае, што становіцца асноўнай прычынай раку, іх цэлы комплекс. Ёсць прафесійныя захворванні, апраменьванне, але гэта вузкія катэгорыі пацыентаў. Чалавек увогуле запраграмаваны на анкалагічныя хваробы. Наступае момант, калі імунітэт не распазнае ракавую клетку як ворага. Чаму гэта оптыка збілася, ніхто не адкажа. А ёсць яшчэ і знешнія ўмовы — харчаванне, фастфуд, кансерванты, якія мы так любім, рафінаваны цукар, торцікі, цукеркі — тое, да чаго чалавек ніколі не быў прыстасаваны. Мы ўсё гэта ўжываем і хочам, каб арганізм змаўчаў? Я, напрыклад, 25 гадоў не ем цукеркі і не хочацца, хоць першы час было складана.

***— Але праз пэўны час вы зноў захварэлі...***

— Але праз 14 гадоў. Гэта вялікі стаж. Ёсць кніга «Антырак. Новы лад жыцця» Давіда Сервана Шрэйбера, і я лічу, што яна павінна быць настольнай у кожнага анкапацыента, бо напісана ўрачом-анкапацыентам. Яму быў пастаўлены дыягназ з вельмі неспрыяльным прагнозам, але насуперак ім ён выжыў. Шрэйбер высветліў, што ўсё тое, што мае супрацьракавы эфект, напрыклад, зялёны чай, куркума або спецыя кары, соя, ёсць ва ўсходніх людзей на стале. Плюс штодзённая фізічная актыўнасць: яны не ездзяць адзін прыпынак на транспарце, а абавязкова ходзяць. Вось гэты метранамічны падыход у харчаванні і фізічных нагрузках я парушыла. У мяне быў цікавы праект, я шмат ездзіла па Беларусі, перайшла на булкі... Я была ўпэўнена, што снарад двойчы ў адну варонку не падае. А ён упаў... Я намацала ўшчыльненне ў грудзях. Пайшла да ўрача, ён сказаў лажыцца на аперацыю. Прайшла і апраменьванне, і гармонатэрапію, і таргетную тэрапію — гэта была вельмі складаная пухліна. Тое ж самае са шчытападобнай залозай праз дзевяць гадоў. Першая хвароба ў мяне была выяўлена на трэцяй стадыі, другая — на другой, і трэцяя — на першай. Вось такая стратэгія на паніжэнне!

***— Як вы даведаліся пра рак шчытападобнай залозы?***

— Падчас УГД, якое штогод раблю комплексна — платна. І ўсім раю яго праходзіць, плюс біяхімічны аналіз крыві. Рак развіваецца на працягу некалькіх гадоў, і яму заўсёды папярэднічаюць запаленчыя ці іншыя хваробы. Аналіз крыві можа ўказаць, што ў арганізме ёсць нейкі дысбаланс. Калі СОЭ (паказчык хуткасці асядання эрытрацытаў. — **Аўт.**) на працягу некалькіх гадоў не ў норме, не чакайце, што пройдзе само. Гэта значыць, што трэба шукаць прычыну.

***— Вы не баіцеся падчас абследавання даведацца пра страшную навіну? Гэта многіх спыняе ад паходу да ўрача.***

— Вось і прадстаўнікі пазітыўнай псіхалогіі кажуць мне, што я негатыўна думаю, калі разглядаю дрэнныя варыянты *(усміхаецца)*. Але я цяпер ведаю, што магу пачуць ад урачоў усё, што заўгодна. І заўсёды прыкідваю, якія ў мяне планы, і як я магу іх змяніць. У мяне заўсёды ёсць ліст чакання па кнігах, фільмах. Разумею, што калі будзе вольны час, змагу пачытаць, кіно паглядзець. Кіно, дарэчы, добры антыдэпрэсант для людзей, якія праходзяць хіміятэрапію. Часам своечасова прагледжаны фільм дае адказы на многія пытанні.

***— Вы задавалі сабе пытанне: чаму я?***

— Мы ўсе гэта пытанне сабе задаём, калі ўпершыню чуем дыягназ. Канешне, асабліва ў маладосці, улічваючы, колькі гордасці ў мяне было. Я ж зорка, завуч, да якога ўся рэспубліка прыязджае вучыцца! І ў аспірантуру я паступіла, і муж у мяне будзе заможны — я шмат чаго планавала. Мне своечасова трапіліся першыя 12 вершаў з сёмай главы Евангелля ад Матфея. І фокус са знешняга чалавека перамясціўся на ўнутранага. У жніўні, напярэдадні маёй першай аперацыі мой клас, які выпусціўся са школы, сабраўся і прыехаў да мяне ў Бараўляны. Гэта дало мне столькі натхнення! Я ішла ў аперацыйную і ўсміхалася, бо ў мяне дзеці стаялі перад вачыма. Значыць, нешта ў гэтым жыцці я паспела... Вучні мне расказвалі пра людзей, якія перанеслі рак і шмат гадоў жылі. Прыязджалі і мае калегі. Я сутыкнулася з такой колькасцю клопату аб сабе ад людзей, ад якіх я нічога не чакала... Майму хлопцу, дарэчы, не патрэбна была хворая жонка. Праз два гады, калі ўбачыў, што я жывая, хацеў наладзіць адносіны, і тады, магчыма, дзесьці я павяла сябе няправільна — не здолела прабачыць. Я зразумела ступень сваёй халоднасці, да дыягназу я была як снежная каралева. І падчас хваробы я ўсвядоміла: колькі б мне не засталося, я павінна жыць іншым чалавекам. Так я прыйшла да веры. Усвядоміла каштоўнасць людзей, якія мяне акружаюць.

***— Калі вы прыйшлі да думкі стварыць арганізацыю для анкахворых?***

— Нават пасля першай хваробы я не стала закрывацца, хоць многія так робяць. Я памятала, як мае вучні расказвалі пра анкапацыентаў і як мне гэта было важна пачуць. Я зразумела: вобраз жыцця — гэта не пэўны час, а назаўсёды. У мяне нарадзілася ідэя жывых пісьмаў. Я хацела збіраць гісторыі людзей на дыску. Пасля Юля Чарняўская зрабіла маё пісьмо асобным фільмам. І людзі сталі тэлефанаваць. Аднойчы на круглым стале з анколагамі я зразумела, што патрэбна арганізацыя вылечаных пацыентаў, у тым ліку і ўрачам. Восенню 2011 года мы пачалі праводзіць першыя сустрэчы пад эгідай жаночай грамадскай арганізацыі. А 10 сакавіка 2014 года быў зарэгістраваны Цэнтр падтрымкі анкапацыентаў.

**«Урачы нічога не рэкамендавалі: ты вылечышся — жыві як жыў. Інтэрнэту яшчэ не было. І я пачала займацца па сістэме Нішы ў выкладанні Маі Гагулан. Цяпер многія рэчы адтуль навукова абгрунтаваныя».**

***— Што самае страшнае ў анказахворванні? Якая пацыенту патрэбна дапамога?***

— Самае важнае — зразумець і прыняць, што з табой гэта здарылася. Усе мы думаем, што гэта памылка, гэтага не можа быць са мной. І калі я буду нешта рабіць, напрыклад, грошы ахвярую на дабрачыннасць і пралячуся, дакладна буду здаровы. І калі гэта не спрацоўвае, пачынаецца дэпрэсія. Ёсць людзі, якія кажуць: папраўіўся і забыў, як страшны сон. На мой погляд, гэта няправільна. Твой ранейшы лад жыцця прывёў да таго, што імунная сістэма не справілася супраць раку. І цяпер задача, каб гэта сітуацыя — калі імунная сістэма аднойчы дала збой, і ён зафіксаваны ў якасці дыягназу — больш не паўтарылася. Калі я хачу забыць, гэта значыць, я нічога не хачу ў сваім жыцці мяняць: ні ў харчаванні, ні ў фізкультуры, ні ў псіхаэмацыянальным стане. Таму гэты страшны сон можа вярнуцца.

У арганізацыі мы робім усё, каб аблегчыць жыццё анкапацыенту, каб гэты новы лад жыцця пабудаваць. Мы выпрацавалі інфармацыйныя пакеты з парадамі ад урачоў, якія плануем прапагандаваць шырэй. Часам дастаткова аднаго званка, каб чалавек супакоіўся і зразумеў, што ён не адзін.

***— Вы вялікую частку жыцця прысвяцілі барацьбе з ракам і дапамозе анкахворым. Вельмі складаная місія...***

— Я шмат нагледзелася на тое, як людзі марнуюць сваё жыццё на пустое. І сама была такая ж у тым жыцці. Але гэта ўсё сыходзіць, аблушчваецца, калі ты бачыш галоўнае. І я шчаслівы чалавек, бо ведаю галоўнае. І ёсць людзі, якія гэта таксама шукаюць. Таму рада, што наша арганізацыя можа дапамагчы такім людзям.

## Дата

## Трансплантацыі сэрца — 10 гадоў

**Беларускія кардыёлагі адзначаюць дзесяцігоддзе з моманту першай у Беларусі перасадкі сэрца. Яна была выканана ў ноч з 12 на 13 лютага 2009 года ў РНПЦ «Кардыялогія». Пацыентку прааперыраваў прафесар, доктар медыцынскіх навук, кардыяхірург Юрый АСТРОЎСКІ.**

Трансплантацыя сэрца — фінальная стадыя лячэння хранічнай сардэчнай недастатковасці, калі медыкаментозным ці хірургічным метадам пацыенту ўжо не дапамагчы. Па інфармацыі **намесніка дырэктара па тэрапеўтычнай дапамозе РНПЦ «Кардыялогія» Алены КУРЛЯНСКАЙ**, за дзесяцігоддзе ў Беларусі выканана 326 трансплантацый сэрца. Штогод праводзіцца каля 40 такіх аперацый.

У 2016-м беларускія кардыяхірургі ўзялі чарговую вяршыню. У лістападзе яны правялі аперацыю па перасадцы комплексу сэрца-лёгкія. І сёння такія ўмяшанні ва ўсім свеце лічацца найскладанейшымі ў сусветнай трансплантапогіі. Пацыентам стаў 32-гадовы мужчына, у якога адначасова развілася і сардэчная, і лёгачная недастатковасць. Сама аперацыя доўжылася каля 9 гадзін, а задзейнічана ў ёй было каля 20 медыкаў.

На дасягнутым беларускія кардыяхірургі не спыняюцца, штогод асвойваючы новыя методыкі. У красавіку мінулага года былі праведзены першыя не толькі ў Беларусі, але і ў СНД аперацыі па лячэнні хранічнай сардэчнай недастатковасці з высокай рызыкай хірургічнага ўмяшання. Гэта імплантацыя сістэмы *MitraClip, якая паказана пэўнай катэгорыі пацыентаў, якім рызыкоўна праводзіць адкрытыя хірургічныя аперацыі. Такое ўмяшанне патрабавала пэўных навыкаў і ведаў, таму для першых імплантацый у Беларусь запрасілі спецыялістаў з Грэцыі, а беларускія ўрачы стажыраваліся ў Бельгіі.*

У снежні мінулага года ў РНПЦ «Кардыялогія» была праведзена першая гібрыдная аперацыя па амерыканскай тэхналогіі. Беларускіх калег кансультавалі спецыялісты з ЗША, а за працэсам у адукацыйных мэтах назіралі кардыяхірургі з іншых краін, у тым ліку Іспаніі, Германіі і Італіі. Пацыенткай стала жыхарка Мінска, у якой развілася ішэмічная кардыяміяпатыя пасля перанесенага інфаркту з вялікай анеўрызмай левага жалудачка.

— Пры такіх паталогіях анеўрызма не ўдзельнічае ў скарачэнні сэрца, выклікае сардэчную недастатковасць, што скарачае жыццё пацыента. Рэдуцыраванне (змяншэнне) анеўрызмы падаўжае жыццё. Такія аперацыі — будучыня кардыялогіі, — расказаў тады **дырэктар РНПЦ «Кардыялогія» Аляксандр МРОЧАК.**

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**




# АБЫ ШТО... І ЗВЕРХУ — БАНЦІК

Сёння розныя гандлёвыя сеткі, каб прывабіць пакупнікоў, ладзяць шматлікія конкурсы: маўляў, заходзьце, людзі добрыя, набывайце сабе пэўныя тавары і выйгравайце... Ды хоць машыны з кватэрамі! Вось народ і ідзе ў такія крамы. Думае, а раптам пашанцуе?

Дык вось. Жыла ў вёсцы адна сям'я. І бацькі ў ёй, і дарослыя дзеці працавалі ў мясцовай гаспадарцы, па той жа хлеб ды што-небудзь да хлеба хадзілі ў найбліжэйшую краму. Там усё было як заўсёды: тавары, цэннікі і ніякіх табе сюрпрызаў... Па іх, калі хочаш, можаш у горад з'ездзіць. Але навошта і час свой траціць, і за дарогу плаціць? Лепш за тыя грошы бохан хлеба купіць ці якую цукерчыну...

Вось так гэта сям'я думала, вось так яна і жыла, аж пакуль не дайшлі навіны, што ў райцэнтры новая крама адкрылася. А ў ёй — ну чаго толькі няма... Ды яшчэ і танней, чым у іншых!

Для таго каб гэта праверыць, людзі дачакаліся наступнай зарплаты, дамовіліся з машынай і паехалі ў «разведку».

Шмат што ў той дзень купілі. Толькі пад вечар вярнуліся назад. Суседзі давай распытваць, што там ды як, ці такая ўжо добрая крама, як яе малююць?

«Разведчыкі» таіцца не сталі: расказалі, што купілі, колькі грошай аддалі. Пахваліліся яшчэ, што ім за вялікую колькасць пакупак жвачак на касе далі, прычым бясплатна.

— Ды ну... Быць не можа! — здзівіліся вяскоўцы.

— Праўда! Каб нам з месца не сысці! — ледзь не бажыліся пакупнікі.

І тут жа расказвалі, што называюцца тыя жуйкі быццам прыгожа — не тое банцікі, не тое бонікі... А вось на смак... Абы што: яны тую гадасць нават есці не сталі.

— І правільна зрабілі, — пахваліў адзін з дасведчаных суседзяў ды растлумачыў, што (канкрэтна) яны каштавалі на смак. Во дзе смеху было!

Але ж пра сваю паездку ў райцэнтр сям'я не шкадавала. Засвоіла хіба: не ўсё, што даюць у крамах (а тым больш задарма), варта класці ў рот.

**Андрэй Сідарэйка,**
*г. Мінск.*

# ПРА ШЧАСЦЕ, ШТО БЫЛО МАГЧЫМЫМ

...Наш сваяк не так даўно адзначаў юбілей. Чалавек, можа, з трыццаць на яго сабралася. Але адно крэсла доўгі час пуставала. Відавочна — нехта спазняўся. А калі з'явіўся, аказалася, што чалавека ў дарозе банальна абакралі. Не дзіва, што многія за сталом сталі ўспамінаць сваё — хто пачутае, хто перажытае... У асноўным, вядома ж, сумнае, крыўднае, але потым мы пайшлі пакурыць, і адзін з мужчын расказаў...

Мне засталося толькі запісаць.

«Значыць, здарылася гэта гадоў сорак назад. Мы з маім сябрам Пятром тады здалі апошні экзамен апошняй сесіі і гэтую падзею, вядома ж, добра адзначылі.

Меліся ў нас планы і на заўтра. Справа ў тым, што Пятро амаль год круціў раман з пяцікурсніцай Наташай, і тая, баючыся трапіць па размеркаванні ў якую-небудзь глухую вёску, сабралася выйсці замуж: якраз на гэты дзень запрасіла Пятра ў госці, каб пазнаёміць з бацькамі.

Напярэдадні мы (Пеця адзін ехаць баяўся) вычысцілі адзежу і абутак, адпрасавалі штаны, купілі ў краме сем гваздзікоў і маленькі торцік (на большае пасля ўчарашняга грошай не было) ды селі ў электрычку.

Народу ў вагоне было зусім мала. Так што мы ўладкаваліся каля ўвахода і, вядома ж, бачылі, як услед за намі зайшла грузная бабуля з вялікім тортам. Яе мучыла задышка, таму далей у вагон яна не пайшла — цяжка села насупраць, праўда, з іншага боку ад прахода. Сумачку яна паставіла сабе на калені, торт — на лаўку злева і амаль тут жа заснула. Мы з Пятром таксама хацелі, але не маглі: слухалі аб'явы, пазіралі ў акно, каб не прапусціць патрэбную станцыю.

...З вагона, калі пад'ехалі, я падаўся першы, азірнуўся на Пецю і не паверыў сваім вачам: той, апроч кветак, трымаў... бабулін вялікі торт.

— Ты што — звар'яцеў? — накінуўся я на сябра.

— Не, я наадварот, зрабіў як лепей, — стаў бараніцца ён. — Бабуля ж і так пудоў сем заважыць... Ды і цукроўка ў яе — па ўсім відаць... Ёй нельга салодкага, а нам — самы раз. У сям'ю ж ідзём.

Мне гэты паход ужо зусім не падабаўся, але што тут будзеш рабіць — даганяць электрычку?



...Бацькі Наташы сустрэлі нас досыць гасцінна, паказалі дом і надворныя пабудовы, пасадзілі за шчодры стол. Нам, мужчынам, у маленькія кілішкі налівалі малдаўскага каньяку, жанчынам — шампанскага, пацякла няспешная гутарка. Разам з гаспадаром мы бэсцілі Рэйгана і Маргарэт Тэтчэр, услед за гаспадыняй, але з меншым энтузіязмам, хвалілі Гарбачова і яго сухі закон. Атмасфера за сталом станавілася ўсё меней змушанай і ледзь не сяброўскай. У перапынку мы нават пагарталі альбом з фотакарткамі — пазнаёміліся, хоць і завочна, з гісторыяй сям'і, з далёкай і блізкай раднёй.

Тым часам на кухні закіпеў чайнік. На стале замест талерак з'явілася ваза з цукеркамі і пячэннем, сподачкі, кубачкі і нарэшце торт. Яго паставілі ў самым цэнтры, знялі накрыўку і...

Гогаль, яго мёртвая сцэна з «Рэвізора», як той казаў, адпачываюць, бо тое, што ўбачылі, было куды мацнейшае: у каробцы, пад накрыўкай, ляжаў... кот — невялікі, нежывы.

Наташа, закрыўшы твар, кінулася да ракавіны, яе маці — асела ў крэсле, бацька лыпаў вачамі і ротам хапаў паветра. Мы з Пятром, пакуль ніхто не ачомаўся, ганебна збеглі. Ён нават сваю бабровую шапку забыўся».

...На гэтым апавядальнік змоўк. Нехта з кампаніі курцоў, уяўляючы карціну і наступствы, ад душы рагатаў, нехта — не вельмі верыў. А я дык адразу, бо цудоўна помню, як некалі даўно не стала нашага ката, як мы ўсёй сям'ёй яго шкадавалі і думалі, дзе пахаваць. «Найлепей — на дачы», — прапанавала бабуля, і яны з дзедам яго павезлі. Таксама ў каробцы (ад маіх новых ботаў), таксама ў электрычцы ў бок Маладзечна.

Праўда, нашаму кату ў дарозе пашчасціла больш: ён паспяхова даехаў і цяпер спачывае ў блізкім ад дачы лесе. А вось той, з якім хлопцы ехалі ў агледзіны...

Хочацца верыць, што нехта пахаваў і яго. Магчыма — разам з надзеяй выйсці замуж за Пецю.

**А. Лаўрыновіч,**
*г. Мінск.*

# ПЕРШЫЯ КРОКІ Ў БІЗНЕС

Не адкрыю Амерыку, калі скажу, што ўсе людзі розныя, што ў кожнага свае дзівацтвы і захапленні, калі карысныя, а калі і не.

Баба Жэня, напрыклад, «кукобіла» грошы: усё жыццё была сквапная, а пад старасць дык і зусім — пераплюнула Плюшкіна. І ўсё таму, відаць, што нябожчык муж на гэта мала зважаў (што, маўляў, з дурніцы возьмеш?), дзеці таксама неяк змалку прывыкалі абыходзіцца, нічога не прасіць у маці. А той і добра. Здароўем лёс не пакрыўдзіў, рабіць магла. Нават аўдавеўшы, сама садзіла агарод, пыніла гаспадарку, што-нішто з яе прадавала — усё ж капейка... Да таго ж дарослая дачка ўзялася адзяваць ды абуваць яе, сын — забяспечваць дровамі... Хоць гэта яму і цяжка было, бо гадаваў траіх дзяцей — дзвюх дачок-студэнтак і сына. Але ж і маці шкадаваў, бо тая ўвесь час наракала, што пенсія ідзе на лекі, што ў краму хадзіць далёка, вочы не бачаць, ногі баляць, сацыяльнаму работніку заплаціць трэба...

Вось тут сын і вырашыў, што замест яго да бабулі будзе прыходзіць Толік, унук. Ну чаму б і не, калі хлопец ужо не маленькі (шосты год у школу ходзіць), бацькаў «Жыгуль» асвойвае, у розных там гаджэтах-камп'ютарах «сячэ»... Значыць, бабулі дапамагаць таксама зможа.

Толя згадзіўся, не сказаць, каб з ахвотай, бо чуў, як мама казала, што баба Жэня скупяндзя яшчэ тая, што яна, мусіць, грэчку лічыць перад тым, як зварыць.

І бабуліны размовы ён таксама чуў. Паштарка, бывала, прынясе ёй пенсію, прапануе выпісаць якую газету. Але ж дзе там — баба казала, што грошай няма. А калі тая сыходзіла, пачынала наракаць, што пенсію дала ёй «аднымі пяцёркамі», а «вялікіх» грошай (так бабуля казала) як быццам няма. А іх жа лепей і лічыць, і захоўваць.

Скеміўшы гэта, унук узяўся дапамагаць: мяняць яе дробныя купюры на большыя — 20-рублёвыя. Ды яшчэ і купляць зефір, пасцілу, мармелад, а галоўнае — біскветныя рулецікі з рознымі крэмамі. Бабуля іх дужа ўпадабала, хоць і казала, што гэта ж, мусіць, вельмі дорага. Толік тады супакойваў: маўляў, не больш, чым маці яму дае на школьны абед.

Вось так яны і жылі, унук і бабуля, вось так і шыкавалі, пакуль...

Недзе напрадвесні Толікаў тата надумаў памяняць рухавік ва ўласным трактары і прыйшоў да маці пазычыць тысячу рублёў. Адмовіць сыну баба Жэня не магла, але ж пабурчала, што жыць трэба ашчадней, не даваць малому ў школу па 20 рублёў на абед...

Сын здзівіўся — хацеў адказаць, што ніхто яму столькі не даваў і не дае, але гаспадыня паслала яго па дровы.

Калі прынёс, на стале, у пакецику, ужо ляжаў стос грошай. Маці сказала, што тут — роўна тысяча. Сын пералічваць не стаў: паабяцаў, што пастараецца хутка аддаць.

І толькі дома, разгарнуўшы пакет, жахнуўся, знямеў: там, з цэлай тысячы рублёў, толькі дзвесце былі сапраўдныя, астатнія — вартая жалю падробка, надрукаваная на каляровым прынтары. «Як? Адкуль гэта ў бабулі ўзялося?» — не разумеў ён.

Жонка ўмаліла нікуды не хадзіць, не пароць гарачку — дачакацца са школы Толіка.

Калі той прыйшоў, бацька пасадзіў яго за стол, моўчкі паклаў пачак грошай.

Адпірацца не выпадала: малы шчыра прызнаўся, што дваццаткі друкаваў ён, а ўзамен браў у бабулі пяцёркі.

На довады бацькі, што гэта пахне турмой, сын адказаў, што ён не дурны і нікому, апроч бабулі, грошы не мяняў. А той жа, маўляў, усё роўна, што ў панчоху запіхваць: колькі тысячы рублёў савецкіх прапала і гэтыя, можа, прападуць. А так хоць нешта смачнае з'ела...

Як быццам правільна сын казаў, але ж бацька ўзяўся расшпільваць дзягу. Толік маланкай сігануў на шафу, маці мітусілася паміж імі. Яна ледзь стрымлівала смех і жах, бо, вядома ж, разумела (і казала), што трэба недзе пазычаць грошай на рухавік, а потым аддаваць даўгі — у тым ліку і маці...

Седзячы пад столлю, юны фінансіст параіў вось гэтую пазыку аддаць тымі ж грашыма, што ўзяў, але бацька не слухаў — абзываў яго смаркачом, хамутом, бязменам, які не разумее, што ўтварыў.

А далей... «Вытворчасць» ліпавых дваццатак паспяхова накрылася. Доўг бабулі бацька аддаў. Сапраўднымі.

**Ніна Кандрашонак,**
*г. Петрыкаў.*

# ДЗЕ ГРЭХ, ТАМ І ДВА?

Гэта здарылася даўно з маім свёкрам Антонам Антонавічам, які ў маладыя гады па камсамольскай пуцёўцы «махнуў» на цаліну, некалькі месяцаў працаваў там «без выхадных і прахадных», потым на нейкі час прыязджаў дадому. Праўда, не сказаць каб дужа адпачываў там, бо іншых мужчын у хаце не было, а работы ў вёсцы заўжды хапала. Маці адна даглядала скаціну, садзіла бульбу, гарод, касіла, вазіла... Часам, вядома ж, наймала памочнікаў і, каб аддзячыць ім, заўжды трымала самагонку.

Сына таксама пачаставала ў чарговы прыезд і з той вялікай радасці. А ён жа не сляпы — заўважыў, адкуль прынесла, і потым пачаставаўся сам: «апрыходаваў» з сябрамі некалькі пляшак, а ў пустыя наліў вады.

...Але ж вось «адпачынак» ягоны скончыўся, трэба зноў ад'язджаць, а на душы — камень: падмануў жа матулю і прызнавацца сорам. Падумаў: ай, хай будзе, што будзе, дзе адзін грэх, там і два. Сеў у кухні за стол, разгарнуў газету, зрабіў выгляд, што ўважліва чытае.

— Што там пішуць, сынок? — спытала матуля, наліваючы на патэльню аладкі.

— Ды вось вучоныя даказалі, што гарэлка можа страціць градус, калі доўга пастаіць, — «прачытаў» грамацей.

— Не можа быць?! — здзівілася маці.

— Тут напісана, што не раз правяралі: можа... Пераправерыца ў ваду...

— Трэба нашу праверыць, — сказала гаспадыня і, адставіўшы ў бок патэльню, па драбінах сіганула на вышкі, дзе была ее схованка. Узяла там бутэльку, прынесла да стала, адкаркавала, лінула на донца чаркі:

— Антось, дальбог жа праўда, — прызнала, пакаштаваўшы. — Вада...

Такім чынам ні ў чым не вінаваты госць паехаў на сваю цаліну. Толькі праз гады ён прызнаўся маці ў сваіх грахах.

**Таццяна Халопіца,**
*в. Затур'я, Нясвіжскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

**Ад яе ж** чарговы напамін, што ўсе «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі з жыцця чытачоў» на старонках «Звязды» не проста друкуюцца, — яны ўдзельнічаюць у конкурсе на найлепшую. Вынікі яго будуць падведзены на пачатку наступнага года. Журы — і вялікае чытацкае пад старшынствам **спадарыні Соф'і Кусянковай з Рагачоўшчыны,** і маленькае рэдакцыйнае на чале з **першым намеснікам галоўнага рэдактара спадарыняй Наталляй Карпенкай —** працуе, гісторыі пошта прынясіць... Так што пішыце!

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Брестский райагросервис»

**Предмет торгов**

**Лот:**
1) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-89032, площадью 622,0 кв. м, (наименование: площадка с асфальтобетонным покрытием, назначение: сооружение неустановленного назначения), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 121283004101000472, площадью 0,0789 га, по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, д. Ковердяки, ул. Трудовая, 67А

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (без учета НДС)** | **7 100,00** | **Размер задатка, руб.:** | **710,00** |
| **Условия продажи** | Без условий | | |
| **Организатор торгов** | Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи | | |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк». Региональная дирекция № 100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 | | |

**Аукцион состоится 19 марта 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329, в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 18 марта 2019 г. до 17.00**

*** Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает продавцу НДС в размере 20 % от продажной стоимости объекта, вознаграждение Организатору аукционных торгов**

Утерянные бухгалтерские документы, уставные документы, приказы ОООР «Альбатростехно», УНП 191456213, **считать недействительными.**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ
### о проведении аукциона по продаже в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов

| | |
|---|---|
| 1. Дата, время, место проведения аукциона: 15 марта 2019 года, в 15.00, в здании Великодолецкого сельского Дома культуры, ул. Лесная, 2а | |
| 2. Адрес участка | Участок № 1: д. Заозерье, ул. Центральная, 13А, Великодолецкого сельсовета Ушачского района, Витебской области, возле озера Муроги |
| 3. Площадь участка | 0,2499 га |
| 4. Кадастровый номер | 224980706101000064 |
| 5. Начальная цена | 3500.00 рублей |
| 6. Шаг аукциона | 350.00 рублей |
| 7. Размер задатка | 350.00 рублей |
| 8. Место, дата, время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов: Ушачский район, аг. Великие Дольцы, ул. Центральная, 1б, в рабочие дни с 9.00 до 16.00 с 15.02.2019 по 12.03.2019 включительно | |
| 9. Размер задатка вносится на расчетный счет: Великодолецкий сельский исполнительный комитет BY93AKBB36413280114852300000 в ф-ле № 216 ОАО «СБ «Беларусбанк» г. Полоцк, код AKBBBY21216, УНП 300007086, ОКПО 28677750 | |
| 10. Адрес и номера контактных телефонов: Ушачский район, аг. Великие Дольцы, ул. Центральная, 1б, Великодолецкий сельисполком, (8 02158) 53323, 53338, в рабочие дни с 8.00 до 16.00 | |

## Уважаемые акционеры, наблюдательный совет ОАО «Світанак» г. Жодино сообщает: 26.03.2019 состоится годовое общее собрание акционеров

Открытого акционерного общества ОАО «Світанак» г. Жодино.

Место нахождения: г. Жодино, ул. 8 Марта, 1.

Собрание пройдет по адресу: г. Жодино, ул. 8 Марта, 1, актовый зал (4-й этаж).

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2018 году и основных направлениях деятельности Общества на 2019 год.
2. Отчет о работе наблюдательного совета в 2018 году. Оценка деятельности директора за 2018 год. Отзыв наблюдательного совета о годовом балансе Общества.
3. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
4. О результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2018 год.
5. Утверждение годовой бухгалтерской отчетности Общества за 2018 год.
6. О распределении прибыли предприятия и выплате дивидендов за 2018 год.
7. Утверждение плана распределения прибыли предприятия на 2019 год и периодичности выплаты дивидендов за 2019 год.
8. Внесение изменений и дополнений в Устав общества.
9. Утверждение размера вознаграждений членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Жодино, ул. 8 Марта, 1 (библиотека профкома) с 15 по 25 марта 2019 года (время работы с 8.00 до 17.00) либо 26 марта 2019 года по месту проведения собрания.

Начало работы собрания – 26.03.2019 в 11.00

Регистрация участников собрания с 9.30 до 10.50 по месту проведения собрания.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного на 01.03.2019.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:

акционеру общества (физическое лицо) – паспорт, руководителю юридического лица, являющегося акционером, – документ, подтверждающий его должностное положение, и паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 600038919

ОАО «МАПИД» приглашает всех желающих принять участие в торгах (аукционе) по продаже неиспользуемой бывшей в эксплуатации техники. Заявление на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, каб. 17. Окончание приема заявлений 19.03.2019 г. в 10.30. Более подробная информация об аукционе на сайте www.mapid.by, по телефону 8 (017) 397-57-32. Аукцион состоится 19.03.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, каб. 17. Наименование предмета торгов (аукциона), начальная цена (с НДС):

Лот № 1 – Бульдозер ДЗ-42 (2007 г. в., инв. №1529), цена – 6 020,30 руб. с НДС;

Лот № 2 – Автомобиль Ауди А4, (2009 г. в.), цена – 28 025,86 руб. с НДС;

Лот № 3 – Автомобиль Renault Koleos (внедарожник), (2014 г. в.), цена – 32 581,06 руб. с НДС;

Победитель электронных торгов (претендент на покупку) обязуется возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, а также затраты на оказание услуг по независимой оценке движимого имущества.

УНП 100008115

**ЗАСО «Промтрансинвест» предлагает принять участие в процедуре закупки № 2019-670174,** размещенной на сайте http://www.icetrade.by, по «Полиграфическая / издательская деятельность > Бланки / книги учета».
УНП 100357923

В суд Костюковичского района Могилевской области поступило заявление Валевской Любови Александровны об объявлении умершим Валевского Владимира Владимировича, 5 июля 1962 года рождения, уроженца деревни Климовичи Зельвенского района Гродненской области Республики Беларусь, последнее известное место жительства и пребывания: Республика Беларусь, Могилевская область, город Костюковичи, улица Микрорайон Молодежный, дом 2, квартира 38, настоящее место пребывания неизвестно.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о гражданине Валевском Владимире Владимировиче, сообщить их суду Костюковичского района в течение двух месяцев со дня публикации.

## ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 28 февраля 2019 года на 4-м открытом аукционе проводит 1-й от 17 января 2019 года и 3-й от 14 февраля 2019 года повторные открытые аукционы по продаже имущества республиканской собственности

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 8 | Гусеничное шасси АТС-59Г ш. 1141106 дв. 7АЕ046Е 1985 г. *4 кат. 1 442 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 8 000,00 | 1 600,00 |
| 9 | Гусеничное шасси АТС-59Г ш. 114216525 дв. 7АF0752Е 1985 г. *4 кат. 4 250 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 7 500,00 | 1 500,00 |
| 10 | Гусеничное шасси АТС-59Г ш. 11412449 дв. 7АЕ1239Е 1986 г. *4 кат. 2 072 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 8 000,00 | 1 600,00 |
| 13 | Седельный тягач КамАЗ-54112 ш. ХТС541120К0021424 дв. 425289 1989 г. *4 кат. 86 999 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 9 500,00 | 1 900,00 |
| 33 | Гусеничное шасси АТС-59Г ш. 113806525 дв. 7АВ0610Е 1982 г. *4 кат. 16 575 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 7 500,00 | 1 500,00 |
| 34 | Гусеничное шасси АТС-59Г ш. 1140087 дв. 7АД0397Е 1984 г. *4 кат. 23 434 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 7 500,00 | 1 500,00 |
| 36 | Гусеничное шасси АТС-59Г ш. 11421834 дв. 7АF0858Е 1986 г. *4 кат. 4 589 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 8 000,00 | 1 600,00 |
| 37 | Гусеничное шасси АТС-59Г ш. 113112558 дв. б/н 1983 г. *4 кат. 5 893 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 7 500,00 | 1 500,00 |
| 40 | Гусеничное шасси АТС-59Г ш. 1138027 дв. 7АВ0454Е 1982 г. *4 кат. 10 887 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 7 500,00 | 1 500,00 |
| 42 | Кузов-фургон КБ1.4320Д № 112264 1988 г. *4 кат.* Автошасси КамАЗ-4310 ш. 0053224 дв. 0350292 1988 г. *3 кат. 20 768 км* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 9 000,00 | 1 800,00 |
| 43 | Кузов-фургон КБ1-375 № 11191 1985 г. *4 кат.* Автошасси Урал-375АМ ш. 430164 дв. 510030 1984 г. *4 кат. 7 983 км* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 6 000,00 | 1 200,00 |
| 45 | Кузов-фургон К-375 № 01033 1979 г. *4 кат.* Автошасси Урал-375 ш. 290556 дв. 828759 1979 г. *4 кат. 4 419 км* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 6 000,00 | 1 200,00 |
| 46 | Кузов-фургон К-66Н № 154380 1970 г. *4 кат.* Автошасси ГАЗ-66-05 ш. 4386199 дв. 295325 1970 г. *4 кат. 6 666 км* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 2 800,00 | 560,00 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **28 февраля 2019 г. в 10.30.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до **15.00 25 февраля 2019 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **28 февраля 2019 г. с 9.00 до 9.45.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона**.**
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с BY51BPSB30121078830299330000, российские рубли – р/с BY05BPSB30121078830876430000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-СберБанк», г. Минск, ул. Чкалова, 18, корп. 1, код BPSBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225 ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России №30101810400000000225. **Без НДС**. **Справки по тел./факсу (017) 398 05 41.**

Ранее опубликованные извещения в газете «Звязда» № 227 от 24.11.18, № 245 от 20.12.18 г.

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### о проведении годового общего собрания акционеров

Годовое общее собрание акционеров ОАО «Белэнергозащита» состоится **27 марта 2019 года в 11.00** по адресу: **г. Минск, ул. Монтажников, 12.**

Собрание проводится в очной форме. Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет осуществляться в день проведения собрания по месту (адресу) проведения собрания. Время начала регистрации: 10.00. Время окончания регистрации: 10.45.

Дата формирования реестра владельцев акций Общества, на основании которого будет составлен список лиц, имеющих право на участие в собрании: 15 марта 2019 года.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2018 год (отчеты органов управления и контроля Общества) и основных направлениях деятельности Общества на 2019 год.
2. Об утверждении годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества, распределение прибыли и убытков Общества по результатам 2018 года.
3. Об утверждении дивидендов за 2018 год.
4. Об избрании членов наблюдательного совета Общества.
5. Об избрании членов ревизионной комиссии Общества.
6. О вознаграждениях и компенсациях расходов членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

Ознакомление лиц, имеющих право на участие в собрании, с информацией (документами), подлежащей предоставлению при подготовке к проведению собрания, будет осуществляться в рабочие дни и рабочее время с 16 по 26 марта 2019 года по адресу: г. Минск, пер. Бехтерева, 7, а в день проведения собрания – во время и в месте проведения собрания (27 марта 2019 года, г. Минск, ул. Монтажников, 12).

Для регистрации участнику собрания необходимо предъявить документ, удостоверяющий личность, а также, если необходимо, документы, подтверждающие его полномочия: доверенность и/или другие документы в соответствии с действующим законодательством.

УНП 100098854

## Извещение о проведении 26 февраля 2019 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ №7»

| Предмет торгов |
|---|
| «нежилой сборный домик» общей площадью 54,8 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 600/С-109697; «повышенный железнодорожный путь» протяженностью 240 м, инв. № в ЕГРНИ 600/С-146178; «сооружение артезианской скважины», инв. № в ЕГРНИ 600/С-102835; «цементный склад», инв. № в ЕГРНИ 600/С-102840 (составные части и принадлежности: цементный склад с навесом цементного склада с пристройкой а1, навесом цементного склада с шиферной крышей а2, ограждением а3); «цементобетонная площадка» общей площадью 1303 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 600/С-102842 (составные части и принадлежности: цементобетонная площадка с бетонной площадкой а1, ограждением а2); воздухосборник В-10 М3 (инв. № 41077); воздухосборник В-10 М3 (инв. № 41078); лебедка ТЛ 8Б (инв. № 40769); пневмоподъемник ППВ-100 (инв. № 50616); пневмоподъемник ППВ-100 (инв. № 50615); пневмоподъемник ТА 15А (инв. № 50199) |
| Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Загородная, д. 1 |
| Сведения о земельных участках: площадь – 0,6577 га, кадастровый номер – 623650100001004285; площадь – 0,0984 га, кадастровый номер – 623650100001004286; площадь – 1,0226 га, кадастровый номер – 623650100001004287; площадь – 0,0024 га, кадастровый номер – 623650100001004546 |
| Начальная цена: 422 524,35 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 42 200,00 бел. руб. |
| Обременения: аренда, сервитут |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 7», 223021, Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырево, АБК, тел. (017) 507-61-83.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 327-05-62.

**Условия торгов:**

1. Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.
2. Сохранение победителем торгов (покупателем) сервитута при переходе прав на недвижимое имущество.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 7», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 26 февраля 2019 года в 15.30 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 15.02.2019 по 25.02.2019 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 507-61-83 (ОАО «ДСТ № 7»).

Утерянный представительством Белгосстраха по Заводскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию наземных транспортных средств формы 2РН, 2РП серии ТСН № 0237338 **считать недействительным.**

УНП 100122726



Неасабісты суб'ектыў

# НА ПЯРЭДНІМ КРАІ

## Калі ў школу — як у храм, дык настаўнік павінен быць на ўзроўні як мінімум святара

ТРАГЕДЫЯ, якая адбылася на гэтым тыдні ў Стоўбцах, не пакінула раўнадушным нікога. Шмат напісана і сказана з гэтай нагоды, зноў усе задаюць гэтыя вечныя нашы пытанні «Хто вінаваты?» і «Што рабіць?». І калі варыянтаў адказаў на першае вялікае мноства, дык на другое адказу бадай што і няма. Так, схамянуліся ўсе, паехалі па школах чарговыя праверкі. Але ці будзе ад гэтага толк? Ці проста чарговы раз настаўнік адчуе сябе зацкаванай авечкай, у якую можа пагардліва тыкаць пальцам хто заўгодна: грозны правяральшчык з раёна, пажарнік, санстанцыя, абураная мамка, якой пакрыўджанае дзіця наскардзілася на несправядлівасць... Прычым усё гэта бачаць вучні, усё гэта робіцца на іх вачах.

Прэзідэнт правільна сказаў: у школу трэба ісці як у храм. Калі кіраваца гэтай абсалютна зразумелай нармальнаму чалавеку аналогіяй, настаўнік у гэтым храме павінен быць на ўзроўні святара. І адчуваць сябе на належным узроўні — у плане адказнасці, у плане прафесійнай і чалавечай годнасці. Але такога адчування не можа быць у прынцыпе без элементарнай павагі ад іншых і да самога чалавека, і да той справы, якую ён робіць. Вось гэтага апошнім часам у нашых настаўнікаў і няма. І ў школу яны ідуць не як у храм, а як на перадавую, на якой яны абсалютна безабаронныя. Перад чым — перад звычайным людскім хамствам або перад нажом у руках вучня — няважна.

ПРЫЧЫНА ў гэтай неабароненасці адна — непавага да настаўніка і да той працы, якую ён робіць. І справа тут не ў невялікіх зарплатах, якія часта ўвязваюць з прэстыжнасцю, — мая мама, працуючы ў школе на паўтары стаўкі, у савецкі час зарабляла менш, чым вясковыя даяркі, але гэта ніякім чынам не ўплывала на яе непарушны аўтарытэт. Проста ў нашай свядомасці нешта шчоўкнула, і настаўнік з носьбіта патрэбных ведаў, які ён мае ласку з нашымі дзецьмі дзяліцца, за што мы мусім быць яму як мінімум удзячныя, — і так яно было спрадвеку, і гэта правільна! — ператварыўся ў нашым разуменні ў слугу, які проста ПАВІНЕН вучыць нашых дзетак, бо яму за гэта плацяць. Аб настаўніка можна выцерці ногі, яго можна абразіць — і нічога за гэта не будзе, бо ён зноў прыйдзе на ўрок, а дзеткі будуць пасмейвацца і глядзець як на афіцыянта, які перад імі, панамі, стараецца з усіх сіл, каб яны прынесеную страву пакаштавалі і каб яна ім хоць трохі спадабалася. А крый божа гэтаму служку абурыца ці зрабіць заўвагу — тут жа можна набраць па тэлефоне мамку ці бацьку, і тыя ўжо прыляцяць на ўсіх парах і, у большасці выпадкаў нават не стараючыся разабрацца, будуць крычаць аб правах дзіцяці і пагражаць судом і ўсімі магчымымі пакараннямі на бедную настаўніцкую галаву.

ВЫ, напэўна, чулі пра гісторыю з дырэктарам адной з пінскіх школ, якая нарабіла шуму на пачатку навучальнага года. З ганка яго школы яшчэ на летніх канікулах панадзіліся катацца юныя скейтбардысты. Усё б нічога, але пачаўся навучальны год, і хлопцы на скейтах (дарэчы, вучні іншай школы) сталі рэальнай пагрозай для тых жа першакласнікаў, якіх яны проста маглі збіць з ног і пакалечыць. Дырэктар даў распараджэнне тэхперсаналу, каб тыя папрасілі спартсменаў сысці са школьнага двара. Вы думаеце, тыя паслухаліся дарослых? Яны наадварот, сталі іх, як сёння кажуць, тролліць і давялі да таго, што людзі прыйшлі да дырэктара з просьбай абараніць іх ад малалетніх хамаў. Той выйшаў на ганак, паспрабаваў паўшчуваць хуліганаў, але тыя толькі смяяліся. На добры толк, трэба было б выклікаць міліцыю, і няхай бы з імі разбіралася інспекцыя па справах непаўналетніх. Але ж хацелася па-чалавечы. Таму дырэктар проста ўзяў неслуха за каркі, каб завесці ў школу, выклікаць іх бацькоў і пагаварыць. І трэба ж было хлопцам сутыкнуцца. У аднаго аказалася рассечаная губа. Што тут пачалося! Людзі, якія бачылі ўсё гэта, расказвалі, што адзін з малых тут жа пачаў тэлефанаваць маці і крычаць: «Мамачка, мяне тут забіваюць!» Прыляцела мамка, нарабіла гвалту, пацягнула дзіця ў траўмапункт, напісала заяву ў міліцыю, хоць дырэктар і папрасіў прабачэння і губу тую пацярпеламу адразу ёдам памазалі. Пачаўся разбор, дырэктар трапіў у бальніцу, вучні, настаўнікі і бацькі арганізавалі нават флэшмоб у яго абарону...

Чым усё скончылася? Месяц назад дырэктар звольніўся па ўласным жаданні. Бяда не ў гэтым — добры педагог работу знойдзе, і нават не ў тым, што школа пазбавілася талковага (інакш бы так не абаранялі) кіраўніка. Бяда ў тым, што выйграла тут маці і яе нявыхаваны сын. Яна будзе лічыць, што мела рацыю выключна ва ўсім, і наўрад ці зробіць нейкія высновы пра тое, як выхоўваць дзіця. Сын (а яшчэ і яго аднагодкі, якія ўсё гэта назіралі) з дадзенай сітуацыі вынес, што настаўнік — ніхто, што яго можна абразіць, яго можна не слухаць, і за гэта НІЧОГА не будзе. А настаўнік на нармальную чалавечую рэакцыю НЕ МАЕ ПРАВА, бо яму па статусе не належана...

УСПАМІНАЮ аднаго фізрука з гадоў свайго школьнага дзяцінства. Ён на эмоцыях даў па твары дзесяцікласніку, здароваму боўдзілу, за тое, што той яго дэманстратыўна паслаў — прамым тэкстам. Той паскардзіўся бацьку, а бацька прыйшоў у школу і... падзякаваў фізруку за тое, што дапамог у выхаванні. Можа, гэта і тады было незаконна, але гэта было — нармальна, па законах чалавечых. Яшчэ адна карцінка з дзяцінства — ноччу на ганку стаіць п'яны дзядзька Адам, барабаніць у шыбу і крычыць на маму: «Дзе мая Тонька?! Ты класная кіраўніца, ты павінна ведаць, дзе яна шляецца!» (Тонька была ўжо ў дзясятым класе і загуляла недзе з кавалерам.) Назаўтра, працверазеўшы, дзядзька прыйшоў да мамы прасіць прабачэння. Бо накрычаў на настаўніцу, якая вучыць яго бесталковую Тоньку, якой сам не можа даць рады, бо гэта ж — настаўніца, на яе НЕЛЬГА крычаць... Вы можаце ўявіць падобнае развіццё сітуацыі сёння?

Калі ў нашым разуменні так усё перакрывілася не ў той бок? Можа, у пачатку шалёных 90-х, калі нейкі ўмоўны Пеця Сідараў, двоечнік і гультай, прыехаў да ўмоўнай Марыі Іванаўны, сваёй былой настаўніцы, на крутой тачцы і, накручваючы на палец залаты ланцуг, пагардліва спытаў: «Ну што, і які толк з вашай навукі?» Але ж сёння, дзякуй богу, ужо не дзевяностыя, адукаванасць і адукацыя цяпер тоесныя жыццёваму поспеху і паспяховасці. І ў кожнага самага геніяльнага прадпрымальніка ці праграміста на пачатку зорнай кар'еры былі людзі, якія навучылі яго чытаць, пісаць, лічыць, разумець, што такое ён сам і зямля, на якой ён жыве. Цяпер гэтыя людзі вучаць наступнае пакаленне будучых геніяў. Дык хто каму робіць ласку?

...У школу — як у храм. Пакуль застаецца толькі маліцца за нас усіх, каб калі-небудзь спраўдзілася менавіта так.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

## Извещение о проведении первых и повторных открытых аукционов по продаже земельных участков в частную собственность

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 24-63-14.

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, начальная цена |
|---|
| **Лот № 1**. Земельный участок с кадастровым № 240100000003009786 площадью 0,0836 га по адресу: г. Витебск, ул. Сенненская, участок № 3, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. **Нач. цена**: 25 832,40 бел. руб. **Задаток:** 2 583, 24 бел. руб. |
| **Лот № 2.** Земельный участок с кадастровым № 240100000003009783 площадью 0,0827 га по адресу: г. Витебск, ул. Сенненская, участок № 6, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Нач. цена**: 25 554, 30 бел. руб. **Задаток:** 2 555, 43 бел. руб. |
| **Лот № 3.** Земельный участок с кадастровым № 240100000003010026 площадью 0,0868 га по адресу: г. Витебск, ул. Сенненская, участок № 8, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Нач. цена**: 26 821,20 бел. руб. **Задаток:** 2 682,12 бел. руб. |
| **Лот № 4.** Земельный участок с кадастровым № 240100000003010147 площадью 0,0843 га по адресу: г. Витебск, ул. Сенненская, участок № 1, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. **Нач. цена**: 26 048,70 бел. руб. **Задаток:** 2 604, 87 бел. руб. |
| **Лот № 5.** Земельный участок с кадастровым № 240100000003010140 площадью 0,0873 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Сенненская, участок № 2, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. **Нач. цена**: 26 975,70 бел. руб. **Задаток:** 2 697,57 бел. руб. |
| **Лот № 6.** Земельный участок с кадастровым № 240100000003010142 площадью 0,0827 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Сенненская, участок № 4, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. **Нач. цена**: 25 554, 30 бел. руб. **Задаток:** 2 555,43 бел. руб. |
| **Лот № 7.** Земельный участок с кадастровым № 240100000003010150 площадью 0,0839 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Сенненская, У-5 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Нач. цена**: 25 925,10 бел. руб. **Задаток:** 2 592, 51 бел. руб. |
| **Лот № 8.** Земельный участок с кадастровым № 240100000003010146 площадью 0,0857 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Сенненская, участок № 7 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Нач. цена**: 26 481, 30 бел. руб. **Задаток:** 2 648,13 бел. руб. |
| **Лот № 9.** Земельный участок с кадастровым № 240100000003009525 площадью 0,1412 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Шевардиновская, 3, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, охранная зона линий электропередачи. **Нач. цена**: 27 350, 44 бел. руб. **Задаток:** 2 735,04 бел. руб. |
| **Лот № 10.** Земельный участок с кадастровым № 240100000003009280 площадью 0,1300 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Шевардиновская, 7, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, охранная зона линий электропередачи. **Нач. цена**: 25 181, 00 бел. руб. **Задаток:** 2 518,1 бел. руб. |
| **Лот № 11.** Земельный участок с кадастровым № 240100000003009271 площадью 0,1300 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Шевардиновская, 9, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, охранная зона линий электропередачи. **Нач. цена**: 25 181, 00 бел. руб. **Задаток:** 2 518,1 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 18.03.2019 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 15.02.2019 по 17.03.2019 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY14AKBB36423020002802000000 ф-л № 200 ВОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21200, УНП 300200386, получатель платежа: Витебский горисполком |

**Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за зем. участок; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения, в установленном порядке обратиться за государственной регистрацией права на земельный участок в РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; получить в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 3 месяца (лоты №№ 9, 10, 11). Обратиться в установленном порядке за получением разрешительной документации на строительство объекта в администрацию Первомайского района города Витебска (лоты №№ 4–8), в отдел архитектуры и градостроительства Витебского городского исполнительного комитета (лот № 3), в срок, не превышающий 3 месяца, с даты государственной регистрации права на земельный участок; установить сроки выполнения работ по подготовке проектной документации при заключении в установленном законом порядке договора подряда на выполнение проектных и изыскательских работ, предусмотрев срок выполнения данных работ не более одного года со дня гос. регистрации (лоты №№ 1, 2). В течение 6 месяцев (для юр. лиц) и одного года (для граждан) со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к занятию земельного участка; согласовать проектно-сметную документацию с главным архитектором города Витебска (лоты №№ 1, 2) при необходимости провести государственную экспертизу проектно-сметной документации (лот № 1); получить в установленном порядке разрешение на строительство объекта, в том числе при необходимости удаления, пересадки объектов растительного мира до начала строительных работ получить разрешение на проведение компенсационных посадок либо осуществление компенсационных выплат, в соответствии с проектно-сметной документацией (лот № 1); осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД (лоты №№ 1, 9, 10, 11); осуществить строительство в сроки установленные законодательством (лоты №№ 3–8). Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией.

Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, начальная цена |
|---|
| Лот № 1. Земельный участок с кадастровым № 221283703101000121, площадью 0,1493 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Куринский с/с, д. Задвинье, ул. Надречная, участок № 2 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (р. Западная Двина), охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 В. **Нач. цена:** 2 000,00 бел. руб. **Задаток:** 200,00 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY22AKBB36003140700920000000 ОАО «АСБ Беларусбанк» БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Куринский с/с) |
| Лот № 2. Земельный участок с кадастровым № 221285904101000239, площадью 0,1195 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Дреколье, ул. Центральная, У-2, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Боровское). **Нач. цена:** 2 000,00 бел. руб. **Задаток:** 200,00 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY89AKBB36003140901730000000 ОАО «АСБ Беларусбанк» БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа – 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Мазоловский с/с) |
| Лот № 3. Земельный участок с кадастровым № 221288500601000034, площадью 0,1387 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Туловский с/с, д. Асетки, ул. 2-я Асетковская для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Нач. цена**: 1 571,77 руб. **Задаток:** 157,18 руб. |
| Лот № 4. Земельный участок с кадастровым № 221288502601000075, площадью 0,1499 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Туловский с/с, д. Пуща, ул. 1-я Пущанская для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения на зем. участке отсутствуют. Нач. цена: 2285,25 бел.руб. Размер задатка: 228,53 бел. руб. |
| **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY36AKBB36003141301470000000 ОАО «АСБ Беларусбанк» БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа – 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Туловский с/с) |
| Лот № 5. Земельный участок с кадастровым № 221282904601000221, площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Зароновский с/с, аг. Зароново, пер. Южный 1-й, участок № 1, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Княжное), придорожные полосы (контролируемые зоны) автомобильных дорог. **Нач. цена:** 2 000,00 бел. руб. **Задаток**: 200,00 бел. руб. |
| Лот № 6. Земельный участок с кадастровым № 221282904601000220, площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Зароновский с/с, аг. Зароново, пер. Южный 1-й, участок № 2, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Княжное), придорожные полосы (контролируемые зоны) автомобильных дорог. **Нач. цена:** 2 000,00 бел. руб. **Задаток**: 200,00 бел. руб. |
| **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY53AKBB36003140600860000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Зароновский с/с) |
| Лот № 7. Земельный участок с кадастровым № 221284810101000094, площадью 0,1336 га, по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Летчанский с/с, д. Новоселки, участок 4 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (р. Западная Двина, оз. Белое). **Нач. цена:** 4 000 бел. руб. **Задаток:** 400 бел. руб. |
| Лот № 8. Земельный участок с кадастровым № 221284810101000096, площадью 0,1439 га, по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Летчанский с/с, д. Новоселки, участок 7 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (р. Западная Двина, оз. Белое). **Нач. цена:** 4 000,00 бел. руб. **Задаток:** 400,00 бел. руб. |
| **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY20AKBB36003140801090000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа – 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Летчанский с/с) |
| **Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 04.03.2019 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 27.11.2018 с 8.30 по 11.12.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30 |

**Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; в двухмесячный срок со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся обратиться в РУП «Витебское агентство по гос. регистрации и зем. кадастру» за гос. регистрацией прав на зем.участок; получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство жилого дома; в течение 1 года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем. участка; осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД; после получения разрешения на строительство объекта снять плодородный слой почвы из-под пятен застройки и использовать его на благоустройство участка. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме).

Аукционы проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. В аукционе допускается участие консолидированных участников (двух и более граждан, юр. лиц). Для участия в аукционе гражданин, юр. лицо подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юр. лица – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; консолидированными участниками оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, а представители граждан и юр. лиц, уполномоченные должностные лица юр. лиц – документ, удостоверяющий личность. При подаче документов уполномоченное лицо предъявляет доверенности, выданные гражданами, юр. лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** На гэтым тыдні атрымаецца наладзіць адносіны з партнёрамі — і ў дзелавой, і ў асабістай сферах. У прадпрымальнікаў і начальнікаў не выключаны канфлікты з падначаленымі, якія адгукнуцца ў аддаленай будучыні. Серада — дзень «дэжавю»: здаецца, вы ўсё гэта ўжо калісьці перажывалі. Магчыма, дарэчы, і аднаўленне даўніх сувязяў. Усе справы, пачатыя ў пятніцу, абяцаюць поспех. У выхадныя паспрабуйце не паддавацца ляноце і спакусам.

**ЦЯЛЕЦ.** Жыццё наладжваецца. Варта лавіць момант і радавацца быццю. Зможаце быць аднačасова ветлівымі і настойлівымі, а менавіта гэта — ключ да поспеху. Поспехам завершыцца барацьба са шкоднымі звычкамі: вы не толькі справіцеся з імі, але і дапаможаце іншым людзям. Выхадныя абяцаюць масу станоўчых эмоцый і ўражанняў.

**БЛІЗНЯТЫ.** Тыдзень абяцае быць прыемным. Вас чакаюць цікавыя падзеі і сустрэчы. Многія жаданні і мары спраўдзяцца. У аўторак парадуе каханы чалавек. Субота ўдалая для сяброўскай вечарынкі і адпачынку, нагоніце дэфіцыт зносін, стаўшы цэнтрам усеагульнай увагі. Аднак не губляйце галавы, захоўвайце спакой.

**РАК.** У пачатку тыдня лепш не даймаць сябе залішняй перагрузкай на рабоце, а прысвяціць планаванню дзейнасці на бліжэйшы час. Не фарсіруйце падзеі і не спрабуйце рабіць дзесяць спраў аднačасова. Вы ўсё паспееце, калі не будзеце спяшацца. У пятніцу можа ўзнікнуць неабходнасць адстойваць свае інтарэсы. І ў гэты ж дзень вы здабудзеце новага сябра.

**ЛЕЎ.** На гэтым тыдні не варта апускацца ў негатыў, зайздрасць, пачуццё віны. Паспрабуйце некалькі скараціць аб'ём работы. Лепш лішні раз абдумаць свае словы і дзеянні. Хуткі прагрэс у справах наўрад ці магчымы, таму пажадана запасціся цярпеннем. У сярэдзіне тыдня вас могуць уцягнуць у службовыя інтрыгі. Ваша задача на найбліжэйшы час — з той жа энергіяй, з якой вы займаецеся домам, сям'ёй і работай, пачаць займацца сабой.

**ДЗЕВА.** Актыўнасць і прадпрымальнасць прынясуць поспех у справах. Паспрабуйце спакойна ставіцца да перамен, што адбываюцца ў калектыве. Пажадана не праваказаць адкрытага супрацьстаяння і канфліктных сітуацый. Серада можа стаць адным з самых удалых дзён тыдня, практычна ўсё, што запланавалі, рэалізуецца. У выхадныя пажадана ні з кім не сварыцца, асабліва з дзецьмі.

**ШАЛІ.** Новыя ідэі і планы лепш старанна прааналізаваць, звярнуць увагу на недахопы і ліквідаваць іх, і толькі пасля гэтага пачаць ажыццяўленне. У пачатку тыдня верагодны знаёмствы, сустрэчы, паездкі. Не спрабуйце прымаць удзел ва ўсім і выкарыстоўваць усе магчымасці адразу. У выніку мала што паспееце. Вас могуць збянтэжыць адносіны з сябрамі, праявіце вытрымку і дапамажыце ім мудрай парадай.

**СКАРПІЁН.** Тыдзень можа шмат чаму навучыць. Ён насычаны падзеямі і схіляе да актыўных і рашучых дзеянняў. Трэба будзе перасіліць сябе і вызваліцца ад шэрагу комплексаў, якія абцяжарвалі жыццё. Важна не паддавацца эмоцыям. На службе, калі не будзеце разменьвацца на дробязі, чакаюць вялікія поспехі. Тыдзень удалы для здабыцця дадатковай крыніцы даходу. У пятніцу многія праблемы вырашацца самі па сабе, жаданае само пойдзе да вас у рукі, карыстайцеся момантам.

**СТРАЛЕЦ.** На гэтым тыдні вы з лёгкасцю разберацеся і з работай, і з асабістым жыццём. Галоўнае — быць больш уважлівымі да новых ідэяў, нават калі на першы погляд яны здаюцца абсурднымі. Панядзелак можа аказацца ўдалым днём для пераменаў і пераасэнсавання каштоўнасцяў. Але фінансавымі праблемамі займацца пакуль не варта. У суботу магчыма выгадная дзелавая прапанова. У нядзелю толькі вам будзе па сілах уціхамірыць кіпячыя страсці.

**КАЗЯРОГ.** На гэтым тыдні даспадобы будзе работа не ў камандзе, а па індывідуальным плане. Пракладзеныя шляхі вам не падыдуць. У панядзелак паспрабуйце не дапускаць праявы эгаізму ў адносінах да калег па рабоце і блізкіх людзей, не будзьце дробязнымі. У чацвер вы, напэўна, што-небудзь не паспееце ці куды-небудзь спознiцеся, старайся быць больш уважлівымі. У выхадныя, у спакойнай абстаноўцы можна вырашыць бытавыя праблемы, якія так доўга адкладаліся.

**ВАДАЛІЎ.** На гэтым тыдні вы здольныя на якасны рывок на рабоце. Добра было б таксама заняцца сваім здароўем, адпачыць ці адправіцца ў падарожжа. У аўторак вас чакае спакушэнне, не верце кампліментам і абяцанням. У сераду будзе выдатна атрымлівацца падрыхтоўка справаздач, верагодна, давядзецца шмат працаваць з паперамі і званкамі, мець зносіны з людзьмі. Пачынаючы з чацвярга, паспрабуйце знізіць рабочую нагрузку да мінімуму.

**РЫБЫ.** Надыходзячы тыдзень спрыяльны для ўвасаблення ідэй у рэальнасць. Аднак у аўторак дзелавая паездка можа стацца абсалютна бескарыснай з-за масы непаразуменняў, лепш перанесці яе на іншы дзень. Імкнучыся да дасканаласці і поспеху ў асабістым жыцці, памятайце, што не ўсё залежыць ад знешнасці. Памятайце пра дабрыню, цярплівасць і такт.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.30 | 18.18 | 9.48 |
| Віцебск — | 8.23 | 18.04 | 9.41 |
| Магілёў — | 8.20 | 18.08 | 9.48 |
| Гомель — | 8.13 | 18.08 | 9.55 |
| Гродна — | 8.44 | 18.34 | 9.50 |
| Брэст — | 8.41 | 18.38 | 9.57 |

## Месяц

*Першая квадра 13 лютага.*
*Месяц у сузор'і Рака.*

## Імяніны

***Пр.*** *СТРЭЧАННЕ ГАСПОДНЯЕ. Мікалая, Івана.*
***К.*** *Агаты, Георгіны, Арнольда, Юзафа.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




**Даты | Падзеі | Людзі**

## 15 ЛЮТАГА

**У краіне**

**1904** год — нарадзілася (г. Мінск) Ларыса Пампеёна Александроўская, беларуская спявачка, рэжысёр, грамадскі дзеяч, народная артыстка Беларусі і СССР. У 1919—1924 гадах была салісткай арганізаванай ёю аматарскай трупы пры палітаддзеле Заходняга фронту, у 1928—1960 гадах — Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі. Сярод партый: Марыся і Алеся («Міхась Падгорны» і «Алеся» Я. Цікоцкага), Кармэн («Кармэн» Ж. Бізэ), Таццяна, Ліза і Графіня («Яўген Анегін» і «Пікавая дама» П. Чайкоўскага). Памерла ў 1980 годзе.

**1915** год — нарадзіўся (в. Малахоўцы, цяпер у Баранавіцкім раёне) Іван Канстанцінавіч Кабушкін, удзельнік Мінскага антыфашысцкага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1965 год, пасмяротна). У пачатку Вялікай Айчыннай вайны малодшы лейтэнант Кабушкін трапіў у акружэнне, змог дабрацца да Мінска, дзе ўключыўся ў антыфашысцкую барацьбу. На чале невялікай баявой групы ажыццяўляў разведвальныя і дыверсійныя аперацыі. З мая 1942-га — кіраўнік аператыўнай групы Мінскага падпольнага гаркама па барацьбе з правакатарамі і варожымі агентамі. Група здабывала зброю, боепрыпасы, медыкаменты, ратавала людзей з лагераў смерці. З лістапада 1942 года ў партызанскай брыгадзе «Дзядзькі Колі» выконваў заданні яе камандавання ў Мінску. У 1943-м схоплены гітлераўцамі, загінуў у фашысцкіх засценках.



**1919** год — нарадзіўся Сяргей Сцяпанавіч Мацапура (в. Гдзень Брагінскага раёна), Герой Савецкага Саюза. У гады Вялікай Айчыннай вайны — на Цэнтральным, Калінінскім, 1-м, 2-м Украінскіх і 1-м Беларускім франтах. Вызначыўся пры вызваленні Польшчы. 18 студзеня 1945 года танк, у складзе экіпажа якога быў механік-кіроўца старшына Мацапура, уварваўся ў г. Сахачоў, знішчыў варожую гармату, 10 мінамётаў і кулямётаў, 16 аўтамашын, 65 гітлераўцаў. 22 студзеня 1945-га каля горада Інаврацлаў пры захопе чыгуначнай станцыі і аэрадрома ворага знішчыў тры самалёты, паравоз, 15 аўтамашын, 49 гітлераўцаў. Да 1947 года служыў у Савецкай Арміі, да 1965-га — у міліцыі. Памёр у 1998 годзе.

**У свеце**

**1564** год — нарадзіўся Галілеа Галілей, італьянскі вучоны эпохі Адраджэння, адзін з заснавальнікаў дакладнага прыродазнаўства. Пабудаваў тэлескоп з 32-разовым павелічэннем і адкрыў горы на Месяцы, чатыры спадарожнікі Юпітэра, фазы ў Венеры, плямы на Сонцы. Памёр у 1642 годзе.

**1906** год — нарадзіўся Муса Джаліль, татарскі паэт, Герой Савецкага Саюза (1956 год, пасмяротна). У гады Вялікай Айчыннай вайны — франтавы карэспандэнт армейскай газеты «Отвага». Аўтар цыкла вершаў «Маабіцкі сшытак», напісанага ў фашысцкіх засценках. Лаўрэат Ленінскай прэміі. Загінуў у 1944 годзе.

**1960** год — ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР прынялі пастанову аб арганізацыі школ з падоўжаным днём.

## УСМІХНЕМСЯ

**Чарада камароў скрала з бальніцы спісы донараў крыві з адрасамі.**

— Таццяна, у якім узросце жанчына перастае цікавіць мужчын?
— Я не ведаю, яшчэ не дажыла да такога ўзросту. Патэлефанавала сваёй бабулі, яна таксама не ў курсе!

**У аднаго з каралёў Саудаўскай Аравіі было 45 сыноў. Страшна ўявіць сабе, у якім стане даходзілі рэчы да малодшага.**

— Васіль Пятровіч, калі перад вамі нечакана з'явіцца леў, якія будуць вашы дзеянні?
— Адвольныя або міжвольныя?



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 595.
Нумар падпісаны ў 19.30 14 лютага 2019 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

15 лютага 2019 г. № 7 (492)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ТЭМА ТЫДНЯ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# СТАЎКА НА ЦЫРУЛЬНІ І РАМОНТ АЎТО

## Якія перспектывы бытавых паслуг існуюць на вёсцы?



**Міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Уладзімір КАЛТОВІЧ:**

— На сёння створаны сістэмныя ўмовы для арганізацыі дзейнасці прадпрыемстваў у сельскай мясцовасці, якія дазваляюць адкрываць новыя аб'екты, развіваць і ўкараняць прагрэсіўныя формы і метады абслугоўвання, выкарыстоўваць сучасныя тэхналогіі. Разам з зацікаўленымі мы працягваем работу па стварэнні спрыяльных умоў.

Для далейшага стымулявання дзелавой актыўнасці, развіцця гандлю, грамадскага харчавання і бытавых паслуг на вёсцы спецыяльная рабочая група пры міністэрстве распрацоўвае прапановы па змяненнях ва Указ № 345.

**ГАРАДЖАНІН па дарозе з работы можа паспець памяняць набойкі на ботах, зрабіць новую стрыжку і фота на дакументы. У жыхара аддаленай вёскі на гэта можа пайсці два тыдні. Як развіваецца сфера бытавых паслуг у сельскай мясцовасці, на што робяць стаўку прадпрыемствы і які эфект далі льготы, што дзейнічаюць з мінулага года, расказалі ў Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю.**

стар. 6


ПАРТНЁР ТЭМЫ ТЫДНЯ:





## СЁННЯ Ў НУМАРЫ


### Інвестыцыі ў адукацыю



У Баранавічах урачыста адкрылі пасля рэканструкцыі будынак каледжа лёгкай прамысловасці. стар. 2

### Сувязнае звяно



Пытанні развіцця асацыяцый мясцовых Саветаў дэпутатаў разгледзелі на Магілёўшчыне. стар. 3

### Аперацыя «Рэанімацыя»



Як сям'я індывідуальных прадпрымальнікаў развівае «бытоўку» на вёсцы. стар. 14

### Раннія буякі з Палесся



Ягаднік памерам 17 гектараў заклалі каля Ельска. Калі паласуемся смачнымі ягадамі? стар. 15

### Грыбная мясціна



На Міншчыне з'явілася першая вытворчасць па вырошчванні шампіньёнаў. стар. 16

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Для пашырэння супрацоўніцтва

## У красавіку Беларусь наведае дэлегацыя французскага Сената

**Яе ўзначаліць кіраўнік групы дружбы «Францыя — Беларусь» Сената Францыі Шарль Генэ.**

Візіт адбудзецца па ініцыятыве беларускага боку і будзе садзейнічаць рэалізацыі дамоўленасцяў, дасягнутых у лістападзе мінулага года падчас сустрэчы старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіла Мясніковіча з прэзідэнтам Сената Францыі Жэрарам Ларшэ.

Як паведаміў «МС» **старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, кіраўнік рабочай групы па супрацоўніцтве з Францыяй у Савеце Рэспублікі Віктар СІРЭНКА**, візіт французскіх парламентарыяў запланаваны на 15—19 красавіка бягучага года.

Нагадаем, у 2018 годзе ўпершыню ў гісторыі беларуска-французскіх адносін былі створаны рабочая група па супрацоўніцтве з Францыяй у Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і група дружбы «Францыя—Беларусь» у Сенаце Францыі. Дзейнасць гэтых груп накіравана на пашырэнне супрацоўніцтва гарадоў-пабрацімаў, устанаўленне прамых кантактаў паміж дзелавымі коламі, развіццё двухбаковых адносін у інвестыцыйнай, сельскагаспадарчай, экалагічнай і іншых сферах.

Як падкрэсліў суразмоўнік, гэты візіт можна назваць знакавым не толькі для міжпарламенцкіх узаемаадносін, але і для краіны ў цэлым.

На нядаўняй сустрэчы Віктара Сірэнкі з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Францыі ў Беларусі Дзідзье Канесам абмяркоўвалася праграма планаванага візіту французскіх парламентарыяў, у якой адлюстраваны шырокі спектр пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва. Акрамя афіцыйных сустрэч у Савеце Рэспублікі і Міністэрстве замежных спраў, запланавана знаёмства з экспартным і інвестыцыйным патэнцыялам шэрагу прамысловых прадпрыемстваў рэспублікі, а таксама прапрацоўваецца магчымасць візіту на Гродзеншчыну: адным з пунктаў значыцца Шчучын, дзе ў гады Першай сусветнай вайны знаходзіўся лагер для ваеннапалонных. Сто гадоў таму ў ім утрымліваўся ў ліку іншых афіцэраў капітан французскай арміі Шарль дэ Голь, які пасля стаў генералам і Прэзідэнтам Францыі.

— Асаблівая ўвага падчас візіту будзе аддадзена ўмацаванню міжпарламенцкага ўзаемадзеяння і ролі парламенцкага вымярэння ў пашырэнні гандлёва-эканамічных сувязяў і інвестыцыйнага партнёрства паміж краінамі, — адзначыў суразмоўнік.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# З АРЫЕНТАЦЫЯЙ НА БУДУЧЫНЮ

## У рамках афіцыйнага візіту парламенцкай дэлегацыі Беларусі ў Польшчу адбыўся шэраг сустрэч з найвышэйшымі дзяржаўнымі асобамі краіны-суседкі

**Магчымасці пашырэння двухбаковага супрацоўніцтва Беларусі і Польшчы абмяркоўваліся ў сераду, 13 лютага, на сустрэчы старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіла Мясніковіча з Прэзідэнтам Польшчы Анджэем Дудай.**

Як паведамляе прэс-служба Савета Рэспублікі, прэзідэнт Польшчы падкрэсліў, што ўзровень беларуска-польскіх кантактаў узмацняецца, а таксама іх эфектыўнасць. У сваю чаргу Міхаіл Мясніковіч прапанаваў фарміраваць парадак дня з перспектывай на будучыню, актывізаваць палітычнае, эканамічнае, гуманітарнае супрацоўніцтва.



Бакі падкрэслілі неабходнасць замацавання сістэмных кантактаў на найвышэйшым і высокім палітычным узроўнях.

Абмеркаваны падыходы па больш актыўным інвестыцыйным супрацоўніцтве. Бакі адзначылі важнасць дагавора аб сацыяльным забеспячэнні, які падпісаны ў рамках візіту парламенцкай дэлегацыі Беларусі ў Польшчу і рэгулюе ў інтарэсах грамадзян дзвюх краін пытанні пенсійнага забеспячэння і стажу, выплат у сувязі з інваліднасцю і часовай непрацаздольнасцю, па беспрацоўі. Дакумент дасць магчымасць забяспечыць належны ўзровень сацыяльнай абароны грамадзян у краінах-партнёрах.

Прэзідэнт Польшчы высока ацаніў намаганні Беларусі па прасоўванні міру і бяспекі ў Еўропе і беларускія ініцыятывы ў цэлым.

**На сустрэчы з прэм'ер-міністрам Польшчы Матэвушам Маравецкім, якая адбылася ў гэты ж дзень, абмяркоўваліся актуальныя пытанні двухбаковага супрацоўніцтва, магчымасці ўмацавання гандлёва-эканамічных і гуманітарных сувязяў.**

У прыватнасці, гаворка ішла аб спалучэнні намаганняў дзвюх краін у развіцці інфраструктурных праектаў, гандлёва-лагістычных хабаў з улікам глабальнай ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях».

Разгледжаны пытанні эфектыўнасці работы міжурадавай камісіі. Асаблівая ўвага аддадзена інвестыцыйнаму партнёрству. Бакі таксама заявілі аб неабходнасці стварэння рабочай групы па супрацоўніцтве ў электраэнергетыцы.

Міхаіл Мясніковіч адзначыў рост таваразвароту паміж краінамі ў 2018 годзе на 5,3 % у параўнанні з папярэднім годам. Ёсць патэнцыял для далейшага павелічэння аб'ёмаў узаемнага гандлю, дадаў ён.

**Перспектывы ўмацавання парламенцкіх сувязяў паміж краінамі абмяркоўваліся на сустрэчы з маршалкам Сената Польшчы Станіславам Карчэўскім.**

Беларусь зацікаўлена развіваць супрацоўніцтва з Польшчай на прынцыпах добрасуседства, узаемнай павагі, раўнапраўя і ўзаемнага ўліку інтарэсаў. Вынікі перагавораў і выпрацаваныя падыходы сфарміруюць свайго роду дарожную карту далейшых крокаў па ўзаемадзеянні. У найбліжэйшы час бакі плануюць абмеркаваць праект пагаднення аб міжпарламенцкім супрацоўніцтве.

Міхаіл Мясніковіч праінфармаваў аб дзейнасці польскай дыяспары ў Беларусі. Ён падкрэсліў, што Беларусь — краіна роўных магчымасцяў для ўсіх, незалежна ад нацыянальнай і рэлігійнай прыналежнасці. Адначасова старшыня Савета Рэспублікі выказаў пажаданне, каб і беларуская меншасць у Польшчы адчувала сябе камфортна.

У сваю чаргу Станіслаў Карчэўскі падкрэсліў, што польскі бок падтрымлівае намаганні парламентарыяў Беларусі, накіраваныя на замацаванне пазітыўных тэндэнцый ва ўзаемным гандлі і пашырэнне інвестыцыйнага супрацоўніцтва з Польшчай.

**Гатоўнасць садзейнічаць выхаду беларуска-польскіх адносін на больш высокі ўзровень агучвалася і на сустрэчы Міхаіла Мясніковіча з маршалкам Сейма Польшчы Маракам Кухцінскім.**

Бакі адзначылі, што за апошнія гады ўдалося істотна прасунуцца наперад у аднаўленні ўзаемнага даверу паміж краінамі, аднак камунікацыі — палітычныя, эканамічныя, гуманітарныя — развіваюцца пакуль слаба.

У польскім Сейме высока ацэньваюць ролю Беларусі як камунікацыйнай платформы для маштабных міжнародных мерапрыемстваў: ПА АБСЕ, Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы, Мюнхенскай канферэнцыі па бяспецы. Адзначана, што Беларусь робіць канструктыўны ўклад у агульнаеўрапейскія працэсы.

Маршалак пазітыўна ацаніў прапановы беларускага боку па канкрэтных эканамічных праектах.

Акрамя таго, у рамках візіту спікер верхняй палаты беларускага парламента сустрэўся таксама з міністрам прадпрымальніцтва і тэхналогій, сустаршынёй польскай часткі беларуска-польскай міжурадавай камісіі па эканамічным супрацоўніцтве Ядвігай Эмілевіч, міністрам замежных спраў Яцакам Чапутовічам, старшынёй Нацыянальнай эканамічнай палаты Анджэем Арэндарскім і старшынёй Польскай акадэміі навук Ежы Душыньскім.



# Інвестыцыі ў адукацыю

## У Баранавічах урачыста адкрылі пасля рэканструкцыі будынак каледжа лёгкай прамысловасці

**Баранавіцкі дзяржаўны каледж лёгкай прамысловасці імя В. Я. Чарнышова налета адзначыць 60 гадоў. Фактычна ўвесь гэты час навучальная ўстанова працавала ў будынку па вуліцы Савецкай. З ростам колькасці навучэнцаў і пашырэннем вучэбнай базы ў каледжа з'явіўся другі вучэбны корпус, які патрабаваў рэканструкцыі і рамонту. І гэты рамонт быў распачаты ў лютым 2013 года.**

На мінулым тыдні поўнасцю абноўлены корпус урачыста адкрылі. Памяшканне як звонку, так і знутры набыло стыльны і прывабны выгляд. Аўдыторыі, класы, майстэрні адпавядаюць самым сучасным патрабаванням навучальнага працэсу. З рэспубліканскага бюджэту на гэты аб'ект затрачана каля 5,4 мільёна рублёў. Павіншаваць навучэнцаў і выкладчыкаў з наваселлем прыехаў **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.**

Яшчэ да цырымоніі адкрыцця **спікер верхняй палаты парламента** разам са **старшынёй Брэсцкага аблвыканкама Анатолем ЛІСАМ, старшынёй аблсавета Юрыем НАРКЕВІЧАМ, старшынёй Беларускага дзяржаўнага канцэрна па вытворчасці і рэалізацыі тавараў лёгкай прамысловасці Мікалаем ЯФІМЧЫКАМ** паразмаўлялі са студэнтамі і іх настаўнікамі, пазнаёміліся з вучэбнай базай.

Зараз каледж рыхтуе спецыялістаў па шэрагу напрамкаў лёгкай прамысловасці. З яго сцен выходзяць тэхнікі-тэхнолагі трыкатажных і тканых вырабаў, мадэльеры і тэхнолагі швейных вырабаў, механікі машын і апаратаў, спецыялісты па эканоміцы і арганізацыі вытворчасці, тэхнікі-праграмісты.

Сваю новую аўдыторыю паказала выкладчык тэхналогіі швейнай справы Алена Яфімчык. Алена Мікалаеўна 20 гадоў працуе ў каледжы. Старшыня Савета Рэспублікі папрасіў выкладчыцу назваць некалькі вучняў, якія дасягнулі поспехаў у швейнай справе. Сярод іншых Алена Мікалаеўна згадала Хрысціну Нічыпарук, начальніка цэха дзяржынскага прадпрыемства па вырабе мужчынскіх кашуль «Эліз». Дарэчы, нядаўна Алена Яфімчык праводзіла там выязныя заняткі са сваімі навучэнцамі. І яе былая вучаніца выступала ўжо ў якасці выкладчыка. Заняткі, паводле ацэнкі педагога, атрымаліся плённыя.

Пазней Алена Мікалаеўна расказала карэспандэнту МС, як сучаснае інфармацыйнае грамадства ўплывае на падрыхтоўку спецыялістаў швейнай справы. Цяперашнія дзеці, а ў каледж прыходзіць частка навучэнцаў пасля 9 класа, менш здольныя ствараць нешта рукамі. Яны прывучаныя працаваць з гаджэтамі, а вось з іголкай... Гэтаму пакаленню неабходна больш часу, каб навучыцца простым маніпуляцыям, чым патрабавалася, скажам, іх папярэднікам. «Але ж на другі, трэці год навучання многія раскрываюцца, дэманструюць здольнасці, а то і талент да нашай справы. І мы, вядома, радуемся, калі гэтыя задаткі супадаюць з жаданнем маладога чалавека стаць сапраўдным спецыялістам», — кажа выкладчыца.

Міхаіл Мясніковіч пажадаў Алене Яфімчык вырасціць свайго Славу Зайцава ў Баранавіцкім каледжы. І гэта не проста арыенцір, але і цалкам рэальная справа, — упэўніліся ўсе прысутныя на наваселлі. Навучэнцы прадэманстравалі гасцям калекцыю адзення, выраблена ўдзельнікамі тэатра моды «Модэс». Некаторыя ўзоры выглядалі даволі авангардна, так што іх аўтары могуць яшчэ заявіць пра сябе ў свеце высокай моды. Але ж галоўная задача гэтай навучальнай установы, якая некалі стваралася канкрэтна пад патрэбы вытворчага баваўнянага аб'яднання, — рыхтаваць кадры сярэдняга звяна для прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці краіны.

Такіх спецыялістаў, дарэчы, за ўсе гады выйшла адсюль 25 тысяч. Зараз у каледжы прафесію атрымліваюць больш за 800 юнакоў і дзяўчат. Іх навучаюць больш за 60 выкладчыкаў. У новым будынку акрамя вучэбных кабінетаў ёсць прасторная актавая зала, чытальня, сталоўка. Спартыўная база складаецца са спартзалы, пляцовак для мініфутбола, валейбола, баскетбола, вулічных трэнажораў. Карацей, у новым корпусе ёсць усё для паспяховай вучобы, адпачынку, самаразвіцця.

Падчас адкрыцця Міхаіл Мясніковіч падкрэсліў, што грошы, укладзеныя ў рэканструкцыю будынка навучальнай установы, дзяржава разглядае як інвестыцыі ў будучыню эканомікі. Тут рыхтуюцца запатрабаваныя народнай гаспадаркай спецыялісты. «Я задаваў шмат пытанняў навучэнцам, цікавіўся меркаваннем іх бацькоў, — сказаў Міхаіл Уладзіміравіч журналістам. — Упэўніўся, што яны задаволеныя вучобай, іх бацькі таксама не шкадуюць, што дзяцей накіравалі менавіта ў гэтую навучальную ўстанову. Тут рыхтуюцца кадры для прадпрыемстваў усёй лёгкай прамысловасці рэспублікі. З гэтых сцен выйшлі многія спецыялісты, якія займаюць кіруючыя пасады і на дзяржаўных, і на прыватных прадпрыемствах. Прадукцыя, якую яны выпускаюць, карыстаецца попытам на ўнутраным і замежным рынках».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ЦЯГНІК ЁСЦЬ, НЕ ХАПАЕ ЛАКАМАТЫВА

## У Кіраўскім раёне абмеркавалі пытанні развіцця асацыяцый мясцовых Саветаў дэпутатаў

**Апошнім часам адбылося шмат сур'ёзных сустрэч па гэтай тэме — яны шырока асвятляліся на старонках нашага выдання. Прайшоў круглы стол па актуальных пытаннях мясцовага самакіравання, у якім бралі ўдзел прадстаўнікі Кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад з Францыі, Італіі, Нідэрландаў, Грэцыі, Румыніі. Быў праведзены семінар з удзелам экспертаў Савета Еўропы, якія падзяліліся інфармацыяй аб існаванні асацыяцый. Па выніках круглага стала і семінара была распрацавана адпаведная дарожная карта, дзе адлюстраваўся агульны кірунак работы. Неаднаразова абмяркоўваўся вопыт гродзенскай асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў, праходзілі сустрэчы са старшынямі аблсаветаў на тэму стварэння асацыяцый на месцах. На гэты раз пытанні фарміравання асацыяцый разглядаліся на прыкладзе Магілёўскай вобласці. Асацыяцыя тут створана яшчэ ў 2015 годзе, а летась яе дзейнасць была істотна ўдасканалена. У нарадзе, якая адбылася на базе Жыліцкага гістарычнага комплексу-музея, прынялі ўдзел міжнародныя эксперты Савета Еўропы. За агульным сталом сабраліся прадстаўнікі Савета Рэспублікі, Міністэрства замежных спраў, абласных Саветаў дэпутатаў.**



### У асацыяцый магутны патэнцыял

Напачатку ўдзельнікаў запрасілі прайсціся па былых уладаннях вядомага магнацкага роду Булгакаў і пазнаёміцца з ходам работ па рэстаўрацыі. Пакуль аднаўлена толькі частка палацавага ансамбля, у ёй знаходзяцца дзіцячая школа мастацтваў і адміністрацыя музея. Зараз галоўны падрадчык — магілёўскае прадпрыемства «Будпраектінвест» — даводзіць да ладу былыя парадныя залы і хатнюю царкву. Палац добра захаваўся, яго выратавала тое, што ў савецкі час тут размяшчаўся Жыліцкі сельскагаспадарчы тэхнікум. Рэканструкцыя пачалася ў канцы нулявых і па нарматыўных тэрмінах павінна была закончыцца яшчэ ў 2014 годзе. Але фінансавыя складанасці не дазволілі гэтым планам ажыццявіцца. На сённяшні дзень зроблена шмат, але трэба зрабіць яшчэ болей. Якое, спытаеце, маюць да гэтага дачыненне дэпутаты? А такое, што тая асацыяцыя, над фарміраваннем якой яны сёння працуюць, якраз і магла б вырашаць такія складаныя пытанні.

— Гэта якраз той выпадак, калі трэба знайсці пэўныя фінансавыя сродкі для таго, каб паскорыць працэс рэстаўрацыі аб'екта, — заўважыў падчас экскурсіі **Аляксандр ПАПКОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, намеснік старшыні па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі.** — Турызм з'яўляецца для Беларусі пэўным пунктам росту эканомікі. Апошнія рашэнні кіраўніка дзяржавы наконт бязвізавага рэжыму наведвання нашай краіны даюць магчымасць атрымаць нейкі эканамічны вынік. І Жыліцкі палацава-паркавы комплекс адзін з тых аб'ектаў, якія могуць прывабіць турыстаў. А гэта і даход для раёна, і новыя рабочыя месцы.

### Саюз для вырашэння праблем

— Асацыяцыя — гэта перш за ўсё саюз для вырашэння праблем. А праблема ў нас адна — пытанні жыццезабеспячэння канкрэтнага чалавека. Асацыяцыі ствараюцца менавіта для таго, каб вырашаць пэўныя задачы і здымаць канкрэтныя праблемы, — падкрэсліў падчас нарады Аляксандр Папкоў. Ён нагадаў пра тое, што кіраўнік дзяржавы ставіць задачу даць болей паўнамоцтваў мясцовым Саветам, каб яны неслі адказнасць за стан спраў на месцах.

— У нас ужо ёсць пэўны вопыт па стварэнні асацыяцый, і мы хацелі б, каб эксперты з краін Заходняй і Усходняй Еўропы далі ацэнку таму, што зроблена, — адзначыў Аляксандр Папкоў. — У найбліжэйшы час мы збіраемся вельмі сур'ёзна абмеркаваць усе гэтыя пытанні са старшынямі раённых Саветаў дэпутатаў. Мы праводзім цэлы шэраг мерапрыемстваў, назапашваем пэўны матэрыял, што дазволіць нам у выніку выйсці з адпаведнымі рашэннямі ва ўрад.

Пакуль у краіне існуе дзве асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў — у Гродзенскай і Магілёўскай абласцях. Але работа па іх стварэнні вядзецца і ў іншых рэгіёнах. На нарадзе адзначалася, што высокую гатоўнасць мае Віцебская вобласць.



Дэпутаты абмеркавалі перспектывы развіцця асацыяцый разам з міжнароднымі экспертамі.

Вопытам развіцця асацыяцыі падзяліўся **старшыня Магілёўскага аблсавета дэпутатаў Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК**. Ён паведаміў, што вызначаны прыярытэтныя напрамкі работы асацыяцыі, праведзены аналіз таго, што больш за ўсё хвалюе жыхароў раёнаў, вывучаны магчымасці прыцягнення фінансаў. Ён звярнуў увагу на тое, што часта народным абраннікам не хапае ведаў, каб вырашыць некаторыя праблемы, з якімі прыходзяць людзі, асабліва калі яны фінансаваёмістыя. «Трэба, каб была арганізавана пастаянная вучоба для дэпутата», — падкрэсліў Дзмітрый Харытончык.

### Не хапае драйвера

**Старшыня праўлення «Фонду імя Льва Сапегі» Міраслаў КОБАСА** адзначыў, што такія сустрэчы, дзе абмяркоўваюцца агульныя падыходы да рашэння праблем, усяляюць надзею на іх вырашэнне. Ён згодны: не ўсе людзі разумеюць, што такое самакіраванне, і іх трэба вучыць. Неабходна таксама, каб інтарэсы мясцовага самакіравання былі на слыху — і на рэгіянальным узроўні, і на цэнтральным. «Сёння пра іх ніхто ў краіне гучна не кажа», — заўважыў ён. Адно з прызначэнняў асацыяцыі — гэта прадстаўленне інтарэсаў грамадскасці, стварэнне перагаворнага механізма з найвышэйшымі органамі ўлады. Ёсць прыклады, калі інтарэсы дзяржавы не супадаюць з інтарэсамі грамадзян, а пытанні трэба вырашаць. Для паспяховай дзейнасці асацыяцый, на погляд эксперта, не хапае драйвера — лакаматыва, які б зрушыў гэты «цягнік». Павінна быць праграма або канцэпцыя развіцця мясцовага самакіравання, якая выразна прадставіць усе асноўныя ідэі: што плануецца пабудаваць і як гэта павінна функцыянаваць.

— Асацыяцыя будзе дэклараваць ідэі рэфармавання, цягнуць за сабой, — канстатаваў эксперт. — Рашэнні некаторых пытанняў могуць зацягнуцца і на гады. Неабходна, каб адбыліся змены ў свядомасці людзей.

> Асацыяцыя — гэта перш за ўсё саюз для вырашэння праблем. А праблема ў нас адна — пытанні жыццезабеспячэння канкрэтнага чалавека.

**Начальнік Дэпартамента па супрацоўніцтве сакратарыята Кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы Дзмітрый МАРЧАНКАЎ** таксама ўхваліў ідэю па павышэнні адукацыі народных абраннікаў, адзначыў, што ў некаторых краінах нават ёсць інстытуты народных дэпутатаў. Ён станоўча ацаніў той шлях, які абрала Магілёўская абласная асацыяцыя дэпутатаў, і адзначыў, што гэта найбольш распаўсюджаны варыянт па стварэнні і развіцці падобных аб'яднанняў.

Міжнародныя эксперты выказалі згоду выкарыстаць пляцоўку Магілёўскай вобласці ў якасці пілотнага праекта для аказання дапамогі мясцоваму самакіраванню ўсіх узроўняў — і органам тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, і дэпутацкаму корпусу.

— У нас ёсць вопыт работы ў Арменіі, Грузіі, Украіне, Албаніі, Марока, Тунісе... Мы займаліся распрацоўкай арганізацыйнага плана развіцця асацыяцый мясцовага самакіравання, планаў камунікацыйных стратэгій асацыяцый. Мы зможам аказаць падтрымку па ўсёй гаме пытанняў: чым могуць быць карысныя асацыяцыі сваім членам і кіраўніцтву краіны, якія прадстаўнічыя, кансультацыйныя функцыі можа выконваць гэта ўтварэнне і гэтак далей, — паведаміў Дзмітрый Марчанкаў.

**Сільвія ІВАНОВА, праграмны каардынатар Дэпартамента па дэмакратычным кіраванні генеральнага дырэктарата Савета Еўропы**, адзначыла як станоўчы факт тое, што дзяржава збіраецца даць болей улады на месцах, і выказала гатоўнасць дапамагчы з навучаннем:

— Мы некалькі гадоў узаемадзейнічаем з Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце Беларусі і гатовы аб'яднаць высілкі для агульнага ўзаемадзеяння. Мы падзелімся вопытам экспертаў і падбяром усе неабходныя матэрыялы.

### Выйсці на новы ўзровень

**Як прагучала на нарадзе, 27—28 лютага на базе Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Беларусі плануецца правядзенне вучобы са старшынямі раённых Саветаў дэпутатаў. На ёй будзе разгледжаны ход рэалізацыі дэкрэта аб садзейнічанні занятасці насельніцтва і пытанні фарміравання асацыяцый мясцовых Саветаў дэпутатаў.**

— Прапануем адпаведным міністэрствам і ведамствам данесці пэўную інфармацыю па ўсіх пытаннях, звязаных з развіццём краіны на аддаленую перспектыву. Каб кожны ўяўляў, што трэба рабіць, — рэзюмаваў Аляксандр Папкоў.

Ён таксама паведаміў, што ў красавіку намечана сумеснае правядзенне пасяджэння экспертнага Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання і Кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад Еўропы.

— Трэба сфакусіравацца на рэальных падыходах рашэння гэтай праблемы, — адзначыў Аляксандр Папкоў, — каб мы ў далейшым выйшлі на фарміраванне новага закона аб мясцовым самакіраванні. Закона, які дапаможа вырашыць шматлікія пытанні.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

ШТО ЛЮДЗІ КАЖУЦЬ?



**Вольга БАБКО, старшыня Агарэвіцкага сельскага Савета Ганцавіцкага раёна:**

— У нас захаваліся памяшканні КБА з савецкіх часоў, і яны функцыянуюць як прыёмныя пункты альбо прадпрыемствы па аказанні паслуг да гэтай пары. Будынкі мы рамантуем і падтрымліваем у парадку, яны служаць людзям. Напрыклад, у Кукаве і Вялікіх Круговічах КБА працуюць як пункты прыёму. Скажам, чалавек прыносіць абутак у рамонт альбо падушкі ў чыстку, яго заказ афармляюць і адпраўляюць у райцэнтр. Потым машына раённага КБА прывозіць рэчы, сельскі жыхар забірае свой заказ на месцы. У Агарэвічах акрамя названых паслуг па прыёме і выдачы працуе майстар па рамонце адзення, пашыве пасцельнай і сталовай бялізны. Тут жа два разы на тыдзень адчынена цырульня. Раз на тыдзень па графіку цырульнік абслугоўвае вяскоўцаў у Кукаве. У гэтай жа вёсцы працуе лазня. Вяскоўцам з іншых населеных пунктаў мы прапаноўвалі паслугі па дастаўцы ў гарадскую лазню, але гэта не знайшло водгуку ў людзей.

Усе бытавыя паслугі нашаму насельніцтву аказваюцца праз сістэму раённага КБА. З асяродку прадпрымальнікаў пакуль не знаходзіцца ахвотных узяць у арэнду памяшканне і абслугоўваць кліентаў у будынках камбіната і прыёмных пунктаў. Не сакрэт, што моладзь цяпер аказвае і атрымлівае паслугі з дапамогай інтэрнэт-стасункаў. Прычоску ці манікюр робяць з выездам на кватэру майстра альбо кліента. І гэта ўжо характэрна нават для нашай палескай глыбінкі.



**Галіна СМОЛЬСКАЯ, жыхарка аграгарадка Дабрамыслі Лёзненскага раёна:**

— У нас даволі буйны населены пункт (больш за 1000 жыхароў. — **Аўт.**). Ёсць садок, школа (і нават музычная), пошта, банк. На жаль, у апошнім аказваюць паслугі не ва ўсе працоўныя дні, а толькі тры разы на тыдзень.

Паслугі «бытоўкі» аказваюць з выездам да нас. У спецыяльным памяшканні прымаюць заказы на рамонт адзення, паслугі хімчысткі і гэтак далей. Запатрабаваныя і паслугі цырульні... Але я асабіста прыязджаю ў Лёзна ў цырульню дзяржаўнага прадпрыемства бытавога абслугоўвання «Дабрабыт». І ўнука прывожу. Там дзяўчаты вельмі ветлівыя і прафесіяналкі добрыя. Разумеюць, што людзі хочуць выглядаць прыгожа. Асабліва жанчыны, незалежна ад ўзросту.

Чаму б і не паехаць, калі да райцэнтра ўсяго 12 кіламетраў. І па тры-чатыры разы штодня на аўтобусе зручна дабірацца. Прыязджаю ў райцэнтр, бывае, са сваякамі, знаёмымі, каб адпачыць у кафэ. На жаль, у нас у вёсцы няма куды пайсці, каб выпіць кавы, з'есці бутэрброд, піроaccess. Было б добра, каб, можа, нехта з прадпрымальнікаў пажадаў стварыць месца для сямейнага адпачынку ў Дабрамыслях. Тым больш што ў нас ёсць памяшканні, якія не выкарыстоўваюцца.

У цэлым няма асаблівых нараканняў наконт дзейнасці «бытоўкі», сацыяльнага абслугоўвання і гэтак далей.



**Марына КЛЮЕВА, старшыня Смалявіцкага раённага Савета дэпутатаў:**

— Раённы камбінат бытавога абслугоўвання насельніцтва аказвае шырокі спектр паслуг. Але нашы майстры, работнікі «бытоўкі» ў пастаянным творчым пошуку, імкнуцца пашыраць пералік паслуг для жыхароў горада і раёна. Тым больш што і геаграфічнае становішча нашага раёна ў нейкай ступені абавязвае да таго, каб мы на сваёй тэрыторыі змаглі аказаць як мага больш паслуг і людзям не даводзілася ехаць у суседнія гарады — Барысаў, Мінск. Таму мы імкнёмся прыцягнуць кліентаў даступнымі і якаснымі паслугамі на месцы, каб чалавек не звяртаўся ў раённы цэнтр або нават у комплексныя прыёмныя пункты, якія размешчаны ў буйных населеных пунктах сельскай мясцовасці. Работнікі «бытоўкі» выязджаюць на дом для аказання паслугі, прымаюць заказ і дастаўляюць яго адрасату.

**Аляксандр ВАСІЛЕВІЧ, стараста вёскі Бершты Шчучынскага раёна:**

— Нашу вёску можна назваць аддаленай. З усіх аб'ектаў — крама ды пошта. У ФАПе прыём вядзецца раз на тыдзень, хаця некалі тут была даволі прыстойная бальніца і нават школа. Пасля таго як не стала калгаса, пачалі знікаць і многія аб'екты, у тым ліку і бытавы камбінат. Найбліжэйшы комплексны пункт знаходзіцца ў Шчучыне, гэта ад Берштаў 44 кіламетры. Напрамую транспарт туды ідзе па пятніцах і нядзелях. Найбліжэйшы аграгарадок — Новы Двор, але і там комплекснага прыёмнага пункта няма. Каб адрамантаваць бытавую тэхніку ці тэлевізар, звяртаюцца да прыватных майстроў. Яны прыязджаюць і аказваюць паслугі на месцы. З пральняй таксама няма праблем. Паўсюдна прабураны свідравіны, і людзі карыстаюцца пральнымі машынамі. Мясцовыя майстрыхі могуць зрабіць нейкі дробны рамонт адзення. Хоць наша вёска невялікая, зараз тут жыве пад 150 чалавек, людзі адно аднаму дапамагаюць: падвязуць куды трэба, пры неабходнасці аддадуць ці забяруць заказ суседа. Да мяне, як да старасты, таксама звяртаюцца, але ў асноўным па іншых праблемах — выпісаць дроў ці знайсці машыну, каб тэрмінова штосьці перавезці. Асаблівай патрэбы ў прыёмным пункце няма, бо такія пытанні ўзнікаюць даволі рэдка і кожны вырашае іх самастойна.

# СТАЎКА НА ЦЫРУЛЬНІ І РАМОНТ АЎТО

## Пральні і душавыя ўсё менш папулярныя

На вёсцы бытавыя паслугі аказваюць 4,6 тысячы суб'ектаў: 69,5 % з іх індывідуальныя прадпрымальнікі, 30,5 % — юрыдычныя асобы. За мінулы год колькасць такіх прадпрыемстваў вырасла на 7 %. У асноўным гэта шматпрофільныя арганізацыі ці фірмы, якія спецыялізуюцца на адным-двух відах паслуг.

— Навінкі ў сферы прадыктаваны пашырэннем тэхналогій, развіццём канкурэнцыі і жаданнем бізнесу быць бліжэй да спажыўца. Так, усё большую папулярнасць у сельскіх населеных пунктах набірае выязная форма абслугоўвання. Па апошніх падліках яе ажыццяўляюць 584 прадпрымальнікі і арганізацыі, — звяртае ўвагу на тэндэнцыі **начальнік упраўлення сацыяльнай сферы і паслуг Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Валяр'ян БЯСПАЛЫ.**

Найбольш папулярныя цырульні, станцыі тэхнічнага абслугоўвання аўтамабіляў, майстэрні па рамонце і пашыве швейных вырабаў, абутку, рамонт і ўстаноўка камп'ютараў, офіснага і іншага абсталявання. А вось пракат бытавых тавараў, пральні, лазні і душавыя ў іх традыцыйным выглядзе з году ў год становяцца ўсё менш запатрабаванымі.

Калі ў сталіцы развіваюцца такія кірункі, як індустрыя прыгажосці (у тым ліку і для мужчын), пракат абсталявання для вечарынак і актыўнага адпачынку, клінінг, то ў сельскай мясцовасці на іх рэдка робяць стаўку: нерэнтабельна. Хоць нязвыклыя паслугі там часам усё ж такі з'яўляюцца: напрыклад, у Нясвіжскім раёне прапануюць вакуумна-ролікавы масаж для карэкцыі фігуры.

## Ільготы далі плюс

Што рабіць, каб бытавыя паслугі на вёсцы не адставалі па якасці і асартыменце ад гарадскіх? У міністэрстве лічаць, што трэба стымуляваць прадпрымальніцкую актыўнасць, у тым ліку праз ільготы і прэферэнцыі, пашыраць свабоду дзейнасці для прадпрымальнікаў і развіваць канкурэнцыю.

— Прынятае нарматыўных прававых актаў, накіраваных на паляпшэнне ўмоў для арганізацыі і вядзення бізнесу, спрыяла планамернаму развіццю згаданай сферы, — адзначае Валяр'ян Бяспалы.

Адзін з дакументаў, якія ён мае на ўвазе, — Дэкрэт № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва». Ён кардынальна змяніў механізмы ўзаемадзеяння дзяржаўных органаў і бізнесу, мінімізаваў умяшанне службовых асоб у работу прадпрыемстваў (апошнія цяпер



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

самі могуць устанаўліваць рэжым работы, вызначаць парадак фарміравання заказаў, маюць права не ўзгадняць выкарыстанне гаража з членамі таварыства). А таксама ўзмацніў прынцыпы самарэгулявання бізнесу і яго адказнасць за сваю работу перад грамадствам.

Каб аказваць асобныя бытавыя паслугі, не трэба афармляць ІП — можна проста плаціць адзіны падатак. Гэта прапісана ва Указе № 337 «Аб рэгуляванні дзейнасці фізічных асоб». Размова ідзе ў прыватнасці пра цырульніцкія і касметычныя паслугі, манікюр і педыкюр, рамонт камп'ютараў, абутку, мэблі, вытворчасць адзення і абутку, тынкавальныя і малярныя работы.

Стымуляваць вясковых прадпрымальнікаў павінен і Указ № 345 «Аб развіцці гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання». Спачатку пад яго дзеянне трапіла 60 працэнтаў сельскіх населеных пунктаў, але пасля іх пералік пашырыўся. Дакументам устаноўлены пэўныя льготы.

— Так, на асобных тэрыторыях прадугледжаны асаблівы рэжым падаткаабкладання — падатак на прыбытак для прадпрыемстваў 6 % і адзіны падатак для ІП у памеры базавай велічыні (25,5 рубля). Вызваляюць таксама ад падатку на дабаўленую вартасць, на нерухомасць, зямельнага падатку і арэнднай платы за ўчасткі, што знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, — удакладняе ў дэталі начальнік упраўлення.

Летась па Указе № 345 у сельскай мясцовасці адкрылася 128 аб'ектаў бытавога абслугоўвання.

У рамках дзяржаўнай праграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» на 2016—2020 гады мясцовыя выканаўчыя органы будуюць і рамантуюць аб'екты бытавога абслугоўвання ў раённых цэнтрах і сельскай мясцовасці, тэхнічна пераасначашчаюць арганізацыі за кошт абнаўлення вытворчых магутнасцяў, набыцця аўтатранспарту і іншага.

## Што ўваходзіць у «сацпакет»?

Бытавых паслуг, якімі вяскоўцы павінны быць забяспечаны на 100 працэнтаў, 11 відаў. Сярод іх — рамонт швейных вырабаў, абутку, мэблі, бытавых машын і прыбораў, рамонт і тэхнічнае абслугоўванне бытавой радыёэлектронікі, пракат, цырульніцкія паслугі, фота, прыём заказаў у пральню, хімчыстку, выраб рытуальных прылад.

Асноўная нагрузка — на камунальныя арганізацыі бытавога абслугоўвання. Ёсць пэўныя нарматывы. Так, на 1,8—2,2 тысячы чалавек павінен прыходзіцца адзін комплексны прыёмны пункт. У аграгарадках распаўсюджана выязное абслугоўванне. У сельскіх пунктах з колькасцю жыхароў больш за 200 яно ажыццяўляецца не радзей як раз на два тыдні, калі ж у вёсцы насельніцтва менш за 200 чалавек — па заяўцы на працягу двух тыдняў.

— З улікам карэкціроўкі сацыяльнага стандарту ў 2018 годзе адзначалася тэндэнцыя росту колькасці прадпрыемстваў, якія аказваюць паслугі без аб'екта: летась іх стала больш у 1,5 раза, — заўважае Валяр'ян Бяспалы. — Такая форма работы — найбольш эканамічна эфектыўная для малаколькасных населеных пунктаў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

## У ТЭМУ

**У канцы мінулага года аблвыканкамам даручылі рэгуляваць цэны на паслугі сельскіх лазняў агульнага карыстання і душавых. Яны ўключаны ў пералік сацыяльна значных тавараў і паслуг. Гэта павінна забяспечыць вяскоўцаў якаснымі і даступнымі паслугамі парыльняў, а таксама дазволіць накіроўваць сродкі мясцовых бюджэтаў на фінансаванне дзейнасці такіх аб'ектаў.**

**Напрыклад, у Мінскай вобласці гранічны максімальны тарыф на лазні ўстаноўлены ў памеры 4,7 рубля за дзве гадзіны, на душавыя — 4 рублі за 45 хвілін.**

Тэлесеткі

# ДЗЕЛЯ ПАМЯЦІ



**Да 30-годдзя вываду савецкіх войскаў з Афганістана тэлеканал АНТ падрыхтаваў адмысловы дакументальны фільм «Суровая памяць Афгана». Ідэя рэалізаваць такі праект узнікла яшчэ летам мінулага года, а здымкі пачаліся ў лістападзе і доўжыліся некалькі месяцаў.**

Як расказвае аўтар фільма Тэнгіз Думбадзэ, у гэтых відэаўспамінах перапляліся лёсы розных удзельнікаў ваенных дзеянняў на афганскай зямлі: «Адзін з такіх людзей — Віктар Шэйман, які на працягу двух гадоў пад Кандагарам камандаваў 38-й асобнай гвардзейскай паветрана-дэсантнай брыгадай... Мы пабывалі ў Афганістане і сустрэліся з відавочцамі падзей, якія адбываліся 30 гадоў таму. Камусьці можа падавацца неверагодным, але жыхары гэтай краіны сёння з настальгіяй згадваюць 80-я і прысутнасць савецкіх войскаў, бо, нягледзячы на ўсе складанасці, на той час будаваліся школы, заводы, дарогі, у людзей была работа...»

Пра тое, як жыве Афганістан праз 30 гадоў і які помняць яго былыя савецкія ваеннаслужачыя і тамтэйшае мірнае насельніцтва, фільм раскажа ўжо сёння ўвечары, а таксама ў наступную суботу — 16 лютага, у 16.20.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**
**Фота пададзена тэлеканалам.**

## ШАШКІ

**(«Звязда»)** Выпуск № 82

З 26 студзеня да 1 лютага ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках адбылася першая ліга чэмпіянату Беларусі па шашках-64 сярод мужчын і жанчын, якая з'яўлялася адборачнай да чэмпіянату краіны. У мужчынскім турніры 36 шашыстаў, сярод якіх два гросмайстры і дзесяць майстроў спорту па швейцарскай сістэме ў 9 тураў разыгралі шэсць пуцёвак у вышэйшую лігу чэмпіянату краіны. Нягледзячы на паражэнне ў другім туры ад чэмпіёнкі Еўропы Веры Хвашчынскай, упэўненую перамогу ў турніры атрымаў міжнародны гросмайстар Яўген Кандрачэнка (Гомель) — 14 ачкоў з 18 магчымых, па 12 ачкоў набралі майстры спорту Аляксандр Маркін (Гродна), Віталь Новікаў (Віцебск), кандыдат у майстры Марат Леў (Слонім), гросмайстар Вера Хвашчынская (Бабруйск) і майстар Алег Чэпа (Мінск) — яны і сталі ўладальнікамі астатніх пяці пуцёвак у вышэйшую лігу. У жаночым турніры 16 удзельніц разыгралі пяць пуцёвак на павышэнне ў класе. У вышэйшую лігу патрапілі майстар спорту Эма Макарэвіч (Гродна) — 10 ачкоў з 14 магчымых, Яўгенія Швед (1-ы разрад) — 10 ачкоў. Кандыдаты ў майстры Вікторыя Нікалаева — 9 ачкоў, Дар'я Нікіфарава — 9 ачкоў і Любоў Кобрына (2-і разрад) — 9 ачкоў (усе Мінск).

Паглядзіце цікавыя прыклады гульні.

№ 10 Р. Лысюк — Т. Кутас



Белыя простыя шашкі: c1, c3, e1, e5, f4, g3, h2 (7)

Чорныя простыя шашкі: a3, b8, c5, c7, e7, f8, h6 (7)

Абодва праціўнікі не заўважылі прыгожага выйгрышу. Паспрабуйце адшукаць шлях да перамогі за белых самастойна.

№ 11 А. Правідзенцаў — М. Чэрнік

Белыя простыя шашкі: a5, d2, e5, h2 (4)

Чорныя простыя шашкі: b6, c7, g5, h6 (4)

1.ed6 ce5 2.ac7 ef4 3. dc3? Белыя ўпусцілі перамогу, трэба было гуляць 3.cd8 fe3 4.df4 ge3 5.da5+ вядзе да вядомага эцюда.

Для самастойнага рашэння ў шашкі-100 прапануюцца камбінацыі, складзеныя вядомымі шашачнымі кампазітарамі.

№ 12 Г. Андрэеў (Латвія)

Белыя простыя шашкі: 23, 25, 28, 31, 34, 37, 40, 41 (8)

Чорныя простыя шашкі: 10, 13, 14, 20, 21, 26, 35, 39, 43 (9)

№ 13 І. Івацка (Украіна)

Белыя простыя шашкі: 21, 23, 26, 27, 28, 33, 34, 48 (8)

Чорныя простыя шашкі: 7, 9, 10, 12, 16, 17, 18, 35 (8)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Анонс: 24 лютага ў 13.00 ў Мінску на вул. Жукоўская, 9 (бібліятэка) адбудзецца спаборніцтва па рускіх шашках сярод ветэранаў. Даведкі па тэл. 8 (029) 9169360, Мелянец Алена Сцяпанаўна.

Праверце свае рашэнні: выпуск № 81 ад 01.02.2019.

№ 6 1...gf4!, і белыя вымушаныя аддаць шашку, бо на 2.gh2 вартая камбінацыя 2...fg5 3.h4d4 fe3 4.df4 de5+

№ 7 1.c3-d4 e5:c3 2.c7:e5 f6:d4 3.b6-c7 d8:b6

[ 3...b8:d6 4.e1-f2 c3:e1 5.a5:c7 d8:b6 6.g3-h4 e1:g3 7.h2:f8 ]

4.a5:c7 b8:d6 5.e1-f2 c3:e1 6.g3-h4 e1:g3 7.h2:e3 b4-c3 8.e3-c1 h8-g7 9.h4-g5+

№ 8 1.16-11 26:48 2.24-19 13:35 3.33-28 22:44 4.11:02 48:30 5.49:40 35:44 6.02:20 25:14 7.50-44+

№ 9 1.34-30 25:34 2.32-27 36:29 3.15:07 34-39 4.07-34 39:30 5.35:24+

Дакладныя адказы даслалі С. Рашэцін (Ашмяны), В. Дударэвіч (вёска Новая Мыш Баранавіцкага раёна), Ф. Карпей (Мядзел), У. Статкевіч (пасёлак Зялены Бор Івацэвіцкага раёна), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі, А. Ліцьвінаў (усе Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён), В. Бандарык (Мінскі раён).

**Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г . Мінск, e-mail: info@zviazda.by, або vorush@yandex.ru**

**Віталь ВАРУШЫЛА,**
**майстар спорту.**





# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## Тры нагоды ўключыць тэлевізар

### ШОЎ

Як шкада, што столькі добрых роляў у кіно сыграна да нас! Магчыма, перажываючы настальгію па савецкім кіно, так падумалі стваральнікі новага забаўляльнага музычна-гумарыстычнага тэлепраекта Першага канала «Галоўная роля». І прапанавалі гледачам і 12 непрафесійным акцёрам — вядомым персонам са свету музыкі, спорту, тэлебачання, якія ўсё жыццё марылі зняцца ў кіно — здзейсніць сумеснае падарожжа па сюжэтах і дэкарацыях любімых кінастужак — успомніць у дэталях, як здымаўся той ці іншы фільм, што прыдумлялі «ад сябе» акцёры на здымачнай пляцоўцы, якія песні там гучалі...



Кожны выпуск праграмы прысвечаны пэўнаму жанру. Вядучыя Ірына Мурамцава і Павел Прылучны прапануюць удзельнікам (у іх ліку, дарэчы, наша зямлячка Наталля Падольская) з дапамогай вопытных рэжысёраў сыграць наноў героя тых ці іншых дэтэктываў, меладрам, камедый, мюзіклаў — пераглядзеўшы рэтра-кадры альбо прачытаўшы сцэнарый «з нуля». У перспектыве мусіць вызначыцца пераможца праекта, чые таленты журы і гледачы ацэняць найвышэй. Пераможцу абяцаюць галоўную ролю ў адным з новых праектаў Першага канала, а пакуль сачыць за перыпетыямі шоу пераўвасабленняў «Галоўная роля» можна штотыдзень па нядзелях на АНТ.

### БІЯТЛОН

З 18 да 24 лютага Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту ў Раўбічах прыме сусветна вядомых спартсменаў — удзельнікаў чэмпіянату Еўропы па біятлоне і традыцыйнай «Гонкі легенд». Паказаць абедзве падзеі ў поўным аб'ёме абяцаюць гледачам тэлеканалы «Беларусь 5» і «Беларусь 5 Інтэрнэт». Як не без гонару адзначаюць у Белтэлерадыёкампаніі, на трасе будуць працаваць амаль 100 тэлевізійнікаў і не толькі тры суперсучасныя перасоўныя тэлестанцыі «Яніна», «Ефрасіння» і «Рагнеда» з інтэлектуальнай сістэмай кіравання і 20 тонамі пershакласнага абсталявання ў кожнай, але таксама каля 30 дадатковых відэакамер.

«Балельшчыкі ведаюць, што біятлон цікавей за ўсё глядзець па тэлевізары, але ў той жа час гэта адзін з самых складаных для паказу відаў



спорту. У свеце ўсяго сем рэжысёраў, якія спецыялізуюцца на паказе біятлона, і мы проста абавязаныя вучыцца ў замежных калег, бо сёлета Беларусь рыхтуецца прыняць чэмпіянат свету па летнім біятлоне, а ў 2021 годзе — этап Кубка свету, які мы таксама абавязкова пакажам», — гаворыць дырэктар «Беларусь 5» Павел Булацкі.

Такім чынам, 18 лютага «Беларусь 5» пакажа ўрачыстае адкрыццё чэмпіянату, а таксама дзве гонкі — мас-старт і змяшаную эстафету з удзелам Дар'і Домрачавай і Надзеі Скардзіна, 20 лютага — індывідуальныя гонкі мужчын і жанчын, 21 лютага — супермікст і змешаную эстафету, 23 лютага — два спрынтарскія забегі, 24 лютага — мужчынскую і жаночую гонкі пераследу. А за паўгадзіны да кожнага старту гледачам прапануюць захапляльнае «Прэв'ю», а таксама свежыя навіны і эксклюзіўныя інтэрв'ю знакамітых спартсменаў.

### РОЗУМ

У праграме «Сусветныя гульні розуму» адны з самых вядомых эрудытаў на постсавецкай прасторы — Анатоль Васерман і Раўшан Аскераў — спаборнічаюць з прафесіяналамі ў розных сферах, адстойваючы перавагу шырока развітага інтэлекту над профільнай спецыялізацыяй. Гэта віктарына з'яўляецца пэўнай рэінкарнацыяй праграмы «Гульні розуму», якая выходзіла ў тэлевізійным эфіры амаль 15 гадоў таму, нават галоўныя героі — тыя ж самыя. Зрэшты, паглядзець і паслухаць разумных людзей ніколі не будзе лішнім.

Кожная гульня, тэму якой задае госць — напрыклад, мастак, рэжысёр, спартсмен — складаецца з трох раўндаў, дзе больш простых да складаных пытанняў, якія могуць мець не адзін адказ. Той з удзельнікаў, які дае больш правільных адказаў і адпаведна зарабляе больш гульнявых грошай, праходзіць у фінал — і ўжо там у адзіночку адказвае на самае складанае мега-пытанне, у той час як спецыяльны аўтамат кожныя 10 секунд «паглынае» частку магчымага выйгрышу. Словам, праверанае часам спалучэнне інтэлекту і азарту. Цікава? Глядзіце «Сусветныя гульні розуму» штопятніцу на тэлеканале «МІР».




## У залёты хадзіць не бярвенне грузіць...

**Свой, адметны чытач у газеты «Звязда». Ён жа, хочацца верыць, глядач тэлеканала «Беларусь 3» і ў прыватнасці праграмы «Размаўляем па-беларуску». Гэтая тэлевіктарына ўжо каторы год у эфіры і магла б выходзіць далей — у звычным фармаце. Аднак стваральнікі вырашылі ўдасканаліць яго (над чым і працуюць)...**

А пакуль усе, хто цікавіцца мовай, шануе яе і, магчыма, плануе ўдзел у віктарыне, могуць праверыць сваё веданне з дапамогай «Звязды». Такім чынам, ці ведалі вы, што:

**вы́штукаваць** — змайстраваць што-небудзь, разумна камбінуючы, эканомна расходуючы матэрыял; выгадаць, выкраіць;

**дзяцю́к** — юнак, хлопец; нежанаты малады чалавек;

**завэ́дзгаць** — запэцкаць, забрудзіць;

**масні́ца** — дошка падлогі; дошка або бервяно ў якім-небудзь драўляным насціле;

**мігаце́ць** — паказвацца на кароткі час і знікаць з поля зроку; свяціць, блішчаць няроўным бляскам;

**падо́ўжны** — які праходзіць у кірунку даўжыні або размешчаны па даўжыні чаго-небудзь;

**рыштава́нне** — часовае збудаванне з дошак або металічных трубак, якое ўстанаўліваецца ўздоўж сцен будынка для правядзення будаўнічых або рамонтных работ;

**як завязаць** — поўна, вельмі многа; колькі можна, уволю (*беларускія сінонімы:* як стаць, па (самую) завязку, у разорву, аж цераз вушы; *рускія адпаведнікі:* до отвала, по горло);

**у залёты хадзіць** — імкнуцца выклікаць прыхільнасць жанчыны (*беларусы яшчэ скажуць:* халяўкі смаліць, улягаць, залёты рабіць; *рускія:* заводить шуры-муры, подбивать клинья).

чацвер, 21 лютага ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.00** «Зона Х» (16+).
**9.10, 22.10 Серыял «След» (16+).**
**10.45, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Вольная грамата» (16+).**
**13.05** «Дзіцячы доктар».
**13.35** «Дзень у вялікім горадзе».
**14.35, 15.25 Серыял «Ідэальны вораг» (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** «Беларуская часінка».
**21.00** «Панарама».
**21.50** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**23.40** «Сфера інтарэсаў».
**0.40** «Дзень спорту».

## Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 17.30** «Тэлебарометр».
**9.10, 20.10 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.10, 22.05** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**11.05, 17.35 Серыял «Следства кахання» (16+).**
**12.45, 23.00 Серыял «Самара-2» (16+).**
**13.40** «Арол і рэшка. Кругасветка» (16+).
**14.40** «ЖаннаПажані» (16+).
**15.40** «Нічога сабе навіны» (12+).
**15.45, 23.50** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект (12+).
**16.30** «Муж напракат» (16+).
**19.10** «Веру не веру» (16+).
**21.00** «Трэці лішні» (16+).
**22.00** «Спортлато 6 з 49», КЕНО.

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 15.05** «Беларуская кухня». Рулецікі з печанню.
**8.05, 12.00, 20.15** Навіны культуры.
**8.20, 12.20, 20.30** «Гэты дзень».
**8.25, 18.30 «Майстар і Маргарыта». Маст. фільм. 7-я серыя (16+).**
**9.15, 17.05 «Яшчэ не вечар». Маст. фільм (12+).**
**10.45** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**11.10** «Майстры і куміры». Народны артыст Беларусі Міхаіл Фінберг.
**12.25, 19.20** «Спецназ Другой сусветнай». «Дэсантнік дзядзька Вася» (12+).
**13.00, 21.45 «Жукаў». Маст. фільм (16+).**
**14.00** «Партызаны». Фёдар Крыловіч (12+).
**14.25, 21.05** «Апошні дзень». Юрый Левітан (12+).
**15.30** «Купала і Колас. Вы нас гадавалі». Канцэртная праграма Нацыянальнага акадэмічнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі Міхаіла Фінберга.
**20.00** «Архітэктура Беларусі».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.40** «Як мы жылі на вайне». «Ёсць пошта палявая...»
**23.05** «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака». Аляксандр Ксяндзоў.

## Беларусь 5

**7.00** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы. Рабубічы. Індывідуальная гонка.
**8.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Першы матч. «Шальке-04» (Германія) — «Манчэстэр Сіці» (Англія).
**10.35** Хакей. КХЛ. «Віцязь» (Маскоўская вобл.) — «Дынама» (Мінск).
**12.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Дзённік гульнявога дня.
**13.00** Тэніс. WTA. Дубай. 1/4 фіналу.
**15.00** Авертайм.
**15.30** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы. Рабубічы. Прэв'ю.
**15.55** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы. Рабубічы. Супермікст.
**16.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Першы матч. «Атлетыка» (Іспанія) — «Ювентус» (Італія).
**18.45** Спорт-цэнтр.
**18.55** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы. Рабубічы. Змяшаная эстафета.
**20.25** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Прэв'ю.
**20.50** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/16 фіналу. Матч у адказ. «Арсенал» (Англія) — БАТЭ (Беларусь).
**22.50** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/16 фіналу. Матч у адказ. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

## АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.10, 7.15, 8.15** «Наша раніца».
**7.10, 8.10** «Трывожная кнопка» (16+).
**9.10** «Жыць здарова!» (16+)
**10.20, 11.10 Серыял «Дэтэктывы» (16+).**
**11.50** «Модны прыгавор» (12+).
**13.10 Серыял «Водар шыпшыны» (12+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20, 0.30** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.25, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** «Час».
**21.10** «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
**21.40 Серыял «Варажбітка» (16+).**
**22.40 Серыял «Забойная сіла» (16+).**
**1.20** «Нашы навіны». Галоўнае за дзень.

## СТБ

**5.35** «Усім на катку» (16+).
**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**6.10, 20.15** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**9.10** «Анфас».
**9.30, 23.00** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40, 20.50 «Меч». Серыял (16+).**
**12.25** «Вадзіць па-руску» (16+).
**12.35, 23.45** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**13.45** «Жывая тэма» (16+).
**14.40** «Вадзіць па-руску» (16+).
**15.00, 0.25** «Дзіўная справа» (16+).
**15.55, 16.50 «Снайпер-2. Тунгус». Серыял (16+).**
**19.55, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30** «Спецыяльны рэпартаж СТБ».
**1.15 «Смак забойства». Серыял (16+).**

## МІР

**6.00** «Трымайся, шоубіз!» (16+)
**6.30 Серыял «АСА» (16+).**
**9.40, 10.10, 21.20, 0.20 Серыял «Напарніцы» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 3.10** «Зала суда. Бітва за грошы» (16+).
**14.10, 1.40** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 2.25** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 1.05** «Гульня ў кіно» (12+).
**17.00 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.20, 3.55 Серыял «Таптуны» (16+).**
**0.10** «У гасцях у лічбы» (12+).
**5.30** «Такія розныя» (16+).

## РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.25** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.35, 14.30, 20.40 Серыял «Скліфасоўскі» (12+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**15.35** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.00** Весткі. Мясцовы час.
**17.25** «Лёс чалавека» (12+).
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**22.30, 23.10** «Хто супраць?» Ток-шоу.
**0.40** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** Беларусы (6+).
**6.40** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**7.10** «НашСпажыўНагляд» (16+).
**8.05 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**9.40, 22.35** «НЗ.by».
**10.20 Серыял «Масква. Тры вакзалы» (16+).**
**11.55** Пракурорская праверка (16+).
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00 Серыял «Шэрыф» (16+).**
**14.55, 16.30 Серыял «Марскія д'яблы» (16+).**
**17.10** «ДНК» (16+).
**18.10, 19.55 Серыял «Неўскі. Праверка на трываласць» (16+).**
**19.40** Сёння. Галоўнае.
**20.55 Маст. фільм «Адстаўнік-2» (16+).**
**23.00 Серыял «Чужы твар» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 15.55, 19.00, 21.00, 0.55** «На-двор'е».
**7.05** М/с.
**7.25, 16.00** «Гумарынка».
**7.30 Дэтэктыў «Чыстае мастацтва» (16+).**
**9.05** Дак. серыял «Падарожнік» (12+).
**9.35, 19.05 Серыял «Кандзіс Рэнуар» (16+).**
**10.30** «Малюючы Кітай» (0+).
**11.00 Драма «Дзяржаўная граніца. Афганская пастка» (16+).**
**12.45, 20.00 Серыял «Апраўданы» (16+).**
**13.30 Прыгоды «Астраўлянін» (16+).**
**16.05** «Мультпарад» (0+).
**16.30** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**17.00 Серыял «Пуаро Агаты Крысці» (12+).**
**18.50** «Фэшн is my прафэшн».
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05 Драма «Дзяржаўная граніца. Смяротны ўлоў» (16+).**
**23.20 Драма «У палоне ў мора» (16+).**

## ВТБ

**6.05** «Рогаў. Студыя 24» (16+).
**6.55, 2.15** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**7.30** М/ф «Пацяшоба» (0+).
**7.50** М/ф «Тры каты» (0+).
**8.15** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**8.50** Скетч-шоу «Асцярожна: дзеці!» (6+)
**9.25, 17.40** «Уральскія пельмені» (16+).
**10.25, 18.40** Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
**11.50, 3.10** «Рублёва — Бірулёва» (16+).
**12.50** Серыял «Варонiны» (12+).
**14.45, 2.40** Скетч-шоу «Адна за ўсіх» (16+).
**15.45** Трылер «Фінансавы монстр» (12+).
**20.00** Серыял «Дзяўчынкі не здаюцца» (16+).
**21.00** Серыял «Пекар і прыгажуня» (16+).
**22.00** Драма «Блізкасць» (16+).
**0.00** Серыял «Дзённік доктара Зайцавай» (16+).
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка» (16+).
**4.00** «Лаві момант» (16+).
**5.00** «Дурні і дарогі» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.15** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Масква гімназічная.
**7.05, 20.05** «Правілы жыцця».
**7.35** Сусветныя скарбы.
**7.55** «Сіта і Рама». Серыял.
**8.50, 16.30** «Атрад спецыяльнага прызначэння». Серыял.
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 1.00** XX стагоддзе. «Маршал Жукаў: старонкі біяграфіі». Расказвае Міхаіл Ульянаў. Дак. фільм.
**12.30** Дзённік XII Зімовага міжнароднага фестывалю мастацтваў Юрыя Башмета.
**12.55, 18.45, 0.15** «Гульня ў бісер». «Эдгар Алан По. Дэтэктыўныя апавяданні».
**13.35** Дарогі старых майстроў. «Дрэва жыцця».
**13.45** «Абсалютны слых».
**14.30** «Са сталі». Зінаіда Шарко.
**15.10** Мая любоў — Расія! «Качка, залатая баба і мядзведзь комі-зыран».
**15.40** «2 Верник 2».
**17.50** Адкрыты майстар-клас Рамана Паткала.
**18.35** Колер часу. Густаў Клімт. «Залатая Адэль».
**18.45** «Гульня ў бісер». «Эдгар Алан По. Дэтэктыўныя апавяданні».
**19.45** Галоўная роля.
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.45** «Памяць». Дак. серыял.
**21.15** «Энігма». Захар Брон.
**21.55** «Эрык Булатаў. Мая Траццякоўка». Дак. фільм.
**23.35** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**2.15** «Мастак Андрэй Мыльнікаў. «Не перастаю здзіўляцца...» Дак. фільм.

## Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Палітkоўскім: «Вывад войскаў з Афганістана». 2006 год (16+).
**7.00** Дак. фільм «Двары нашага дзяцінства» (12+).
**8.50** М/ф «Казка для Наташы» (6+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**9.45, 11.00, 14.25, 15.45, 17.00, 21.45, 23.00, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаны ў СССР» (12+).
**12.00** «Спяем, сябры!» з Наталляй Казялковай: «Аляксандр Галіч». 2004 год (12+).
**13.05** Маст. фільм «Печнікі» (16+).
**14.25** Музычная праграма «СММ». 1990 год (12+).
**18.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. «Гісторыя рускага рока». Гурт «Странные игры». 1-я частка (16+).
**19.00** Тэлеспектакль «Шалёныя грошы». 1968 год (12+).
**0.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Армейская байкі». 2005 год (18+).
**1.10** «Ранішняя пошта». «Блытаніна». 1985 год (12+).
**1.40** «Гэты фантастычны свет». «З робатамі не жартуюць». 1987 год (12+).

## EuroSport 1

**0.00, 13.45, 16.00, 21.00** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету.
**1.00, 6.00, 9.30, 12.35** Горныя лыжы. Кубак свету.
**2.00, 10.30, 20.15** Веласпорт. «Тур Андалусіі».
**2.45, 18.15** Веласпорт. «Тур Алгарве».
**3.30, 7.00** Снукер. Welsh Open. Фінал.
**5.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**8.30, 13.15** Біятлон. Кубак свету.
**11.30** Аўтагонкі. Формула Е.
**21.45** Снукер. Shoot Out.

## Кінакамедыя

**1.05** Прачнуўшыся ў Рына (16+).
**2.50** Пра Адама (18+).
**4.40** Лёгкі на ўспамін (12+).
**6.15** Сяброўства і ніякага сексу? (16+)
**8.10** Ажаніцеся з першай сустрэчнай (16+).
**9.55** Джулі і Джулія: гатуем шчасце па рэцэпце (16+).
**12.15** Усё пра мужчын (16+).
**13.50** Каханне прэт-а-партэ (12+).
**15.30** Усё пуцём! (16+)
**17.25** Вясельны перапалох (16+).
**19.30** Эйр Амерыка (16+).
**21.35** Агент 117: місія ў Рыа (16+).
**23.35** Спадарыня пакаёўка (12+).

## ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.20** «Школа доктара Камароўскага» (6+).
**8.05** «Доктар І...» (16+)
**8.25, 19.00, 2.10** «Асколкі». Серыял (16+).
**9.40, 23.05** «Улегцы» (12+).
**10.15, 3.20** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.00, 17.40** «Варажбітка» (12+).
**13.10, 16.35, 4.50** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.10** «Адкрыта» з Аксанай Байрак» (16+).
**15.05** «Простыя складанасці» (12+).
**15.40** «Натуральны адбор» (12+).
**20.25** «Гэтым пыльным летам». Серыял (16+).
**21.25** «Савецкія мафіі» (16+).
**22.15** «Знак якасці» (16+).
**23.40** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**0.25** «Дзённікі нянькі». Меладрама (12+).
**5.35** «Лінія абароны» (16+).

## ТБ1000

**6.10, 17.35** Немагчымае (16+).
**8.30** Дзявяткі (16+).
**10.35** Чаго хочуць жанчыны (16+).
**13.15** Перамотка (16+).
**15.25** Герцагіня (16+).
**20.10** Гатака (12+).
**22.10** Стальныя магноліі (0+).
**0.30** Скурчаны дамок (18+).
**2.35** 13-ы раён (16+).
**4.00** Эрын Бракавіч — прыгожая і рашучая (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Край (16+).
**8.45** Змешаныя пачуцці (16+).
**10.30** Мне не баліць (16+).
**12.35** Няўлоўныя: джэкпот (16+).
**14.25** У стылі jazz (16+).
**16.20, 4.30** Як выйсці замуж за мільянера-2 (12+).
**18.25** Кахае не кахае (16+).
**20.20** Хатабыч (16+).
**22.15** Прыходзь на мяне паглядзець (6+).
**0.20** У далёкім сорак пятым... Сустрэчы на Эльбе (18+).
**2.20** Дачны раманс (16+).

## National Geographic

**0.30** Асушыць акіян (16+).
**1.20, 4.25, 9.45** Дзікі тунец (16+).
**2.05, 15.55** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**2.50, 16.40, 21.25** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**3.40** Паранармальнае (16+).
**5.10** Суперзбудаванні (16+).
**6.00** Самыя дзіўныя фатаграфіі National Geographic (16+).
**6.30** Адраджэнне марскога шаўковага шляху (16+).
**8.05, 14.20** Аўта-SOS (16+).
**10.30** Гульні розуму (16+).
**11.20** Найгоршае надвор'е ў гісторыі? (16+)
**12.05** Шаша праз пекла (16+).
**12.50** Гаспадары гор (16+).
**13.40, 20.35** Шлях абуджэння (16+).
**19.45** Секунды да катастрофы (16+).
**23.00** Ліхтугі за мяжой (16+).
**23.45** Гарачыя граніцы (16+).

## Discovery

**8.00, 17.00, 22.00** Махінатары.
**9.00, 16.00, 23.00, 4.40** Круты цюнінг.
**10.00, 15.00, 21.00** Як гэта ўстроена?
**11.00, 20.00, 5.30** Бітва за нерухомасць.
**12.00** Не спрабуйце паўтарыць.
**13.00** Разбуральнікі легенд.
**14.00, 3.50** Скрозь кратовую нару.
**18.00** Вулічная навука.
**19.00** Рэальныя дальнабойшчыкі.
**0.00** Залатая ліхаманка.
**1.00, 6.20** Ваенны архіў: пад грыфам «Топ-10».
**2.00, 7.10** Чаму?
**2.55** Круты Чэд.

# Рэнтабельная «бытоўка»

## У Чэрыкаве не спяшаюцца адмаўляцца ад гэтага папулярнага на вёсцы спосабу паслуг

**НЕХТА называе іх апошнімі з магікан. У райцэнтрах паступова закрываюцца дамы бытавых паслуг, маўляў, няма попыту. А вось Чэрыкаў упарта даказвае адваротнае. «Бытоўка» тут працуе, і нават з прыбыткам. Акрамя Дома быту ў райцэнтры існуе яшчэ восем комплексна-прыёмных пунктаў на перыферыі.**

### Чэрыкаўскі феномен

Бізнесу «бытоўка» не вельмі цікавая. Ну што можна зарабіць на рамонце адзення або мыцці бялізны? Між тым бытавыя паслугі ў сельскага жыхара запатрабаваныя. І нехта павінен пра яго клапаціцца.

Летась комплексныя пункты чэрыкаўскага камбіната рэалізавалі сельскаму насельніцтву паслуг, тавараў і прадукцыі на 320,4 тысячы рублёў — на 4,7 % болей, чым пазалетась. А ў цэлым па раёне — на 741 тысячу рублёў. Сярод аналагічных прадпрыемстваў па Магілёўскай вобласці лічба вышэйшая толькі ў Асіповіч. Але ж па колькасці насельніцтва Асіповіцкі раён большы за Чэрыкаўскі амаль у 3,5 раза. З іншымі раёнамі, дзе яшчэ «жывая» «бытоўка», нават некарэктна параўноўваць — разрыў вельмі адчувальны. У чым жа сакрэт папулярнасці?

— Трэба не ленавацца працаваць, — кажа **дырэктар чэрыкаўскага прадпрыемства «Бытпаслугі» Святлана КУЛІКАВА.** — Язёры, Сакалоўка, Лабанаўка, Верамейкі, Рэчыца, Майскі, Лобча — гэта тыя аграгарадкі і вёскі, дзе сёння функцыянуюць нашы комплексныя прыёмныя пункты (КПП). Плюс у Гронаве чалавек збірае заказы і перадае чэрыкаўскаму камбінату паслуг. Даход невялікі, але для прадпрыемства і гэта важна. Там пастрыжом, тут памыем, падушкі пачысцім, боты адрамантуем, пасцельную бялізну пашыем — па капейцы збіраецца круглая сума.

Спектр паслуг — ад рамонту абутку і адзення да вырабу аконных рам, дзвярэй і агароджы. Калі трэба, і агарод узаруць, і халадзільнік напракат дадуць.

— Усе віды паслуг сацыяльнага стандарту мы аказваем, матаемся туды-сюды: нам заказалі — мы прывезлі. Рэчыца за год сабрала 91 тысячу рублёў, Верамейкі — 67 тысяч, Язёры — 62 тысячы — тры КПП, а даход, калі скласці лічбы, такі ж, як у некаторых раёнах. Працуем і не скардзімся, што ўсё гэта трэба яшчэ і ўтрымліваць — ацяпляць, снег прыбіраць, трубы чысціць. І на паліва грошы знайсці. Ад Чэрыкава да таго ж аграгарадка Майскі 30 кіламетраў. Але ж нічога, спраўляемся.

### Каманда аднадумцаў

— На такіх кіраўніках усё трымаецца, — ацэньвае работу Святланы Кулікавай **намеснік старшыні Чэрыкаўскага райвыканкама Алена СЛЯПЦОВА.**

Сапраўды, болей адданага сваёй прафесіі чалавека цяжка ўявіць. У «бытоўцы» яна 53 (!) гады. І вакол сябе сабрала менавіта такіх апантаных людзей, як сама. Яны працуюць нягледзячы на не самыя высокія заробкі і напружаны графік работы.

Стаж работы ў «бытоўцы» **майстра Ніны ПАТАПЕНКІ** крыху меншы — 42 гады. Першыя 26 гадоў працавала фатографам. Яна і зараз, калі трэба, бярэ ў рукі фотаапарат, але цяпер асноўныя яе абавязкі — гэта апрацоўка заявак ад насельніцтва. «Без нашай Ніны Якаўлеўны мы столькі б не зарабілі. Яна ж у нас круціцца як вавёрка ў коле. Бывае, заказ зроблены, а разлічыцца з намі не спяшаюцца. Яна ж умее дамовіцца. Талент», — не шкадуе добрых слоў у адрас калегі дырэктар.

Ніна Якаўлеўна сціпла называе свае дасягненні любоўю да работы.

— Складаю графік выезду на комплексныя прыёмныя пункты з такім улікам, каб адначасова можна было зрабіць яшчэ некалькі спраў. Двойчы ў месяц дастаўляем цырульніка ў суседнюю вёску, па дарозе забіраем у кліента пральную машынку або абутак у рамонт. Без такой своеасаблівай лагістыкі ў нашай справе сёння не абысціся.

З настальгіяй прыгадвае былыя часы.

— Гэта цяпер фотаапарат у кожным мабільніку ёсць. А раней у выхадныя нават стаялі чэргі сфатаграфавацца. Аб'ёмы ўпалі вельмі сур'ёзна. Паменшалі аб'ёмы хімчысткі па кааперацыі: меней здаюць дываноў, верхняга адзення. Зараз акцэнт робіцца на пашыў пакрывалаў, падушак, абрусаў — гэта вельмі папулярна. Таксама запатрабаваны рамонт складанай бытавой тэхнікі. У нас ёсць дагавор на абслугоўванне з вытворцам халадзільнікаў «Атлант», яны нам запчасткі пастаўляюць. Нават з Крычыва халадзільнік рамантавалі. Людзі тэхніку купілі, а яна праз два


Фота носіць ілюстрацыйны характар.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

месяцы зламалася. І мы выручылі. Канкурэнцыя толькі на «рытуалку» і, калі браць горад, цырульныя паслугі. Усё астатняе на нас. Без «бытоўкі» вёска шмат чаго страціць. Прыватніку там нецікава. А нас водзяць і чакаюць.

### Мы па ўсёй краіне качуем

Можна называць «бытоўку» атавізмам, казаць, што яна аджыла сваё, але работнікі чэрыкаўскага прадпрыемства «Бытпаслугі» чакаюць нават далёка за межамі іх роднага раёна.

— Ездзім на рынкі ў Магілёў, Чавусы, Мсціслаў. Па дарозе заязджаем у розныя вёсачкі, завозім прадукты, камбікармы, пшаніцу, — расказвае **прыёмшчыца КПП ад чэрыкаўскіх «Бытпаслуг» у Верамейках Наталля БАРАНАВА.** — Нядаўна заказалі ў Мсціслаўскі раён наматрацнікі, пасцельныя камплекты. Там наша бялізна ідзе вельмі добра, і расіяне прыязджаюць — ім якасць падабаецца. Палутарка каштуе 41 рубель, напрыклад. Нічога не залежваецца. Наш швейны цэх выраблае пасцельную бялізну, халаты, сарочкі, майкі, ручнікі, падушкі і шмат чаго іншага. А яшчэ рамантуем абутак і адзенне — па 10—15 заказаў у месяц прымаем. Працоўны дзень у нас з 9.00 да 17.00 гадзін, але што датычыцца рытуалкі, нават ноччу выязджаем.

Комплексны прыёмны пункт у Верамейках неаднаразова станавіўся найлепшым у раёне і нават у маштабах рэспублікі. Наталля працуе разам з цырульнікам Галінай Разікавай, якая абслугоўвае тутэйшае насельніцтва ўжо 35 гадоў. Двойчы на месяц выязджае ў суседнюю Лабанаўку. Жаночая стрыжка зараз каштуе 8-9 рублёў, мужчынская — максімум 6,60.

— Робім і больш дарагія заказы, завіўкі напрыклад, але такога попыту, як раней, на іх няма, — кажа яна. — Дадому выязджаем — да інвалідаў, ветэранаў. Кліентаў стала менш, але план выконваю. Летась зарабіла 9 тысяч рублёў. Пазалетась было меней — 8,1 тысячы.

З хадавых паслуг у Верамейках — мыццё бялізны. На вёсцы ў асноўным пажылыя людзі, у якіх і рукі баляць, і пральныя машынкі не заўсёды ёсць. Расцэнкі прывабныя — 1,74 рубля за кілаграм. Яшчэ і забяруць, і прывязуць назад. А заадно камбікармы возяць па дамах — пажылыя часта заказваюць. Рамонт тэхнікі па цяперашніх часах каштуе нямала. Напрыклад, рухавік замяніць у халадзільніку каштуе 160 рублёў, фрыён (ахаладжвальная вадкасць) — 60—70 рублёў. Але людзі звяртаюцца. Усё ж танней, чым новую тэхніку купляць.

— План перавыконваем, — запэўнівае Наталля. — За снежань 6300 рублёў зарабілі, за студзень 6400. А план дзесьці 6000 рублёў. Летам попыт на нашы паслугі вышэйшы, зімой крыху памяншаецца. Але такога, каб без працы сядзелі, няма.

Асноўная праблема, лічыць Наталля, малая зарплата ў насельніцтва. Таму і кліентаў недастаткова. Затое канкурэнтаў няма. Прыватнік на дробязі не разменьваецца. А значыць, без работы, спадзяюцца «бытавікі», яны не застануцца.

— Калі працуем у суседніх раёнах, людзі скардзяцца, што ў іх «бытоўку» закрылі, — заўважае Наталля. — Кажуць, вы малайцы, што яшчэ трымаецеся. Мы, дарэчы, пералік паслуг пашыраем. Для нас вельмі важна дайсці да кожнага.

Дарэчы, «Газелі» чэрыкаўскай «бытоўкі» даязджаюць нават да Гомельскай вобласці. Па сутнасці, заказы тут гатовы прымаць з любога месца краіны. Так што звяртайцеся. Але майце на ўвазе: за дастаўку прыйдзецца даплаціць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# АДДАЦЬ ЧАМАДАН... У ЧЫСТКУ

## Салігорскія бытавікі і не такія заказы выконваюць

**ГОНАР салігорскіх бытавікоў ды і наогул усіх гараджан — цэнтр прыгажосці і здароўя «Новы вобраз». У цырульні працуюць дзіцячая, мужчынская, жаночая залы, ёсць салярый, трэнажорная зала, абсталяваная ўсім неабходным інвентаром для таго, каб удасканальваць і загартоўваць цела. Майстры асвоілі модны і папулярны сярод прыгажай паловы чалавецтва перманентны макіяж. У Доме быту адкрыты таксама магазін рытуальных паслуг.**

Работнікі камбіната, можна сказаць, суправаджаюць чалавека ад яго нараджэння, вяселля і да апошняга дня жыцця.

Тут ёсць жалобная зала, якая працуе без выхадных. Людзі арандуюць памяшканне пагадзінна, на суткі.

Усе атрыбуты для таго, каб дастойна праводзіць чалавека ў апошні шлях, можна набыць у магазіне рытуальных паслуг. А яшчэ салігорскія бытавікі прапануюць хімічную чыстку, рамонт, пашыў адзення і бялізны.

Як расказала майстар участка хімічнай чысткі адзення Наталля Бачышча, тут маюць усё неабходнае абсталяванне для апрацоўкі розных відаў вырабаў, для аквачысткі, сухой хімічнай чысткі. Любую просьбу спажыўца задаволяць. Здараецца, што прыносяць нават такія рэчы, як чамаданы. У дзень з пральні адпраўляюць па дзве-тры тоны чыстай бялізны, прычым абслугоўваюць не толькі прадпрыемствы і арганізацыі Салігорскага раёна, але і Мінскай вобласці і нават краіны.

— Прадпрыемства пастаянна ўкладвае сродкі ў асноўны капітал, — уступае ў размову **дырэктар КУП «Салігорскі дом быту» Марыя ЖЫЛІЧ.** — У 2017 годзе купілі сушыльную машыну на 50 кілаграмаў загрузкі, у 2018-м — новы аўтамабіль ГАЗ. За апошнія тры гады выручка ад рэалізацыі прадукцыі, работ і паслуг вырасла на 25 %, бытавыя паслугі — на 42 %.

Вяскоўцы таксама не застаюцца па-за ўвагай бытавікоў. Сельскіх жыхароў абслугоўваюць 17 комплексных прыёмных пунктаў. Яны былі створаны з нуля, з вялікімі затратамі, за кошт уласных сродкаў прадпрыемства на будаўніцтва і рамонт. У структуры выручкі сельскіх КПП — 34 % — гэта паслугі па шыцці і рамонце адзення і бялізны, 25 % — рытуальныя паслугі, 15 % — паслугі цырульні. Штомесяц падраздзяленні прадпрыемства выконваюць 250—300 заказаў, што паступаюць з сельскіх прыёмных пунктаў, у тым ліку — 95 % уласнымі сіламі. На тыя паслугі, якія не могуць выканаць самі, заключаны шэсць дагавораў кааперацыі са спецыялізаванымі арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі. Штотыдзень кожны прыёмны пункт аб'язджае аўтатранспарт прадпрыемства па складзеных маршрутах, дастаўляе прынятыя заказы, спецыялістаў з горада для аказання заяўленых паслуг на месцы, развозіць тавар для продажу. У КУП ёсць дыспетчарскі пункт, куды трапляюць заяўкі ад вяскоўцаў. Попытам у сельскіх жыхароў карыстаюцца коўдры, камплекты пасцельнай бялізны, трыкатаж, спецадзенне і хатнія халаты.

Толькі на сяле тэмп росту бытавых паслуг летась склаў 123 %. Даведка бытавых паслуг 167 інфармуе спажыўцоў аб магчымасці атрымання паслуг на тэрыторыі раёна, прымае заяўкі на выязное абслугоўванне і дастаўку заказаў. Па заяўцы вяскоўцаў майстры абслугоўваюць і дома. Напрыклад, памыюць дываны, адрамантуюць тэлеапаратуру, пастрыгуць пажылых людзей.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# З Віцебска ў райцэнтр па прыгажосць!

**У Шумілінскім раёне бытавыя паслугі аказваюць 11 арганізацый (юрыдычных асоб) і 18 індывідуальных прадпрымальнікаў. Па іх паслугі тутэйшыя могуць прыйсці ў 45 пунктаў. Аддаленыя вёскі прадстаўнікі дзяржаўнай «бытоўкі» абслугоўваюць з выездам на месца па графіку. Для гэтага з мясцовага бюджэту былі выдзелены грошы на набыццё новага аўто «Газель». Летась зарэгістравалі новыя суб'екты гаспадарання: саўну ў фізкультурна-аздараўленчым цэнтры і прадпрымальніка па фотапаслугах.**

Паводле слоў **выконваючага абавязкі старшыні райвыканкама Святланы ЦІМАШЭНКІ**, ва ўсіх без выключэння населеных пунктах аказваецца не менш за 11 асноўных відаў бытавых паслуг. Найбольш запатрабаваныя — цырульныя, рытуальныя і фотапаслугі... А наогул у раёне аказваецца 22 віды бытавых паслуг.

У складзе Шумілінскага камбіната бытавога абслугоўвання насельніцтва — Дом быту, чатыры комплексныя прыёмныя пункты і пяць — па аказанні паслуг. Толькі летась прадпрыемства аказала паслуг на 70 тысяч рублёў.



У Шумілінскім раённым фізкультурна-аздараўленчым комплексе.

У адным з КПП у аграрным гарадку Светласельскі працуе прыёмшчыца Іна Абраменка. Жанчына, можна так сказаць, «бытавы спецназавец»: прымае заказы, цырульнік, майстар па манікюры, швачка. Людзі да яе цягнуцца, бо заўсёды ветлівая і прафесіянал з вялікай літары. Працуе каля пяці гадоў пасля таго, як выйшла з водпуску па доглядзе дзіцяці.

Паколькі кошт паслуг у глыбінцы параўнальна нізкі, у вёску прыязджаюць нярэдка, каб зрабіць прычоску, і з абласнога цэнтра. Калі на дызелі, дарога займае ўсяго гадзіну.

Што датычыцца пракату, то тут можна ўзяць на пэўны час халадзільнік, пыласос, апырсквальнік і нават мячы! Сураўзмоўніца растлумачыла, што іх бяруць тыя, хто прыязджае сюды на адпачынак, каб згуляць у футбол. У цёплы час года карыстаецца вялікім попытам і пракат водных веласіпедаў.

Як адзначыў **Віктар БАБІЧАЎ, дырэктар мясцовага прадпрыемства бытавога абслугоўвання насельніцтва**, дзяржаўная «бытоўка» стараецца пашыраць пералік паслуг. У прыватнасці, цяпер можна заказаць і дровы. Добры бізнес зрабілі на вырабе і ўстаноўцы бетонных агароджаў.

Новы аб'ект сацыяльнага прызначэння ў раёне — фізкультурна-аздараўленчы комплекс, у якім ёсць басейн. Тут працуюць тры інструктары. І з першага дня людзі літаральна займалі чэргі, каб запісацца на плаванне. Асабліва ахвотна наведваюць басейн дзеці. Удзельнічаюць паміж сабой у спаборніцтвах. Між іншым, усё больш ахвотных паплаваць не толькі з Шумілінскага раёна, але і з суседняга — Бешанковіцкага. Сюды прыязджаюць сем'ямі. Летась ва ўстанове пачала працаваць саўна. Расцэнкі вельмі прываблівыя: за гадзіну для чатырох наведвальнікаў трэба заплаціць 20 рублёў. Пры гэтым у Віцебску з-за дарагоўлі ўсё меней тых, хто наведвае проста лазні... У ФАК карыстаюцца добрым попытам трэнажорная зала, секцыі, гурткі, у якіх жанчыны могуць падкарэктаваць фігуру. Такім чынам, паслугі для здароўя не горшыя, чым у абласным цэнтры.

Пра тое, як абслугоўваюць насельніцтва прадстаўнікі бізнесу, пра стварэнне новых рабочых месцаў у недзяржаўным сектары эканомікі — у адным з наступных нумароў «МС».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

ЦІКАВЫ ВОПЫТ

# АПЕРАЦЫЯ «РЭАНІМАЦЫЯ»

## Сям'я прадпрымальнікаў адрадзіла вясковую «бытоўку»

**І гэта не канкурэнтны праект. Наталля і Ігар КЛЫШЭВІЧЫ са Шчучынскага раёна прыйшлі на былыя КПП, каб іх ажывіць. Зараз яны абслугоўваюць пяць вёсак. У хуткім часе зона абслугоўвання павялічыцца. За ўласныя сродкі сям'я робіць рамонт будынка ў аграгарадку Жалудок. Плануюць пачаць работу ў красавіку альбо ў маі.**




Прыёмныя пункты ў гэтых вёсках некалькі гадоў не працавалі. У райвыканкаме прапанавалі «бытоўку» прыватнаму бізнесу. Клышэвічы згадзіліся. Па-першае, сама Наталля — гандлёвы работнік і па спецыяльнасці таваразнавец, да дэкрэтнага водпуску працавала на гэтай пасадзе ў Шчучынскім спажыўтаварыстве. Падругое, яны мелі краму рытуальных паслуг у аграгарадку Васілішкі. Тут і арганізавалі першы прыёмны пункт у маі 2017 года.

— Адкрыць сваю справу мы даўно хацелі, — дзеліцца Наталля. — Муж спрабаваў займацца фотапаслугамі, затым нарыхтоўваў лес на дзялянках. Але мы марылі аб сямейным бізнесе. І каб гэта справа была патрэбна людзям.

Так маладая сям'я паступова ўзяла пад сваё крыло пяць вясковых прыёмных пунктаў. Умовы аказаліся даволі спрыяльныя. Добрай падтрымкай для прыватнага бізнесу стала льготная падатковая сістэма ў рамках Указа «Аб развіцці гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання». У першую чаргу арэнда на правах бязвыплатнага карыстання. Падатак мінімальны — амартызацыя і камунальныя плацяжы. У месяц выходзіць 30—40 рублёў за адзін аб'ект. Праўда, бізнес прыйшлося раздзяліць на два ІП, каб адпавядаць умовам — не больш за тры наёмныя работнікі. З улікам КПП, які будзе адкрыты вясной, у кожнага з сужэнцаў будзе якраз столькі. Гэта значыць, што Клышэвічамі на вёсцы створаны шэсць рабочых месцаў.

— На працу мы ўзялі мясцовых пенсіянерак, гэта жанчыны, якія маюць вопыт работы, яны дасведчаныя і, што немалаважна, ветлівыя. Яны прымаюць заказы па 12 відах бытавых паслуг. Гэта рамонт адзення, абутку, бытавых прыбораў і тэлерадыёапаратуры, хімчыстка, пральня, перацяжка мэблі, мы аказваем яшчэ і фотапаслугі, — пералічвае Наталля. — Заказ выконваем за тры-чатыры дні. Адчуваецца, што людзі ідуць, і ім гэта зручна. Найбольш запатрабаваныя — гэта рамонт абутку і адзення, хімчыстка...

> Прыёмныя пункты ў гэтых вёсках некалькі гадоў не працавалі. У райвыканкаме прапанавалі «бытоўку» прыватнаму бізнесу.

Па словах жанчыны, на паслугі ёсць попыт. Напрыклад, у Васілевічах прынята летась больш за сто заказаў. Пры гэтым у адной заяўцы маглі значыцца некалькі рэчаў. У аграгарадку Орля таксама больш за паўсотні, нядрэнна працуюць прыёмныя пункты ў Ражанцы і Скрыбаўцах.

Клышэвічы прымаюць заяўкі і развозяць па адрасах. Яны заключылі дагаворы з арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, прадпрыемствам па пашыве адзення, дзе працуюць інваліды. Тут Клышэвічы бяруць пасцельную бялізну, бо няма «накрутак» на тавар. А гэта значыць, што і прадпрымальнікі могуць прадаць танней. Ёсць дагавор са Шчучынскім прадпрыемствам па пашыве коўдраў і падушак, гродзенскай фабрыкай «Сілуэт», чые вырабы рэалізуюцца. У вёсцы Каменка адкрылі краму, дзе прапануюць прадукцыю гомельскіх вытворцаў — шторы, сурвэткі, абрусы. Заказы адсюль пакуль не паступалі, хоць сельскі Савет ініцыяваў тут прыёмны пункт. У любым выпадку ён працуе, хоць прыбытку ад «бытоўкі» пакуль няма.

Прадпрымальнікі выбралі для сябе такі шлях яны не робяць «накрутак» на паслугі, але і не плацяць за гэта падатак. Сямейны бізнес трымаецца за кошт гандлю і рытуальных паслуг. Пры гэтым плаціцца адзіны падатак, напрыклад, у Васілішках — 91 рубель у месяц, а ў той жа Каменцы — 21 рубель 50 капеек.

> Так маладая сям'я паступова ўзяла пад сваё крыло пяць вясковых прыёмных пунктаў. Умовы аказаліся даволі спрыяльныя.

— Вядома, справа не развіваецца сама па сабе, — кажа Наталля. — Трэба прыслухоўвацца да пажаданняў вяскоўцаў. З гэтай нагоды і адкрываем яшчэ адзін прыёмны пункт у аграгарадку Жалудок. Нядаўна нам перадалі памяшканне «Белтэлекама», зараз там робім рамонт і вясной яго адкрыем.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**


Центр Промышленной Оценки

• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29 |

**Предмет аукциона**

| | |
|---|---|
| Лот 1 | **Отделение лифтового узла с боксом разгрузки ценностей** (вспомогательное (подсобное) помещение, не относящееся к жилищному фонду), общей площадью 135,9 кв. м, инвентарный номер 200/D-121766 по адресу: г. Витебск, ул. Замковая, 4, пом. 1 |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 158 073,54 бел.руб. (снижена на 20 %)** | |
| Лот 2 | **Склад с пристройкой гаража на 6 боксов и бытовым блоком** (здание многофункциональное) общей площадью 332,1 кв. м, инвентарный номер 200/С-39244, по адресу: г. Витебск, ул. Терешковой, д.11. Составные части и принадлежности: *пристройка* |

**Сведения о земельном участке**: пл. **0,1302** га предоставлен продавцу для обслуживания многофункционального здания на праве постоянного пользования.
Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах:
магистральных трубопроводов, пл. 0,0063 га; сетей и сооружений теплоснабжения, пл. 0,0007 га; сетей и сооружений канализации, пл. 0,0001 га; линий электропередачи напряжением до 1000 В, пл. 0,0039 га; линий электропередачи напряжением до 1000 В, пл. 0,0005 га; сетей и сооружений теплоснабжения, пл. 0,0001 га

**Начальная цена с НДС 20 % – 336 565,62 бел. руб. (снижена на 20 %)**

**Лот № 3** – 1/10 доли капитального строения, расположенного по адресу:

| | |
|---|---|
| Лот 3 | **1/10 доли административного здания** (здание административно-хозяйственное), с общей площадью капитального строения 2486,7 кв. м, инвентарный номер 422/С-3271, по адресу: Гродненская обл., г. Щучин, ул. Пушкина, д. 26. Составные части и принадлежности: кирпичная пристройка (Б 1/к), подвал, сушилка, холодная пристройка (б) |

***Сведения о земельном участке***: пл. **0,5681** га предоставлен продавцу для содержания и обслуживания административного здания на праве постоянного пользования (доля 1/10)

**Начальная цена с НДС 20 % – 56 159,87 бел. руб. (снижена на 20 %)**

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Задаток 10 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 12.01.2019 г.

**Аукцион состоится 28.03.2019 в 12.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 26.03.2019 до 17.00 по** указанному адресу

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

# Раннія буякі прывязуць з Палесся

## Ягаднік каля Ельска заклалі з восені, а ўжо вясной пачнуцца работы па доглядзе плантацыі буякоў памерам 17 гектараў



Дэпутаты Гомельскага абласнога Савета знаёмяцца з арганізацыяй справы па вырошчванні буякоў.

**ТОЕ, што развіваць бізнес у глыбінцы не толькі магчыма, але і выгадна, многія прадпрымальнікі ўжо зразумелі. Зразумелі гэта і мясцовыя ўлады, якія прапануюць бізнесменам у першую чаргу тыя памяшканні, што не выкарыстоўваюцца па розных прычынах. Задавальненне агульных інтарэсаў прыводзіць да стварэння новых рабочых месцаў. Як, напрыклад, у Ельскім раёне.**

Ён, дарэчы, невялікі, знаходзіцца на поўдні Беларусі і мяжуе з Украінай. Тэрыторыю раёна праз памежны пераход «Новая Рудня» перасякае аўтатраса Жытомір — Бабруйск, ёсць і чыгунка. Так што лагістыка відавочна прывабная для стварэння новых вытворчасцяў.

Агульнавядома і тое, што прадпрыемствы атрымліваюць пэўныя падатковыя палёгкі, тут значна таннейшая рабочая сіла і зусім іншае стаўленне. Тых, хто сапраўды ўкладаецца ў развіццё рэгіёна, на руках носяць. Бо ўрэшце гэта дзейнасць дае і рабочыя месцы, і сродкі ў мясцовы бюджэт.

Вось толькі апошнія прыклады. Будынак, дзе некалі размяшчаўся навучальна-вытворчы камбінат, за адну базавую ў 2009 годзе купіў новы ўласнік. Правёў адпаведную рэканструкцыю і перапрафіляванне пад свае патрэбы. Зараз тут швейны цэх прыватнага вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «Палімервалакно». Яго кіраўнік Вадзім Ільюк гаворыць, што набывалі памяшканне менавіта пад пашырэнне ўжо існуючага бізнесу. Цяпер з прадукцыі асноўнай вытворчасці — сінтэпону — шыюць разнастайныя вырабы: пасцельную бялізну і спецадзенне.

Дзесяць мясцовых жыхароў знайшлі тут работу і не скардзяцца на зарплату. Супрацоўнікаў задавальняюць добрыя ўмовы працы, кажа швачка Аксана Бабаед. Сапраўды, для людзей тут абсталявалі не толькі зручныя рабочыя месцы, але і ўсе бытавыя памяшканні. Праўда, адзначаюць арганізатары справы, высокакваліфікаваных кадраў у невялічкім Ельску не хапае.

Яшчэ адна магчымасць для арганізацыі прыватнага бізнесу і гаспадарскага стаўлення да зямлі — яе арэнда. На 17 гектарах, арандаваных у камунальнага сельскагаспадарчага прадпрыемства «Дабрынь», па восені закладзена плантацыя буякоў.

У таварыства з абмежаванай адказнасцю «Бэрымар» ужо ёсць вопыт вырошчвання гэтай культуры пад Мінскам. На поўдні краіны заклалі другую плантацыю. Гавораць, пад Ельскам будуць вырошчваць раннія сарты, а ў цэнтры Беларусі — больш познія. У выніку атрымаецца бесперапынны цыкл. Усё прадумана: каштоўная і карысная ягада раней трапіць на рынак. Ад гэтага выйграе і вытворца, і пакупнік.

Праўда, і затраты на пачатковым этапе даволі вялікія. Гэта не толькі саджанцы з гадавальнікаў. Тут трэба было стварыць асаблівы склад глебы. Пад кожную расліну паклалі прыкладна 300 літраў торфу. Каб добра рос адзін кусцік, пад яго трэба «ўкласці» ад 10 да 50 рублёў. Плюс патрэбны адказныя спецыялісты, якія ведаюць, як усё зрабіць правільна.

Між тым арганізацыя справы тут не аматарская: кроплевая сістэма паліву пад кантролем камп'ютара забяспечыць расліну вадой з усімі неабходнымі пажыўнымі рэчывамі. Гэта дасць прыбаўку да ўраджаю да 40 %. Урэшце плануюць з 40 тысяч кустоў атрымліваць каля 70 тон ягад штогод.

На таварную магутнасць плантацыя буякоў павінна выйсці ў 2022 годзе. А для мясцовых людзей гэта азначае дадатковы сезонны заробак. Арганізатары справы будуць наймаць людзей для збору ягады. На гектар патрэбна дзесяць чалавек. Значыць, на 17 спатрэбіцца адначасова 170.

Пры гэтым плануюць усё зрабіць як у галандцаў ці ў палякаў. Еўрапейцы для ручнога збору наймаюць людзей пры наяўнасці медасведчання. Ягаду збіраюць у спецыяльных пальчатках і добра ведаюць, як яе правільна не толькі зняць з кустоў, якія дасягаюць 2,5 метра ў вышыню, але і не пашкодзіць пры ўкладцы. Бізнес-план прадугледжвае, што збыт ельскіх буякоў у свежым выглядзе будзе ажыццяўляцца на мясцовыя рынкі, у гандлёвыя сеткі, а таксама за межы Беларусі.

**У Ельскім раёне цяпер зарэгістравана 188 суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. 68 з іх — юрыдычныя асобы, астатнія — індывідуальныя прадпрымальнікі. Удзельная вага паступленняў у бюджэт вырасла да 43,5 %. У планах — рэалізацыя некалькіх новых вытворчых інвестыцыйных праектаў.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

ЗНАЁМЦЕСЯ: СТАРАСТА!

# ВЁСКА ТРЫМАЕЦЦА НА ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ

**Гэта аксіёма, даказаная жыццём. З карты населенага пункта могуць знікнуць пошта, ФАП, школа, нават крама, але пакуль там жыве нехта актыўны і неабыякавы, яшчэ не ўсё страчана. Вось, напрыклад, вёска Кузьмінічы Чавускага раёна. Сем'яў тут не болей, чым у гарадскім шматпавярховіку, — каля ста. Але яны не сумуюць, актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці сваёй малой радзімы. Не адмаўляюцца і рублём падтрымаць нейкія важныя справы. Не тое каб яны былі тут такія асаблівыя, гэта ўсё стараста Лідзія ХЛАПКОВА, якая ўмее зацікавіць кожнага.**



Дзмітрый ІЛЫН у гасцях у Лідзіі ХЛАПКОВАЙ.

Раней Кузьмінічы былі галоўнай сядзібай калгаса Ільіча, а калі яго аб'ядналі з суседняй гаспадаркай, сталі перыферыяй. Моладзі з кожным годам усё менш, застаюцца ў асноўным пенсіянеры. Адзінае месца для сустрэч — тутэйшая крама. Болей ніякіх сацыяльна значных аб'ектаў няма. Калі толькі не лічыць дом старасты. Лідзія Васілеўна па родзе сваёй дзейнасці яшчэ і паштальён, па законе мае права прымаць кліентаў дома. Таму веранда ў яе — нешта накшталт паштовага аддзялення. Тут можна разлічыцца за камунальныя паслугі і купіць нешта з неабходных у гаспадарцы дробязяў. Аднавяскоўцы нават свае квітанцыі за камунальныя паслугі пакідаюць ёй на захаванне. Так надзейней, не згубіцца. На вочы трапляе сшытак з незвычайнай назвай — «Хадавік». Высвятляецца, што гэта спіс выданняў, на якія падпісваюцца жыхары. І «Звязда» там таксама ёсць. Стараста сама перыядычна яе выпісвае.

Для мясцовай улады Лідзія Хлапкова не проста памочнік, але і калега па дэпутацкай дзейнасці. Прычым ужо ў другім скліканні. «Ёй лёсам наканавана быць старастам, — смяецца **старшыня Антонаўскага сельскага Савета Дзмітрый ІЛЫН**. — Людзі самі выказаліся на яе карысць. Нават выбару не пакінулі».

Народ паслугамі старасты не злоўжывае, але звяртаецца рэгулярна. Калі нешта вельмі сур'ёзнае, выходзяць на старшыню.

— Але спачатку Васілеўне паведамяць, потым ідуць да мяне, — удакладняе Дзмітрый Ільін.

Кузьмінічы заўсёды была вясёлая вёска. Калі клуб існаваў, жыхары збіраліся там, цяпер спецыяльнага памяшкання няма. Але насельніцтва не сумуе. Летась сваімі сіламі арганізавалі цудоўнае Свята вёскі. Прыйшлі і старыя, і маладыя. Кожны адзін аднаго ведае, а тут гэта таксама была нагода — «Людзі паміж сабой сазваніліся, падрыхтаваліся. Прыйшлі і старыя, і маладыя. Кожнаму зносін не хапае, пра апошнія навіны даведацца хочацца.

— Не ва ўсіх жа сацработнікі ёсць. Ды і гаспадарку мала хто трымае, — уздыхае суразмоўніца. — Тры каровы засталіся на ўсю вёску. Як тут не засумаваць. Не тое каб людзі лянівыя, проста па ўзросце ўжо складана даглядаць.

Жанчына прызнаецца, што асабіста ёй добра падымае настрой яе кот Кузя. А як яшчэ назваць чатырохногага жыхара Кузьмінічаў? Прыгажун, з доўгімі кутасікамі на вушах. Яго жанчыне падарылі.

Людзі ў вёсцы жывуць не вельмі багата, але душа ў іх — сапраўдная скарбніца. Галоўнае — падыход знайсці. Вельмі дапамагае старасту ў грамадскай справе аднасяльчанка — **старшыня раённай ветэранскай арганізацыі Кацярына ГРЭКАВА.**

— Заклікаем людзей на добрыя справы. Нядаўна дапамагалі нашай бальніцы з набыццём новага абсталявання. Прыходжу да людзей і кажу: бальніца ж пра наша здароўе дбае, трэба дапамагчы. У асноўным адгукаюцца. Хто дасць рубель, хто два, хто тры — сума не мае значэння, галоўнае — удзел. Вось больш за 500 рублёў сабралі на агароджу для могілак. Купілі жалезабетонныя слупы, драўніну. Ратавальнікі абазначылі аварыйныя дрэвы, мясцовае лясніцтва дапамагло знесці. Разам мы — сіла.

— Стараемся падняць народ, хоць ён часам і супраціўляецца, — усміхаецца Кацярына Грэкава. — Але людзі ў нас сумленныя. На бальніцу як пачалі збіраць грошы, некаторыя і зараз прыносяць. Мы лішні раз нават і старшыню стараемся не турбаваць. Людзей старых шмат, кожнаму нешта трэба. Калі можам, самі дапамагаем. А вось тых, хто маладзейшы і пачынае злоўжываць нашай увагай, хутка ставім на месца, тлумачым, што не ўсё можна вырашыць за кошт іншых, трэба і самім нешта рабіць. Канешне, сумнавата ў вёсцы бывае, асабліва зімой. Схадзіць асабліва няма куды, толькі ў краму. Збіраемся там а першай гадзіне дня, калі хлеб прывозяць, нешта прыдумваем. Так і жывём. І ў горы заўсёды побач. Калі нехта памірае, усе адгукаюцца. Дапамагаем хто чым можа, так заўсёды было на вёсцы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Старшыня Антонаўскага сельскага Савета Дзмітрый ІЛЫН:**

— Грамадскую работу на вёсцы арганізоўваюць нашы старасты, іх у нас на 22 населеныя пункты 17. Яны паведамляюць пра праблемы грамадзян, пачынаючы ад вулічнага асвятлення і заканчваючы работай аўтакрам. У аграгарадках ёсць яшчэ і старшыя па дамах. Людзі самі вылучаюць тых, каму больш за ўсё давяраюць. Наша Лідзія Хлапкова якраз з іх ліку, карыстаецца вялікім аўтарытэтам у вяскоўцаў. Разам з Кацярынай Грэкавай знайшлі кантакты людзей, родныя якіх пахаваны на нашых могілках. Расказалі ім пра сумны стан месцаў пахавання, заклікалі фінансава падтрымаць. І людзі адгукнуліся. Цяжка пераацаніць работу нашых памочнікаў, яны працуюць, лічы, за добрае слова. Па выніках года ўзнагароджваем найлепшых. Сумы невялікія, але ж галоўнае — гэта ўвага.



Для настрою.

ЭКАНОМІКА Ў ПРЫЯРЫТЭЦЕ

# Форум дзелавога супрацоўніцтва — 2019 прайшоў у Салігорску

**ГЭТА першае мерапрыемства, арганізатарамі якога выступілі Беларуская гандлёва-прамысловая палата і Салігорскі райвыканкам, паведамляе раённая газета «Шахцёр».**

Нефармальны бізнес-форум дазволіў пазнаёміць прадстаўнікоў дванаццаці дыпламатычных місій, якія акрэдытаваны ў Рэспубліцы Беларусь, і гандлёвых прадстаўніцтваў з культурай, прадпрыемствамі, асаблівасцямі эканамічнага развіцця раёна.

Арганізатары спадзяюцца, што першы станоўчы вопыт правядзення форуму будзе распаўсюджаны на іншыя рэгіёны Мінскай вобласці. Мэта мерапрыемства — узаемнае супрацоўніцтва, укладанне інвестыцый, стварэнне новых сумесных праектаў. Госці ацанілі якасць і разнастайнасць на выстаўцы прадукцыі прадпрыемстваў Салігорскага раёна. Пасля афіцыйнай часткі прадстаўнікі бізнесу правялі дзелавыя перагаворы з патэнцыйнымі партнёрамі. Цікавасць была праяўлена падчас дэгустацыі, а таксама падчас прэзентацыі прадпрыемстваў.


shahter.by

**Старшыня камітэта эканомікі Мінскага аблвыканкама Сяргей ЖАЛЯЗНЯК:**

— Сённяшні форум — гэта першае мерапрыемства, якое праводзіцца ў рамках дзелавога супрацоўніцтва паміж рэгіёнамі і дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі дзеля таго, каб паказаць свой патэнцыял. Хачу адзначыць, што Мінская вобласць сёння экспартуе сваю прадукцыю больш чым у 150 краін свету. Мы пастаўляем на экспарт больш за 900 пазіцый. Міншчына заключыла пагадненні з рэгіёнамі 80 краін блізкага і далёкага замежжа. Форум паказаў на прыкладзе аднаго з самых передавых рэгіёнаў, як сёння развіваецца Рэспубліка Беларусь, вызначыў перспектыўныя напрамкі для прасоўвання прадукцыі за межы нашай дзяржавы.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# Пытанне да дэпутата

### На прамой лініі — старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў

Як паведамілі «МС» у Мінскім абласным Савеце дэпутатаў, у суботу, 16 лютага, **старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ** правядзе прамую тэлефонную лінію. Задаць свае пытанні кіраўніку прадстаўнічай улады сталічнага рэгіёна можна з 9.00 да 12.00 па тэлефоне 8 (017) 500-41-60.

# ГРЫБНОЕ МЕСЦА

### На Міншчыне нядаўна з'явілася першая вытворчасць па вырошчванні шампіньёнаў

**ЗАПУСЦІЛА яе кампанія «Аграсэрвіс-6», якая дынамічна развіваецца, піша раённая газета «Прысталічча». Свежая прадукцыя, вырашчаная на якаснай сыравіне, хутка знайшла свайго пакупніка не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі.**

Штодня вытворцы атрымліваюць каля трох тон смачных далікатэсаў. А пры выхадзе на поўную вытворчую магутнасць штомесячны ўраджай дасягне 200 тон.

Грыбныя «плантацыі» размяшчаюцца недалёка ад Мінска — у аграгарадку Сеніца. Тут у дванаццаці кліматычных камерах растуць шампіньёны.

Якасны кампост для вырошчвання грыбоў — залог высокай рэнтабельнасці бізнесу. Субстрат з грыбным міцэліем кампанія купляе ў Польшчы. Кантэйнеры з грунтам размяшчаюць у некалькі радоў у сем паверхаў. Пры вырошчванні шампіньёнаў не выкарыстоўваюцца мінеральныя ўгнаенні і іншыя хімічныя рэчывы — толькі вада для актыўнага росту грыбоў. Калі добра завільгатніць грунт, пік ураджаю не за гарамі.


pristalica.by

— Ураджай у значнай ступені залежыць ад якасці пажыўнай базы, таму эканоміць на субстраце нельга, — тлумачыць **намеснік генеральнага дырэктара па вытворчасці ТАА «Аграсэрвіс-6» Андрэй РАВУЦКІ.** — З так званай першай хвалі атрымліваецца сабраць каля пяці тон шампіньёнаў. Далей работа з грунтам не канчаецца: багаты паліў, фаза росту і зноў — збор ураджаю. На гэты раз ён не перавышае трох тон (60 % ад першай хвалі). Неабходнасць запуску трэцяй хвалі залежыць ад нашых патрэб і загружанасці цэхаў. Як правіла, яна прыносіць 20—25 % ад першага збору.

Сёння ў штаце 60 чалавек, але ў перспектыве колькасць спецыялістаў плануюць павялічыць да 110.

# Крокі на шляху развіцця

### У Астрашыцкім Гарадку адкрылі пасля рэканструкцыі амбулаторыю

**ЦЯПЕР спецыялісты медустановы змогуць абслугоўваць не менш за 60 пацыентаў у дзень. Сама амбулаторыя разлічана на 6,5 тысячы чалавек, піша «Прысталічча».**


pristalica.by

**Намеснік старшыні Мінскага райвыканкама Уладзімір ЮРГЕВІЧ** адзначыў, што гэта першы крок у рэалізацыі канцэпцыі развіцця Астрашыцкага Гарадка:

— Хутка тут адкрыецца лазня для мясцовых жыхароў і навакольных населеных пунктаў. З'явяцца камфартабельныя жылыя дамы, у планах — рамонт гідразбудаванняў.

**Старшыня Мінскага раённага Савета дэпутатаў Юлія БЯЛЯНКІНА** звярнула ўвагу на тое, што адкрыццё медустановы такога рангу — знакавая падзея не толькі для Астрашыцкага Гарадка, але і для ўсяго Мінскага раёна:

— Для любога населенага пункта, асабліва ў сельскай мясцовасці, важныя наяўнасць паліклінікі і магчымасць для кожнага атрымаць першасную кваліфікаваную медыцынскую дапамогу. Таму адкрыццё амбулаторыі — доўгачаканая і радасная падзея.

У абноўленай паліклініцы будуць размяшчацца тры кабінеты ўрачоў агульнага прыёму, кабінет прыёму здаровага дзіцяці, прышчэпачны і працэдурны. Таксама ў рэгістратуры можна будзе запісацца і на прыём да фельчара, стаматолага, акушэра і ўрача-тэрапеўта. З навінак — увядзенне талоннай сістэмы. З'явілася і сучаснае медыцынскае абсталяванне: электракардыёграф, прыстасаванні для збору аналізаў, акушэрскае крэсла. **Загадчык Астрашыцка-Гарадоцкай амбулаторыі Юлія ЛУПАЧ** паведаміла, што наяўнасць камп'ютараў з доступам у інтэрнэт дазволіць весці электронны дакументаабарот.

— Сучасны рамонт, добрая мэбля і абсталяванне — пацыентам будзе камфортна, — адзначае яна. — Хочацца падзякаваць усім, хто мае дачыненне да такога свята.

Напярэдадні ў калектыва амбулаторыі прыемныя клопаты, звязаныя з наваселлем. Зараз дапамогу пацыентам будуць аказваць у сучаснай медустанове на сучасным узроўні.

# Новая крама і рабочыя месцы

**ПРАЦЯГВАЕЦЦА будаўніцтва вялікага гандлёвага аб'екта «Санта» ў Капылі.**


www.kopyl.by

Аб'ект прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Санта рытэйл» па вуліцы Трактарнай у райцэнтры з кожным днём усё больш выразна набывае свае аблічча. Як паведамляе раённая газета «Слава працы», хуткасць будаўніцтва аб'екта сапраўды вялікая: за непрацяглы час ўзведзены сцены і дах. Работы працягваюцца.

Дарэчы, гэты гандлёвы аб'ект агульнай плошчай больш за 400 квадратных метраў дазволіць забяспечыць тэмп росту рознічнага тавараабароту і стварыць новыя рабочыя месцы.

# 33 шматдзетныя сям'і атрымалі ключы ад кватэр

**АДНЫ ўжо паволі асвойваюцца ў новым доме па вуліцы Міру, што ў Крупках, і іншыя — у прыемных пошуках мэблі ды неабходных прадметаў інтэр'ера. Але ўсе без выключэння радуюцца таму, што набылі ўласнае жыллё.**


krupki.by

Журналісты раённай газеты «Крупскі веснік» адправіліся да навасёлаў. Калі коратка казаць аб іх уражаннях: шыкоўна! Усюды — блочная сістэма, у жыхароў дзвюх кватэр ёсць магчымасць паставіць на агульныя ўваходныя дзверы замок. Прасторныя пакоі. Кватэры, як той казаў, здадзены пад ключ — засяляйся і жыві. Прыгожыя шпалеры, ламінат, сучасныя ўваходныя і міжпакаёвыя дзверы, шклопакеты і зашклёныя лоджыі. У чатырохпакаёвых кватэрах — па два санвузлы, ванны пакой немалых памераў. І яшчэ адзін нюанс — прасторнае фае ў пад'ездзе.

Шумлівым кагалам, з пірагом і гарбатай у новую 3-пакаёвую кватэру ўбегла сям'я Захаравых. Дзяўчаткі па-гаспадарску асвойваюць пакоі.

— Тут будзе дзіцячы? — пытаюцца журналісты.

— Не, гэта гасцёўня. Хадзем, мы пакажам вам наш пакой. Зараз мама падыдзе. Яна дома з брацікам, ён яшчэ маленькі, яму ўсяго толькі дзесяць месяцаў.

Гаспадыню муж і дзеці сустрэлі кветкамі.

— Кватэру мы атрымалі нечакана, — расказваюць Андрэй і Надзея. — Калі гэты дом пачаў будавацца, у нас толькі-толькі нарадзілася трэцяя дзіця. Звярнуліся ў аддзел ЖКГ райвыканкама. Нам сказалі: «Збірайце ўсе неабходныя дакументы». Дзякуючы ўказу Прэзідэнта 95 % кошту жылля нам субсідавала дзяржава. Астатнюю суму ўжо заплацілі. І вось мы — гаспадары сваёй кватэры! Вядома ж, шчаслівыя. Калі будзем засяляцца? Як толькі купім мэблю.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 14 лютага 2019 года.**